№ 8 (414) 25 лютага 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Беларускі Кустурыца**
Аляксандар Кананові́ч ведае, у чым беларускі кайф.
старонка 2

**Суд над Дзямідавым**
Камэрцыйны дырэктар полацкага «Шкловалакна» за кратамі.
старонка 6

**Эвалюцыя аднаго камуніста**
Рэпартаж з Малдовы.
старонка 10

ПАЛІТЫКА

**За Казуліным праглядаецца расейскі сьлед**
Вылучэньне Казуліна дае тактычныя перавагі апазыцыі, мяркуе палітычны аналітык Валер Булгакаў. **Старонка 2.**

ПРА-СЬВЕТ

**Ці можна ўбачыць Менск з Братыславы?**
Лёс эўрапейскіх народаў больш не вырашаецца, як у мінулым стагодзьдзі, на сустрэчах лідэраў вялікіх дзяржаваў, піша Віталь Тарас. **Старонка 14.**

ГРАМАДЗТВА

**Як адстаяць Дом літаратара**
У нацыянальнага руху адбіраюць знакавую прастору. **Старонка 9.**

МУЗЫКА

**1990-я працягваюцца**
«Zet» з кожным годам набывае актуальнасьці, і цяпер залаты час для творчасьці ў масках. **Старонка 9.**

НАША СТРАВА

**X-files: лазанкі**
Начынка: 200 г вяндліны, 40 г сушаных грыбоў… Новы артыкул у новай рубрыцы «НН». **Старонка 16.**

ЛІТАРАТУРА

**Пра Расею і надзею**
І нават нешта большае, чым увесь гэты комплекс Сьвятой Русі, славянскага адзінства, праваслаўя, чаяпіція, рукаблудзія, чынапачытанія і сусловія… Эсэ Юр'я Андруховіча. **Старонка 18.**

**Дык падпісвайся!**

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапіку «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапіку «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

# Казулін знайшоўся

Экс–рэктар БДУ Аляксандар Казулін стварае рух «Воля народу». Яго падтрымлівае газэта «Народная воля». Лукашэнка разьюшана рэагуе на зьяўленьне Казуліна на палітычнай сцэне падчас «нарады па пытаньнях карупцыі». Незалежнае грамадзтва расколатае ў стаўленьні да Казуліна. Прапануем рэпартаж зь першага публічнага зьяўленьня Казуліна ў новай якасьці, інтэрвію зь ім і камэнтары.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Аляксандар Казулін: «У нас шмат людзей з намерамі. І няшмат людзей зь дзеяньнямі»

**«НН»: Вас практычна цэлы год не было на грамадзка-палітычнай арэне. Чым вы займаліся?**

**Аляксандар Казулін:** А што, вы лічыце, што не павінна быць пэрыяду асэнсаваньня свайго ўласнага жыцьця, свайго ўласнага шляху?

**«НН»: Вы называлі сябе «чалавекам прэзыдэнта». Цяпер Вы фактычна ідзяце супраць яго…**

**АК:** Я іду ня супраць яго, а ў дапамогу.

**«НН»: Не зважаючы на тое, што Лукашэнка ясна даў зразумець, што пойдзе на трэці тэрмін?**

**АК:** Гэта яго права прымаць рашэньне. Кожны прымае рашэньне, мае права выбару. Пытаньне ў тым, ці адпавядаюць гэтыя рашэньні волі народу, ці адпавядаюць яны будучаму разьвіцьцю.

**«НН»: Вам цяпер не шкада, што пры Вас у БДУ перастаў існаваць Свабодны прафсаюз студэнтаў?..**

**АК:** Нічога падобнага! Што не пры мне — сто працэнтаў. (Свабодны прафсаюз студэнтаў у БДУ перастаў існаваць у 2000 г. пасьля ўціску на яго актывістаў з боку адміністрацыі ўнівэрсытэту. — **АШ.**)

**«НН»: Вы сябе лічыце прарасейскім палітыкам ці праэўрапейскім?**

**АК:** Я не называю сябе ні прарасейскім, ні праэўрапейскім. Я называю сябе беларускім палітыкам.

**«НН»: На прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г. Вас называлі магчымым кандыдатам. Ці зьбіраліся вы тады насамрэч ісьці ў прэзыдэнты?**

**АК:** Паміж магчымасьцю і вынікам — вялікая розьніца. Ад намераў да дзеяньняў вялікая адлегласьць. У нас ёсьць шмат людзей з намерамі. І няшмат людзей зь дзеяньнямі.

Працяг на старонцы 6.

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

КАЗУЛІН. Ці можна перамагчы цмока, ня маючы ўласнага цмока? Ці варта перамагаць цмока, гадуючы ўласнага цмока? Гэтыя вечныя пытаньні задаюць у бастыёнах незалежнага грамадзтва. Вылучэньне Казуліна выклікала там лёгкую сумятню. Быццам бы і даўно чаканае, яно аказалася для ўсіх інтрыгоўнай неспадзяванкай. Моцны кандыдат, новы палітык нечаканымі хадамі прыкаваў да сябе ўвагу СМІ. Хтосьці дасканала прадумаў яму першыя крокі.

Казуліна трымае відавочная воля да ўлады. Але не трымае ідэя. Лідэрам «Пяцёркі+» цяжка спрачацца з Казуліным у мэдыйнасьці. Слабыя палітыкі таму і слабыя, што ня здольны арганізаваць нічога, акрамя прэсрэлізу. Выклік Казуліна абавязкова магнэтызуе і іншых кандыдатаў. Наступныя тыдні абяцаюць палітычныя цікавосткі. Ня факт, што Казулін дойдзе да выбараў. Але ягонае ўступленьне ў гульню магутна расчышчае поле для палітычнага манэўру. Узрастаюць шанцы, што краіна разварушыцца. Гэта ў аўторак амаль адкрытым тэкстам прызнаў А.Лукашэнка («апазыцыя мае шанцы прыйсьці да ўлады толькі ў выпадку ўзьнікненьня палітычнага хаосу»). Пра Казуліна — **старонкі 3—6**.

З-за мяжы Казулін здаецца, мусіць, ідэальным кандыдатам. А зь сярэдзіны ён выглядае супярэчлівай фігурай. З аднаго боку, Казуліну яшчэ не даказаў сваёй адданасьці ідэалам свабоды і беларускасьці. Зь іншага боку, яму нялёгка будзе ўцягнуць у змаганьне людзей запалоханай сыстэмы. Усяго чатыры дні, і на падпісантаў казулінскага маніфэсту абрынуліся рэпрэсіі (**старонка 4**). Зь іншага боку, нечакана паўстае пытаньне адказнасьці такіх, як Казулін, за рэпрэсіі ўлады ў апошнія 10 гадоў (**старонка 5**).

ЯКАЯ МУЗЫКА НАМ ПАТРЭБНАЯ.

Палітычная актыўнасьць як стыль жыцьця цяпер ня ў модзе. Ад гэтае ўсеагульнай «празнасьці» і абыякавасьці часам хочацца выць. Паласа «Стыль жыцьця» (**старонка 13**) Тэды Лі — апалёгія грамадзянскай актыўнасьці як лайфстайлу. Ніша радыкальнага нонканфармізму незанятая і ў музыцы. Ніхто ня ставіць на дысках «Толькі не для АНТ». Ніхто не дае канцэртаў на лясных прагалінах. Бяз «нашым і вашым». Ды на словы Купалы. А то і Коласа. Хто там ідзе новы ў музыцы? **Старонка 12**.

# Валер Булгакаў: «За Казуліным праглядаецца расейскі сьлед»

Сапраўдным канкурэнтам Лукашэнкі будзе палітык, які знойдзе ў сабе мужнасьць не шукаць народнай любові лукашэнкаўскімі мэтадамі. Факт нядаўняга супрацоўніцтва з рэжымам у гэтым выпадку адыдзе на другі плян. Прадказаць, хто будзе «адзіным», складана. Але вылучэньне Казуліна дае тактычныя перавагі апазыцыі. Рэдактар часопісу «Arche» **Валер Булгакаў** камэнтуе бягучыя падзеі.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«НН»: Наколькі нечаканым для Вас было далучэньне А.Казуліна да аб'яднаных сацыял-дэмакратаў і фактычнае вылучэньне яго ад гэтай палітычнай структуры у кандыдаты ў прэзыдэнты ад дэмсіл?**

**Валер Булгакаў:** Гэта сапраўды неспадзяванка. З гэтым вылучэньнем перадвыбарны ляндшафт у Беларусі істотна праяўляецца. Можна казаць, што беларуская апазыцыя мае двух лідэраў — Алеся Мілінкевіча і Аляксандра Казуліна, якія здольны выйсьці ў фінальную стадыю перадвыбарнай гонкі.

**«НН»: Чаму менавіта Казулін? Досыць скандальная фігура, на думку некаторых…**

**ВБ:** Ён валодае ўнікальнымі палітычнымі рэсурсамі. Па-першае, Казулін мае пэўныя сувязі з нацыянальна сьвядомым асяродзьдзем. Нацыянальны момант вельмі выражаны ў ягоным звароце да беларускага народу падчас заклiку ствараць рух «Воля народу». Па-другое, ён мае досыць непрадказальныя сувязі з Расеяй. У гэтай кандыдатуры сканцэнтравана праяўляецца незадаволенасьць Крамля Лукашэнкавай незгаворлівасьцю. Па-трэцяе, ён мае моцныя сувязі зь беларускай намэнклятурай, а таксама выхады на сілавых чыноўнікаў. Па-чацьвёртае, ён цяжэй паддаецца дэманізацыі сродкамі афіцыйнай прапаганды як агент заходняга ўплыву. Гэтыя рэчы робяць Казуліна фаварытам апазыцыйнай кампаніі.

Варта адзначыць, што зварот да беларускага народу вельмі прафэсійна складзены. Яго падпісалі людзі самых розных сацыяльных слаёў. Важна, што Казулін ужо цяпер заручыўся падтрымкай Натальлі Машэравай, што дазваляе яму разьлічваць на вялізны электаральны рэсурс (15—20% галасоў і болей).

Працяг на старонцы 4.

# Зьявіўся беларускі Кустурыца

У Беларусі зьявіліся новы камэдыёграф і новы стыль камэдыі. «Колер каханьня» рэжысэра Аляксандра Канановіча глядзеў **Андрэй Расінскі**.



### Зялёны, Вольскі і п'яўказаводчык

Сюжэт наступны: натхнёны юнак Леанард (Пётар Юрчанкоў-мал.) імчыцца на фаэтоне да нявесты, прызнаецца ў каханьні, абдымаецца — суцэльная ідылія на тле краявідаў расейскага нечарназем'я. Але сьледам зьяўляюцца насаты і вусаты Лявон Вольскі на чале аркестрыка «Крамбамбуля» ды кандыдат у цесьці, шчодры й шчыры п'яўказаводчык (Аляксандар Бяспалы).

Непрыемнасьці для Леанарда пачынаюцца ў горадзе. Крыж на ягоным вясельным гарнітуры «ставіць» паветраная цыркавая каровадўцякачка. Потым будуць юрлівая гараджанка (Алеся Пухавая), што прапануе адмысь касьцюмчык і пафарбаваць яго ў зялёны колер, зьяўленьне мужа-раганосца (Ігар Кашэўскі), пасьля якога пазелянее і скура недарэкі-героя, юрлівая палеская знахарка...

Урэшце пераможа сапраўднае каханьне стойкай нявесты (Юлія Кадушкевіч), здольнае вярнуць шчасьце «іншаколернаму».

### Аголеным па вуліцах

У фільме няма аніводнай слабой ці прахаднай ролі, нават эпізадычныя пэрсанажы запамінаюцца. А сапраўдным падарункам можна лічыць фільм для выканаўцаў галоўных роляў П.Юрчанкова-мал. і Ю.Кадушкевіч.

Юрчанкову не заўжды шанцавала з рэжысэрамі і сцэнарыстамі, а тут ён абсалютна на сваім месцы. Ягоны Леанард — легкадумны, пуставаты, але пацешны й сымпатычны. Актору мужна прыйшлося шмат гадзін цярпець наяўнасьць на сабе грыму, бегаць па горадзе ў афарбавана-аголеным выглядзе. «Калі б я ведаў, на што пагадзіўся!» — скардзіўся ён.

Нявесьце (Юліі Кадушкевіч) у фільме прыйшлося нават падаць з каня. У апошняй сцэне, калі гераіня абдымае свайго жаніха, яе тонкія падрапаныя рукі выклікаюць спачуваньне.

Працяг на старонцы 8.

# Эвалюцыя аднаго камуніста

Партыя камуністаў Малдовы ідзе на выбары 6 сакавіка пад сьцягам, на якім серп і молат суседзяць з зоркамі Эўразьвязу. Чатыры гады таму малдаўскія камуністы былі прарасейскімі. Цяпер прэзыдэнт Варонін змагаецца за перавыбраньне, пераарыентаваўшыся на ЭЗ і дэпартуючы расейскіх агентаў. Правацэнтрысцкая апазыцыя фліртуе з Расеяй. Хрысьціянскія дэмакраты з Народнага фронту дзейнічаюць асобна. Паварот ад Масквы да Эўропы дадаў Вароніну папулярнасьці. Паводле апошніх сацапытаньняў, камуністы могуць разьлічваць нават на 60% галасоў.


WWW.NATO.INT

Малдова — гэта адзіная ў Эўропе краіна, якой кіруе партыя, што мае ў назьве слова «камуніст». У лютым 2001 году Партыя камуністаў Малдовы здабыла абсалютную большасьць ў ходзе свабодных выбараў, загнаўшы нацыяналістаў і лібэралаў у апазыцыю. Сёньня малдаўскія правацэнтрысты спадзяюцца на тое, што пасьля выбараў, назначаных на 6 сакавіка, паўторыцца грузінскі і ўкраінскі сцэнар. Калі ўладу зловяць на фальсыфікацыях, вулічныя дэманстрацыі прымусяць яе сысьці.

Вуліцы Кішынёва заіскрыліся аранжавымі плякатамі, на якіх Юры Рошка, лідэр Хрысьціянска-дэмакратычнага народнага фронту, паціскае руку Віктару Ючшанку. Рошка мае рэпутацыю нацыяналіста і 10% падтрымкі ў сацыялягічных апытаньнях. У сьнежні ён паслаў на Ўкраіну сваіх актывістаў, каб набраліся вопыту.

— У гэтым няма патрэбы. У нас рэвалюцыя была. У лютым 2001 году! — парыруе Аляксандр Пяткоў, малады кіраўнік інфармацыйна-аналітычнага аддзелу Партыі камуністаў. — Народ шляхам дэмакратычнага галасаваньня адхіліў ад улады алігархічна-намэнклятурную эліту, як гэта адбылося ў Грузіі і Ўкраіне.

Бачачы мой скептыцызм, Пяткоў папраўляе гальштук і дадае:

— Добра, што ў Румыніі выйграў дэмакрат Траян Басэску. Перамог старую намэнклятуру, што стаяла за сьпінай Адрыяна Настасэ. Ва Ўкраіне народ таксама пазбавіў улады старую карумпаваную эліту. Так было і ў Малдове чатыры гады таму. Камуністы перамаглі не таму, што людзі хацелі таннай каўбасы. Гэта былі галасы пратэсту супраць карумпаванай дзелавой і палітычнай эліты.

Выходзячы зь бюро кампартыі, заўважаю каляндар на 2005 год, выдадзены малдаўскім камсамолам, — з Чэ Геварам і лёзунгам «Чатыры гады Лютаўскай рэвалюцыі!».

Паводле вынікаў сацапытаньняў, камуністы могуць разьлічваць на 60% галасоў. Апазыцыйныя партыі, якія процістаяць адна адной, — разам трохі больш як на 30%. Новы парлямэнт абярэ прэзыдэнта. Напэўна, ім зноў стане лідэр камуністаў Уладзімер Варонін.

Працяг на старонцы 10.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Пабачымся на Сухой

**26 лютага** (субота) а 17.30 у памяшканьні Гістарычнай майстэрні (вул. Сухая, 25, станцыя мэтро «Фрунзэнская») адбудзецца доўгачаканая сустрэча рэдакцыі часопісу «ARCHE» зь менскімі чытачамі. У праграме: скокі, сьпевы, Андрэй Хадановіч, раздача аўтографаў. Даведкі праз т.: (029) 343 41 49.

# Зьмена вехаў: Казулін на публіцы

У суботу, 19 лютага, газэта «Народная воля» выдрукавала на першай паласе маніфэст новага руху. Рух прэтэндуе на нішу новае апазыцыі і называецца «Воля народу». У гэты ж дзень адбылося першае зьяўленьне Аляксандра Казуліна на публіцы. Ізноў сюрпрыз.

Пад Менскам адначасова адбыліся пленум ЦК Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная грамада» і партыйная канфэрэнцыя Сацыял-дэмакратычнай грамады. Сацыял-дэмакраты прымалі рашэньне правесьці аб’яднаўчы зьезд. Але новы куплет у бясконцай песьні аб задзіночаньні сацыялістаў паблякнуў перад топ-навіной. У лідэры аб’яднанае партыі прапанаваны экс-рэктар БДУ Аляксандар Казулін.

Намесьнік старшыні БСДП (НГ) Уладзімер Нісьцюк сьцьвярджае, што кандыдатура Казуліна аптымальная. Ён нэўтральная постаць, якая мае аўтарытэт у грамадзтве — і сярод інтэлігенцыі, і сярод апаратчыкаў. Чалавек з кантактамі: пэўны пэрыяд рэктарства, калі БДУ быў на асобным статусе, уваходзіў у склад ураду ў якасьці міністра.

Казулін выходзіць на трыбуну.

## Я ганаруся тым, што працаваў з прэзыдэнтам

Казулін адказы на магчымыя пытаньні прадумаў у дэталях. Трымаўся ён стрымана і нават напружана. Пры адказах амаль не жэстыкуляваў. На пытаньні партыйных актывістаў Казулін рэагаваў ухілiста. Запамінальныя першая і апошняя фраза, але адказ ня просты, часта сустрэчным пытаньнем.

**— Ці гатовы Вы ўзначаліць грамадзтва, калі паўторыцца ўкраінская сытуацыя?**

— У кожнай краіне ўсё будзе па-свойму. Народнага лідэра выбірае сам народ, маё жаданьне тут нічога ня значыць. А гатоўнасьць да такога кроку ёсьць.

**— Ці гатовыя Вы выйсьці на плошчу, каб адстойваць сваю перамогу на выбарах?**

— Я чалавек пасьлядоўны, маю свае прынцыпы, погляды, меркаваньні, пазыцыю. Я заўжды іду пасьлядоўна і да канца. Што такое канец для мяне? Гэта дасягненьне мэты і выніку. Для мяне праблемы выйсьці на плошчу няма. А вось каб выйшла яшчэ 100 тысяч чалавек…

**— Ці засталіся ў Вас сябры сярод рэктараў ВНУ пасьля вашага зьняцьця?**

— А вы што ж, лічыце, што не?

**— Вас не палохае лёс Марыніча?**

— У кожнага свой лёс. Прызначаны мне я прайду з годнасьцю.

**— Ці ёсьць у Вас свая Юлія Цімашэнка?**

— Я заўжды высока цаню жанчын і лічу, што роля жанчыны ў грамадзтве павінна быць высокай і нават вельмі высокай. (Голас з залі: «Як Лукашэнка!» — **АШ.**) Спадзяюся, тое, што пад зваротам у «Народнай волі» стаіць подпіс Натальлі Машэравай, пра штосьці ды гаворыць?

**— Ці арганізуеце Вы суд над Лукашэнкам?**

— Чытайце кнігі: мэтады ў гісторыі не мяняюцца — што 100 гадоў таму, што 1000, што 5000. Давайце ня будзем наступаць на адны і тыя ж граблі. Грамадзянская вайна, высылкі, разборкі — гэта мы ўжо праходзілі. Я ганаруся тым, што працаваў з прэзыдэнтам: ён дазволіў мне раскрыцца. Мы павінны паважаць першага прэзыдэнта за тое добрае, што ён зрабіў для краіны. Нам гэта трэба, каб рухацца наперад. Але ці будзе ён сам сябе паважаць?..

## У кожнага свая памыйніца

Казуліну, дарэчы, нагадалі прэзыдэнцкую сэнтэнцыю пра памыйніцу. Экс-рэктар выказаўся наконт гэтага спакойна: «У кожнага свая памыйніца. Кожны чалавек мае свой асабісты ўзровень разьвіцьця, асабістую інтэлігентнасьць і шырыню кругагляду. Гэты ўзровень выяўляецца ў тым ліку і ў словах. Не прэзыдэнцкая гэта справа — апускацца да асабістых разборак».

Яшчэ адзін момант зь мінуўшчыны тычыўся прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г., пасьля якіх БДУ быў пазбаўлены ільгот за тое, што студэнты «няправільна» прагаласавалі. Паводле Казуліна, на двух участках БДУ Лукашэнка атрымаў 18% і 20% адпаведна.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ЗЬМЕНА ВЕХАЎ. У 1992 годзе Алег Трусаў (справа) адмовіў Казуліну ў праве стаць міністрам. Цяпер старшыня ТБМ зьвязвае зь ім пэўныя надзеі. Затое Вольгу Іпатаву зачапілі словы Казуліна пра «эўрапейскіх расейцаў».**

## Эўрапейскімі расейцамі ці расейскімі эўрапейцамі

Казулін таксама пэрыядычна апэляваў да гісторыі, падкрэсьліваючы, што Беларусь заўжды была мостам паміж Захадам і Расеяй. Аднаго разу захапіўся параленямі: «Нам наканавана мець дачыненьні з Расеяй і жыць у Эўропе. Мы павінны быць эўрапейскімі расейцамі ці расейскімі эўрапейцамі». Пісьменьніца Вольга Іпатава не стрывала: «Мы павінны быць кім? Расей-ца-мі?!» Давялося тлумачыць, што яго няправільна зразумелі, бо недачулі.

Найбольш балючым пытаньнем для прадстаўнікоў сацыял-дэмакратаў было будучае ўладкаваньне дзяржавы: парлямэнцкай ці прэзыдэнцкай мае быць Беларусь? Казулін быў катэгарычны: «Праблема ня ў тым, парлямэнт ці прэзыдэнт кіруе краінай, а ў выкананьні законаў. Сёньня ўлада засяроджаная ў руках адной асобы. Мы павінны не зьмяніць, а паправіць сыстэму. Калі б мы сёньня ўзялі Канстытуцыю 1994 г., дзе прадугледжана моцная прэзыдэнцкая ўлада, але пры гэтым было дакладнае разьмежаваньне галін улады, гэта не было б праблемай. Чаму ў Літве ўсё як мае быць?»

У БСДГ актыўна абмяркоўвалася іншае пытаньне — няўменьне Казуліна гаварыць па-беларуску. Сам ён растлумачыў, што мовы не вывучаў наагул, а літаратуру — толькі ў дзясятай клясе. Пры гэтым экс-рэктар адзначыў, што нікому нельга нічога навязваць, а трэба зрабіць, каб беларуская мова была прэстыжнай, як калісьці француская паміж расейскіх дваран.

Згадаў і тое, як ня стаў міністрам адукацыі ў 1992-м, у часы Вярхоўнага Савету XII скліканьня, бо ня ведаў дзяржаўнае мовы. Яго зацьвердзілі камісіі па адукацыі, па справах моладзі, а вось камісія па культуры й гістарычнай спадчыне (старшыня Ніл Гілевіч, намесьнік Алег Трусаў, сакратар Лявон Баршчэўскі) адпрэчыла. «І правільна зрабіла», — адзначыў нехта з залі. «Вядома, правільна», — з усьмешкай пагадзіўся Казулін.

Жыцьцё мучыць, але жыцьцё і вучыць. Пэрспэктыва ўзначаліць сацыял-дэмакратыю прыгасіла колішнюю крыўду: між тым незадоўга да свайго звальненьня ў 2003 г. тады яшчэ рэктар БДУ даваў інтэрвію ўнівэрсытэцкай студэнцкай газэце «Обратная связь» ды скардзіўся на часы, калі мова вызначала, будзе чалавек міністрам ці не.

Увогуле, Казулін здолеў дагадзіць сваімі адказамі актывістам абедзьвюх партый. З прысутных з рашэньнямі канфэрэнцыі і пленуму не пагадзіліся толькі прыхільнікі Станіслава Шушкевіча, але яны засталіся ў меншасьці.

**Аркадзь Шанскі**

## Зварот «Волі народу»

У маніфэсьце руху «Воля народу» крытыкуецца ўнутраная і замежная палітыка А.Лукашэнкі. Ставіцца пад сумнеў дасягненьні дзесяцігодзьдзя: стабільнасьць і заробак $200. Канстатуецца патрэба зьмены эканамічнае палітыкі і вызваленьня людзей ад страху. Акцэнтуецца ўвага на сьвядомым расколе грамадзтва, Лукашэнкавым дзяленьні народу на «чэсных» і «нячэсных», «сваіх» і «несваіх». Адначасова Лукашэнку закідаецца параза на ўсіх дыпляматычных франтах — пагаршэньне стасункаў ня толькі з Эўропай, але і з Расеяй. Асобна ў звароце дэкляруецца неабходнасьць падтрымкі беларускай мовы, нацыянальнае культуры.

СЬЦІСЛА

## Скрабцу адмовілі

Адміністрацыя прэзыдэнта Расеі адмовіла экс-дэпутату палаты прадстаўнікоў Сяргею Скрабцу ў палітычным прытулку. З такой просьбай Скрабец зьвярнуўся пры канцы сьнежня, матывуючы гэта перасьледам з боку беларускіх уладаў ды пагрозай сям’і. Прычыны адмовы сп.Скрабец тлумачыць «адсутнасьцю візавага рэжыму між краінамі».

## Будзем з вадой

На пачатак вясны прагназуецца вялікая паводка, што зьвязана з празьмернай колькасьцю выпалага сьнегу. Пад’ём вады на Гомельшчыне складае 15 см у суткі. Найхутчэй вада прыбывае ў Прыпяці і Дняпры.

## Экспэртыза сына Чаркасавай

Суд Цэнтральнага раёну Менску адхіліў у сераду скаргу адваката Антона Філімонава — сына забітай у кастрычніку журналісткі Веранікі Чаркасавай — на рашэньне пракуратуры аб псыхіятрычнай экспэртызе падлетка на просьбу сьледзтва. Хлопец цяпер знаходзіцца ў Маскве.

## У Польшчу без запрашэньня

На сустрэчы ў Беластоку кіраўнікі консульскіх службаў Беларусі і Польшчы дамовіліся, што дзеля атрыманьня гадавой шматразовай візы цяпер ня трэба прад’яўляць запрашэньня. У будучыні будзе разглежана магчымасьць афармленьня шматгадовых шматразовых віз.

## Кіргізія перад выбарамі

У Кыргызстане прыпынена праца друкарні, што друкавала апазыцыйныя выданьні — адключылі электрычнасьць. Кіраўнікі друкарні кажуць, што ўлады сьвядома пайшлі на такі крок. У нядзелю маюць адбыцца парлямэнцкія выбары. Тым часам тры найважнейшыя магістралі краіны перакрыты тысячамі прыхільнікаў апазыцыі, што пратэстуюць супраць зьняцьця зь перавыбарнай гонкі двух кандыдатаў у дэпутаты.

## Як пры Мілошавічу

Улады Сэрбіі катэгарычна адкінулі прапанову Чарнагорыі адмовіцца ад сёньняшняй саюзнай дзяржавы ды прызнаць незалежнасьць іх дзяржавы. Прэм’ер-міністар Сэрбіі Васлаў Каштуніца зазначае, што прапанова Чарнагорыі парушае Бялградзкія пагадненьні 2003 г. аб стварэньні Саюзу СіЧ.

## Чэхія кампэнсуе савецкую акупацыю

Ніжная палата парлямэнту ўхваліла законапраект аб выплаце кампэнсацый ахвярам уварваньня войск Варшаўскае дамовы. Паводле закону, сваякі забітых ці параненых у выніку савецкае акупацыі ў 1968—1991 г. атрымаюць кампэнсацыю, эквівалентную 6600 даляраў. Цяпер закон мае ўхваліць Сэнат.

**АГ, ecopress.by, svaboda.org**

# «За Казуліным праглядаецца...»

Працяг са старонкі 2.

**«НН»: Пра што сьведчыць вылучэньне Казуліна?**

**ВБ:** Невядома, ці пойдзе ён да канца, наколькі гэты кандыдат тэхнічны. З досьведу мінулых гадоў вядома, як жорстка распраўляецца Лукашэнка з кандыдатамі, якія выйшлі з намэнклятуры. Вылучэньне Казуліна, калі яно не было інсьпіравана лукашэнкаўскімі палітэхнолягамі, паказвае, што намэнклятура да канца не баіцца Лукашэнкі. Нездаволеныя колы намэнклятуры вылучаюць са сваіх шэрагаў аднаго за адным палітычных лідэраў: былі Чыгір, Ганчарык, Марыніч, цяпер Казулін.

**«НН»: Днямі Лукашэнка на нарадзе па пытаньнях барацьбы з карупцыяй заявіў, што апазыцыя ўздымае на шчыт нягоднікаў, якія пракраліся. У якой меры гэта датычыць Казуліна?**

**ВБ:** Напэўна, датычыць. Была спроба крымінальнага перасьледу… Такая гістэрычная рэакцыя прэзыдэнта дае падставы меркаваць, што за Казуліным сапраўды праглядаецца расейскі сьлед. Палітычная гульня Расеі сьведчыць, што Масква пакуль не дае Лукашэнку карт-блянш на перамогу ў прэзыдэнцкіх выбарах і будзе ўсяляк штурхаць афіцыйны Менск да выкананьня прыватызацыйных плянаў яшчэ чатырохгадовай даўніны. Сапраўдны прарасейскі кандыдат мае расплачвацца беларускай маёмасьцю за падтрымку, аднаго насаджэньня расейскай мовы цяпер мала. Дарэчы, дэмакратам баяцца пераходу беларускай нафтагазахіміі пад расейскі кантроль ня варта. Расейскі капітал у гэтым пляне значна больш дамогся на Ўкраіне, што толькі паскорыла канец Кучмы і прыход Юшчанкі да ўлады.

**«НН»: Такім чынам, ужо дзясятак палітыкаў заявілі пра свае прэзыдэнцкія амбіцыі. Хто, па-Вашаму, мае найбольшыя шанцы стаць адзіным дэмакратычным кандыдатам?**

**ВБ:** Прадказаць, хто будзе адзіным, улічваючы досьвед 2001 году, складана. Калі паўторыцца сцэнар

> Альтэрнатывай Лукашэнку можа быць любы сумленны беларускі палітык.

2001 году, у фінал выбараў выйдуць два кандыдаты ад дэмсілаў. Першы будзе прэзэнтаваць грамадзянскую супольнасьць як такую. Гэта будзе партыйны лідэр ці прадстаўнік трэцяга сэктару, напрыклад, Мілінкевіч. Інтрыга ў тым, ці дойдзе да выбараў рэінкарнацыя палітыка накшталт Ганчарыка — чалавек з моцнымі намэнклятурнымі сувязямі. Калі робіцца стаўка на пасьяховую барацьбу, мяркуецца, што кандыдат павінен быць сваім для дзяржапарату.

**«НН»: Такім чынам, кандыдатам ад грамадзянскай супольнасьці Вы бачыце Аляксандра Мілінкевіча?**

**ВБ:** Ня час займацца футуралёгіяй, але ёсьць пэўныя знакі, што гэты палітык здольны заручыцца падтрымкай шырокіх дэмакратычных колаў. Слабасьць Мілінкевіча ў ягонай малавядомасьці як публічнага палітыка і аморфнасьці яго палітычнай праграмы.

**«НН»: У той жа час на прыкладзе Марыніча відаць, што сыстэма жорстка распраўляецца з кожным сваім выхадцам, які асьмеліцца падняць галаву.**

**ВБ:** Самае галоўнае, такія людзі, калі адрываюцца ад сыстэмы ўлады, вельмі часта дэзарыентаваныя. Яны ня могуць знайсьці месца ў сыстэме дэмакратычных сілаў, а таксама зацікавіць донараў. Унікальнасьць украінскага Юшчанкі ў тым, што будучы сваім для дзяржапарату, ён застаўся сваім для донараў дэмакратаў.

**«НН»: Што павінен рабіць кандыдат, каб перамагчы?**

**ВБ:** Найбольшай небясьпекай будзе, калі кандыдат паспрабуе выкарыстаць супраць Лукашэнкі лукашэнкаўскія ноў-хаў 1994 году і будзе спаборнічаць з Лукашэнкам у сацыялістычнай рыторыцы і нелюбові да беларускай мовы — абяцаць высокія заробкі, нізкія падаткі, моцную сацыяльную абарону, барацьбу з карупцыяй, а нацыянальнае пытаньне ўспрымаць у якасьці баласту. Выклікаць нейкае пазытыўнае напружаньне ў грамадзтве, справакаваць станоўчыя зрухі ў ім можа толькі кандыдат, які перастане ўспрымаць Лукашэнку як узор для перайманьня. Ён павінен узьняць палітычныя лёзунгі, якія прыцягнуць масы людзей, якія

> Сапраўдны прарасейскі кандыдат мае расплачвацца беларускай маёмасьцю за падтрымку, аднаго насаджэньня расейскай мовы цяпер мала. Дарэчы, дэмакратам баяцца пераходу беларускай нафтагазахіміі пад расейскі кантроль ня варта.

не знаходзяць сабе месца пры сёньняшнім палітычным рэжыме. Нацыянальным я бачу любога палітыка, які б не забыўся сказаць «не» згортваньню беларускага школьніцтва, «не» выцісканьню беларускай мовы. Факт нядаўняга супрацоўніцтва з лукашэнкаўскім рэжымам у гэтым выпадку адыходзіў бы на другі плян.

**«НН»: Што больш важна для кандыдата ў нашых умовах: яркая індывідуальнасьць ці ягоныя праграмы і падтрымка каманды?**

**ВБ:** Вялікая памылка меркаваць, што ў нас няма лідэра, які можа супрацьстаяць Лукашэнку. У дэмакратычных краінах асобы, якія не валодаюць так званай харызмай, становяцца прыстойнымі нацыянальнымі лідэрамі (напрыклад, Валдас Адамкус). І само пытаньне пра наяўнасьць харызмы для нас чужароднае. Важна перастаць мысьліць лукашэнкаўскай сыстэмай каардынат. Альтэрнатывай Лукашэнку можа быць любы сумленны беларускі палітык.

**«НН»: «НН» сфармулявала меркаваньне, што рэальным супернікам можа стаць толькі кандыдат, што будзе выступаць зь беларускіх нацыянальных пазыцый. Хто сярод дзесяці найбольш адпавядае гэтым умовам? Альбо такога сярод дзесяці яшчэ няма?**

**ВБ:** У тым і бяда, што большасьць сучасных дэмакратычных палітыкаў разглядаюць нацыянальныя пытаньні як пэўны баласт. Добра, калі яны ведаюць, што гэта важна, але, на жаль, ня бачаць у гэтым каштоўнасьці. Але ж Беларусь ня можа быць дэмакратычнай і пры гэтым ненацыянальнай. Выбар Беларусі ў бок дэмакратыі — гэта выбар у бок Эўропы. Цяпер мы знаходзімся пад моцным уплывам расейскай культурнай і палітычнай прасторы. Выхад у Эўропу будзе адштурхоўваньнем ад Расеі. Такая вось палітычная фізыка.

**«НН»: Ці далёка да дэмакратычнай Беларусі? Хто пераможа ў 2006-м?**

**ВБ:** Калі праецыраваць адносны эканамічны дабрабыт і т.зв. палітычную стабільнасьць на бліжэйшы час, адказ відавочны: пераможа Аляксандар Лукашэнка. Інтрыга выбараў у тым, якой цаной ён пераможа, які асадак застанецца пасьля гэтай перамогі. Калі Лукашэнка зноў пераможа «элегантна», працягнецца згортваньне элемэнтаў грамадзянскай супольнасьці. Важны вынік — падвядзеньне балянсу набыткаў і страт дэмакратычнай супольнасьці пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. Прэзыдэнцкія выбары-2006 трэба разглядаць як магчымасьць для грамадзтва скалануцца ў добрым сэнсе гэтага слова, выйсьці за межы прэзыдэнцкіх сцэнароў, калі прэзыдэнту супрацьстаіць разгублены кандыдат з размытай рыторыкай, з праграмай, якая зьявілася за месяц да галасаваньня. Мэта наступных выбараў — атрымаць тактычную перавагу. Зь яе можа прабіцца насеньне на наступныя палітычныя кампаніі. Задача апазыцыйных лідэраў — правакаваць рэжым на зьдзяйсьненьне такіх учынкаў, якія выяўляюць яго сапраўднае агіднае аблічча ва ўсіх паталягічных праявах і набліжаюць яе канец.

Канкурэнтам Лукашэнкі будзе той палітык, які знойдзе ў сабе мужнасьць не шукаць народнай любові лукашэнкаўскімі мэтадамі. Можна казаць аб змаганьні не асоб — сьветапоглядаў, рознага бачаньня Беларусі. Каляніяльнаму кандыдату Лукашэнку мусіць супрацьстаяць нацыянальны кандыдат. Ня так важна, выйграе ён заўтра ці не. Важна, каб нарэшце зьявіўся пункт адліку для наступных часоў.

**Гутарыў Арцём Лява**

# Беларускі Чарнігаў

Адзінага кандыдата ад апазыцыі прапанавана выбраць паводле схемы Мілінкевіча.

20 лютага ва ўкраінскім Чарнігаве прайшоў сход кандыдатаў у дэпутаты, што бралі ўдзел у леташніх парлямэнцкіх выбарах. Памяшканьня для правядзеньня спатканьня ў Беларусі не знайшлося.

110 удзельнікаў сходу абмеркавалі стратэгію апазыцыі падчас прэзыдэнцкіх выбараў. Сустрэчу вялі сябройка Сойму Партыі БНФ Валянціна Сьвяцкая й сакратар ЦК ПКБ Валеры Вухналёў.

Аляксандар Дабравольскі, які ўваходзіць у экспэртную групу пры Пастаянна дзейнай нарадзе дэмакратычных сіл (ПДН), прэзэнтаваў удзельнікам напрацоўкі ПДН — падыходы да стварэньня праграмы аб’яднаных дэмакратычных сіл, вылучыўшы тут некалькі падставовых прынцыпаў: незалежнасьць, дэмакратыя, свабода, рынкавая эканоміка, а таксама асновы стратэгіі грамадзкай кампаніі, прымеркаванай да прэзыдэнцкіх выбараў. Расьпісаныя этапы й меркаваныя мэханізмы вылучэньня адзінага кандыдата, ягонай «раскруткі», правядзеньня сацыяльных кампаній і захады, скіраваныя на патрабаваньне абвяшчэньня праўдзівых вынікаў выбараў.

Самай чаканай часткай сходу былі выступы тых палітыкаў, што прэтэндуюць на званьне адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл. Прамаўлялі Аляксандар Вайтовіч, Сяргей Калякін, Уладзімер Колас, Анатоль Лябедзька, Аляксандар Мілінкевіч, Валеры Фралоў.

Сп.Фралоў прапанаваў стварыць новы каардынацыйны орган — Грамадзкую палату. Ідэя набрала тры галасы «за». Генэрал заявіў, што ў прапанаваных ПДН-схемах удзельнічаць ня будзе і пойдзе самастойна, тым больш што яму «сымпатызуюць людзі ў рэгіёнах, якія зьяўляюцца актывістамі самых розных апазыцыйных партый».

Эмацыйна й пераканаўча выступіў Калякін. Як потым у кулюарах казалі некаторыя зь беспартыйных былых кандыдатаў — «здаецца, падтрымаў бы Калякіна, але потым прыгадаў, што ён камуніст».

Прамовы Аляксандра Вайтовіча і Ўладзімера Коласа былі сухаватыя.

Аляксандар Мілінкевіч засяродзіў увагу на тым, што выбраньне адзінага кандыдата — не галоўная задача: «Нам трэба разагрэць людзей. Выбары адзінага кандыдата — гэта толькі інструмэнт, а ня мэта».

Анатоль Лябедзька выклікаў сымпатыі ўжо тым, што прыехаў на сход, нягледзячы нават на тое, што праз траўму нагі мог хадзіць толькі на мыліцах.

Тым ня менш, сымпатыі сотні прысутных да лідэра АГП не дапамаглі партыі пры галасаваньні пытаньня аб рэкамэндаваных для аб’яднанай апазыцыі датах правядзеньня агульнабеларускага Кангрэсу, на якім будзе вызначаны адзіны кандыдат. Актывісты АГП прапаноўвалі вызначыцца зь лідэрам аб’яднанай апазыцыі ўвосень 2005 году, аднак большасьць удзельнікаў сходу выказаліся за тое, каб пытаньне не адкладаць і абраць адзінага кандыдата не пазьней за чэрвень.

Калі ў залі паўстала пытаньне аб поўным сьпісе тых, хто цяпер прэтэндуе на выкананьне місіі адзінага кандыдата, падняўся Сяргей Калякін, які сказаў, што, паводле ягоных назіраньняў, да шасьці прысутных у Чарнігаве трэба далучыць Аляксандра Ярашука, Міколу Статкевіча і Аляксандра Казуліна. Прычым пра фактычнае вылучэньне апошняга стала вядома толькі ў дзень выезду ў Чарнігаў, з публікацыі ў «Народнай волі».

Беларускі сход прывітала новая ўкраінская ўлада. На ім выступіў намесьнік старшыні блёку Юліі Цімашэнкі і старшыня камітэту па мясцовым самакіраваньні Вярхоўнай Рады Анатоль Матвіенка.

**Аляксей Жолудаў**

КАМЭНТАР «НН»

## «Воля народу» ці «Народная воля»?

Газэта «Народная воля», што зь нядаўняга часу займаецца раскруткай кандыдатуры Аляксандра Казуліна, назвала сход у Чарнігаве «імітацыяй палітычнай барацьбы». З гэтага можна зрабіць выснову, што каардынатар руху «Народная воля», прабачце, «Воля народу», ня мае намеру змагацца за падтрымку дэмакратычных партый і рухаў і хоча арганізаваць «новую апазыцыю». Задача пачэсная. Некаторыя спрабавалі ажыцьцявіць яе і раней. Праўда, бяз посьпеху.

Аўтар «нарадавольскага» камэнтару прапануе апазыцыі спачатку зьмяніць закон аб выбарах. Толькі як гэта зрабіць, не зьмяніўшы ўлады? Тое самае зь вядомым посьпехам спрабавалі зрабіць ранейшыя фаварыты «Народнай волі» — генэрал Фралоў, Марыніч. Нават ва Ўкраіне ўнесьці зьмены ў выбарчы кодэкс удалося толькі пасьля другога туру, ужо падчас рэвалюцыі.

Незразумелы папрок у тым, што «нарадзіць адзінага дэмакратычнага лідэра абяцаюць у далёкай пэрспэктыве». Пачатак чэрвеня ня так і далёка. Пахваліць бы апазыцыю за тое, што яна нарэшце прапануе сякі-такі плян дзеяньня.

Незразумелы тон, выбраны ў дачыненьні да тых, на кім трымаюцца асяродкі незалежнага грамадзтва ў правінцыі. Юрась Губарэвіч, дэпутат Белаазёрскага гарсавету, кіраўнік Берасьцейскай абласной арганізацыі Партыі БНФ, кажа пра «Народную волю»: «Калі мы палітычныя імітатары, то што можна казаць пра ўсіх астатніх? Людзі, што сабраліся ў Чарнігаве, маюць рэальны палітычны ўплыў на месцах. Яны маюць каманды, сабралі па тысячы подпісаў, падтрымліваюцца насельніцтвам. Яны прадстаўляюць сабой рэальныя палітычныя сілы, цэлы іхны спэктар, бо тут прадстаўлены ўсе сілы — ад БНФ да камуністаў».

Ленін назваў палітычную газэту калектыўным арганізатарам і прапагандыстам. Адно што газэта ня можа падмяняць сабой палітычны працэс. Во гэта ўжо — сапраўдная імітацыя.



КУЗЬНЯ НОВЫХ КАДРАЎ. Памыйніца на тэрыторыі ўнівэрсытэцкага гарадка БДУ чакае амбітных. 23 лютага 2005 году.

ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Усё пра Казуліна

**Аляксандар Казулін.** Нарадзіўся 25 лістапада 1955 г. у Менску. Скончыў спэцыялізаваную (ангельская мова) школу №87. У 1972—1974 — студэнт вячэрняга аддзяленьня матэматычнага факультэту БДУ. У 1974—1976 служыў на Балтыйскім флёце ў марской пяхоце. У 1980 скончыў БДУ, кандыдат фізыка-матэматычных навук. Працаваў у БДУ.

У 1983—1986 — сакратар камітэту камсамолу БДУ. У 1988—1996 працаваў у Мінадукацыі. 11 кастрычніка 1994 указам прэзыдэнта №149 прызначаны намесьнікам міністра адукацыі і навукі РБ. З 1996 да лістападу 2003 — рэктар БДУ. Быў прызначаны на гэтую пасаду, да гэтага цягам некалькі гадоў рэктары БДУ абіраліся. У 1998—2001 — міністар без партфэлю.

Пры Казуліну моцна ўзрасьлі цэны на платнае навучаньне, а БДУ займеў нават свой адмысловы курс даляра, які моцна розьніўся ад курсу Нацбанку.

Паралельна імкнуўся заваяваць аўтарытэт студэнтаў, пры ім праводзілася безьліч унівэрсытэцкіх мерапрыемстваў, заснавана FM-станцыя «Юністар». На сьвяточных мерапрыемствах, прысьвечаных пачатку навучальнага году, выяжджаў на канцэртную пляцоўку на матацыкле, спускаўся з гелікоптэру на адкрыцьці парку «Дрымлэнд», сьпяваў разам з «Дыскатэкай Аварыя». Выйграў зямельную спрэчку ў «Макдональдсу» на вуліцы Ленінградзкай, праз што радыё «Свабода» і некалькім замежным фірмам давялося шукаць новыя офісы.

У сьнежні 2002 кандыдатура Казуліна на прадстаўніка Беларусі ў ААН была ўзгодненая ў парлямэнце і МЗС, аднак адхіленая прэзыдэнтам.

Зьняты з пасады рэктара БДУ 17 лістапада 2003 году. На студэнцкіх сайтах актыўна абмяркоўвалася пытаньне студэнцкай забастоўкі пратэсту, якое так і павісла ў паветры.

За некалькі дзён да зьняцьця Казулін быў аб'яўлены ў вышук — пра гэта ўрачыста аб'явілі па тэлевізіі. Рэктара «запрашалі» на допыт у пракуратуру ў якасьці сьведкі па крымінальнай справе ў дачыненьні да прадпрыемства «Унікаштмет», кіраўнікі якога падазраваліся ў крадзяжы 34 кг золата больш чым за 300 тыс. даляраў. У кастрычніку 2004 г. справа была спыненая.

Быў прэзыдэнтам футбольнага клюбу «Зорка-ВА-БДУ», узначальвае Беларускую фэдэрацыю фрыстайлу. Менавіта «прадстаўнік» ягонага спартовага ведамства — Аляксей Грышын — у 1998 г. здабыў адзіны алімпійскі мэдаль у Солт-Лэйк-Сіці.

Узнагароджаны мэдалём «За працоўныя дасягненьні».

# Казулінскі выклік, Шэйманаў адказ

22 лютага пачаліся звальненьні супрацоўнікаў БДУ, якія падпісаліся пад зваротам грамадзянскай ініцыятывы «Воля народу». Сваіх пасадаў пазбаўленыя начальнік упраўленьня міжнародных сувязяў Аляксандар Рухля, начальнік упраўленьня па справах культуры Ўладзімер Макарэвіч, загадчык агульнаўнівэрсытэцкай катэдры фізкультуры Сяргей Макарэвіч, прафэсар, член-карэспандэнт НАНБ Алег Лойка, дацэнт БДУ, старшыня Саюзу пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч, дырэктар студгарадка Павал Бычкоўскі. Большасьць звальняецца «паводле згоды бакоў».

# Пяць тыпаў падпісантаў

84-х падпісантаў пад маніфэстам руху «Воля народу» і 18 рэгіянальных яго каардынатараў можна падзяліць на пяць тыпаў:

**Натальля Машэрава** — патэнцыйна беларуская Бурджанадзэ і Цімашэнка, а пакуль проста дачка Пятра Машэрава.

**Дзеячы нацыянальнай інтэлігенцыі**, гатовыя падпісацца за ўсіх, хто выступае ў падтрымку нацыянальнай культуры: Вольга Іпатава, Алесь Шатэрнік, Алег Лойка, Генадзь Лыч.

**Рабочыя, калгасьнікі і пэнсіянэры**, ад Фадзея Іваноўскага, абвальшчыка Ваўкавыскага мясакамбінату, да Марыі Алівай, у свой час кіраўніцы Асацыяцыі працоўных жанчын.

**Рэгіянальныя актывісты апазыцыі**, што пасьпелі расчаравацца ў партыях кшталту Народнай грамады і не пасьпелі пакаштаваць слодычы рухаў кшталту «Наша Беларусь». Напр., Віктар Карлінскі з Баранавічаў, Франц Аўдзей з Горадні, Віктар Гарбачоў з Барысава. На месцах ведаюць, хто зь іх чаго варты.

**Работнікі БДУ**, цяпер ужо былыя. Ад дацэнта Алеся Пашкевіча да загадчыка пікантнага аддзелу замежных сувязяў Аляксандра Рухлі.

## ГОЛАС НАРОДУ

### 10 аргумэнтаў за Казуліна

Казуліна Лукашэнка баіцца.

Казулін будзе прагрэсам у параўнаньні з Лукашэнкам, па ўзроўні эканамічнае свабоды, свабоды СМІ і ў нацыянальнай сфэры.

Ён здольны адміністратар, добры гаспадар. Пры ім БДУ пачаў разбудоўваць: інтэрнаты, факультэты...

Ён не з тае апазыцыі, што 28 разоў прапаласкана.

Казулін эфэктны чалавек, нават з парашутам скакаў.

Гэта валявы дзядзька. Лось, а не казуля.

За Казуліным стаяць грошы. Казулін на срабрыстай «Вольве» езьдзіць.

За Казуліным, мусіць, стаяць амэрыканцы. І ён здолее дабіцца падтрымкі Крамля.

Любы, абы не Лукашэнка.

Зварот «Волі народу» моцны, у ім ясна падкрэсьленыя нацыянальныя інтарэсы і нацыянальныя прыярытэты.

### 10 аргумэнтаў супраць Казуліна

Казулін яшчэ два гады таму даваў згоду на прызначэньне паслом у ААН. Тожа мне апазыцыянэр! Ён сам сябе называў «чалавекам прэзыдэнта». Яго выгналі ад кармушкі, ён ня сам пайшоў.

Хто ён такі? Што ён зрабіў для Беларусі?

Цёмны конік. Адзін раз ужо мянялі Кебіча на Лукашэнку...

Ён ня пойдзе да канца. Прыцісьнуць — і ён здымецца, як Машэрава ў 2001-м.

Яго вылучае Масква для шантажу Лукашэнкі. Ад гэтага патыхае новым праектам Паўлоўскага. Гэта ўсё ня наша гульня.

За Казуліным, мабыць, стаяць амэрыканцы.

У сьпісе падпісантаў «Волі народу» і палітычныя бараны, якія ўсё на сьвеце падпісвалі, і людзі, па пасадзе зьвязаныя з спэцслужбамі.

За Казуліным стаяць грошы.

Ён выганяў студэнтаў за палітыку, русіфікаваў усё, нават філфак. Гэта пры ім Мурына кіравала філфакам.

Ён нават гаворыць як камсамолец-бізнэсовец, з словамі-паразытамі... Гэта беларускі Януковіч па манерах. На ім пробы няма дзе ставіць.

**Запісана наведнікамі Рэдакцыі за сераду, 23**

## СЬЦІСЛА: ГАСПАДАРКА ЗА ТЫДЗЕНЬ

### Выручка

Нацбанк падвёў вынікі пераходу на новыя правілы спагнаньня ПДВ у гандлі з Расеяй. Праз шматлікія непаразуменьні валютная выручка беларускіх прадпрыемстваў ад гандлю з Расеяй у студзені склала толькі 359 млн даляраў — на 46,7% менш, чым у сьнежні. А вось з краін, што не ўваходзяць у СНД, у студзені нашы прадпрыемствы атрымалі 587,2 млн даляраў — рост на 49%.

### Марачнае піва

Новы прынцып маркіроўкі піва і алівы прынясе дзяржаве ня менш за 10 млрд рублёў дадатковых падаткаў. У Міністэрстве падаткаў і збораў лічаць, што дадатковыя ідэнтыфікацыйныя налепкі на бутэльках ды каністрах дапамогуць змагацца з кантрабандным таварам. Новая маркіроўка будзе ўведзеная з 18 сакавіка. Калі экспэрымэнт пройдзе ўдала, ідэнтыфікацыйныя знакі будуць наклейваць таксама на дарагія электратавары, аўдыё- ды відэакасэты і дыскі.

### Залатая «Камунарка»

Канцэрн «Белхарчпрам» прапанаваў падоўжыць яшчэ на пяць год тэрмін дзеяньня «залатой акцыі» на ААТ «Камунарка». Гэта дасьць дзяржаве магчымасьць кіраваць фабрыкай яшчэ адну пяцігодку. Залатую акцыю на «Камунарцы» ўвялі ў 2000 г., пазбавіўшы расейскі канцэрн «Бабаеўскі» ды іншыя замежныя фірмы мараў прыватызаваць салодкую фабрыку.

### Рыэлтынг — толькі для фірмаў

Індывідуальным прадпрымальнікам забаранілі займацца рыэлтэрскай дзейнасьцю. Цяпер у краіне 220 суб'ектаў гаспадараньня, якія займаюцца апэрацыямі зь нерухомасьцю, трэцяя частка іх — індывідуальныя прадпрымальнікі. Цяпер яны страцяць магчымасьць працаваць.

### «Крыніца» зальe вобласьці півам

Бровар «Крыніца» пашырыць сетку продажу свайго піва ў краіне. Для гэтага ў кожнай вобласьці будуць створаныя гандлёвыя філіі — буйныя магазіны-склады, якія змогуць самастойна заключаць кантракты зь іншымі крамамі. Адна такая філія ўжо адчынілася ў Магілёве. У выніку ўдалося павысіць узровень продажаў аж у пяць разоў.

### ЭЗ — ня пральная машына

Эўразьвяз плянуе ўвесьці абмежаваньне на ўвоз наяўнай валюты фізычнымі асобамі. Калі Эўрапарлямэнт ухваліць гэтае рашэньне, у краіны ЭЗ нельга будзе ўвозіць больш за 10 тыс. эўра без дэклярацыі. Мэта абмежаваньня — барацьба з адмываньнем грошай.

### «Він-Біль-Дан» замест «Бабулінага гарлача»

Магілёўскі малочны камбінат распачынае продаж сваёй прадукцыі ў Расею. Пастаўляць будуць стэрылізаванае малако ва ўпакоўках «тэтра пак», якое можна захоўваць 6 месяцаў. Праўда, прадавацца яно будзе не пад фірмовай магілёўскай маркай «Бабулін гарлач», а пад брэндам «Він-Біль-Дан». Магілёўскі малочны камбінат экспартуе трэць сваёй прадукцыі, усё — у Расею.

**АК, АФН**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

на **24 лютага:**
1 амэрыканскі даляр — 2 163 рублі.
1 эўра — 2 858,30.
1 латвійскі лат — 4 106,31.
1 літоўскі літ — 827,90.
1 польскі злоты — 722,01.
1 расейскі рубель — 77,72.
1 украінская грыўна — 408,34.

**Паводле Нацбанку**

# Сьвятыя адступіліся ад Дзямідава

14 лютага, у дзень Сьвятога Валянціна, у наваполацкім гарадзкім судзе пачаўся працэс над былым камэрцыйным дырэктарам Полацкага заводу шкловалакна Генадзем Дзямідавым, якога затрымалі амаль год таму — 17 сакавіка, у дзень Сьвятога Патрыка. 23 лютага быў вынесены вырак: восем гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму.

Дзямідава абвінавачваюць у атрыманьні хабару ад адной нямецкай фірмы, дзелавога партнэра палачанаў, за бесьперабойную пастаўку з прадпрыемства прадукцыі высокай якасьці, а таксама ў нявыплаце падаткаў. У справе фігуруе сума ў 706 млн рублёў. Гэтыя грошы, нібыта, былі пералічаны на рахунак Дзямідава ў банку ў нямецкім Ульме.

Сам Дзямідаў не адмаўляе наяўнасьці рахунку. Але сьцьвярджае, што грошы былі пералічаны немцамі за аказаньне паслуг на працягу некалькіх гадоў у справе прасоўваньня прадукцыі (фольгі) нямецкай партнэрскай фірмы на рынкі Паўднёва-Ўсходняй Азіі, найперш Кітаю і Тайваню. «Шкловалакно» мае сталыя сувязі з азіяцкімі прадпрыемствамі мікраэлектронікі ў сфэры высокіх тэхналёгій (мікраэлектроніка), і Дзямідаў меў магчымасьць рэкамэндаваць прадукцыю нямецкай фірмы. Акрамя таго, Дзямідаў сьцьвярджае, што нават ня ведаў, колькі грошай на тым рахунку, бо атрымаў ад немцаў банкаўскую картку і аплачваў ёю выключна прадстаўнічыя і камандзіровачныя выдаткі.

Спачатку суд апытае сьведак з «Шкловалакна», высьвятляючы, ці даваў Дзямідаў загад бесьперабойна пастаўляць нямецкай фірме полацкую прадукцыю выключна высокай якасьці. Трэба меркаваць, пасьля такіх судовых разбораў кіраўнікі беларускіх прадпрыемстваў як агню будуць баяцца замежна-эканамічнай дзейнасьці.

**Васіль Кроква, Полацак**

# Ды 250 бясплатных пуцёвак

Чыноўнікі Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта выганяюць пісьменьнікаў з апошніх пакояў Дому літаратара. Ім пакідаюць толькі 58 м². Пісьменьнікаў у вялікую залю Дому літаратара будуць пускаць толькі за грошы. Затое ім абяцаюць 250 пуцёвак у Ісьлач.

У аўторак 22 лютага яшчэ невядома было пра звальненьне шэфа Саюзу пісьменьнікаў, Алеся Пашкевіча, з БДУ, і Саюз пісьменьнікаў сьвяткаваў маральную перамогу. Гэтак успрынялі на Фрунзэ, 5 ліст ад Мінінфармацыі з просьбай да СП адрачыся заснавальніцтва часопісаў «Полымя», «Маладосьць», «Нёман» і газэты «ЛіМ». Старшыня Алесь Пашкевіч на пасяджэньні Рады СП так і сказаў: Мінінфармацыі прызнала незаконнасьць стварэньня холдынгу «Літаратура і мастацтва», выданьні якога ўжо два гады не пазначаюць у ліку заснавальнікаў Саюз пісьменьнікаў (а павінны ж яшчэ і ўзгадняць рэдакцыйную палітыку!). Рэакцыя Рады Саюзу была аднагалоснай: ад заснавальніцтва не адмаўляцца й запатрабаваць, каб Міністэрства забясьпечыла арганізацыі магчымасьць ажыцьцяўляць правы заснавальніка. Намесьнік старшыні Барыс Пятровіч нават прапанаваў, каб Мінінфармацыі вынесла выданьням холдынгу папярэджаньне за парушэньне заканадаўства.

Іншыя праблемы, разгледжаныя на пасяджэньні Рады, выглядалі менш аптымістычна. А пытаньні прынцыповыя — маёмасныя. Таму на Радзе прысутнічаў адзін з самых уплывовых людзей дзяржавы, генэрал і старшыня Літфонду Мікалай Чаргінец.

Галаўны боль літаратараў — дом творчасьці «Ісьлач». Некалі шыкоўны будынак стаіць у напаўразбураным стане. Саюз пісьменьнікаў ня ў стане яго ўтрымліваць. Паводле слоў старшыні М.Чаргінца, толькі на рамонт спатрэбіцца аж 3—4 млн даляраў. Выратаваньне генэрал Чаргінец бачыць толькі ў тым, каб прадаць дом творчасьці (афіцыйная ацэнка паводле астаткавага кошту — 2,268 млрд руб.). Мяркуючы, ужо і пакупнік ёсьць: кампанія «Аўтабізнэс» абяцае пакінуць пісьменьнікам у год 250 бясплатных двухтыднёвых пуцёвак разам з мэдабслугоўваньнем, 1—2 га зямлі, адраментаваны катэдж, а таксама выплаціць назьбіраныя за апошнія гады пазыкі. Але Чаргінец нібыта не размаўляў яшчэ з кіраўніцтвам фірмы, а толькі з клеркамі.

Колішні старшыня Саюзу Ўладзімер Някляеў тут жа зазначыў, што пры канцы 1990-х ён бы на такіх умовах прадаў «Ісьлач» без развагі, ды прадказаў, што фірма зробіць з Дому творчасьці кемпінг для дальнабойшчыкаў.

Малочныя рэкі ў кісельных берагах, абяцаныя Чаргінцом, аднак, пераканалі ня ўсіх пісьменьнікаў. Пагатоў што прысутны дырэктар Беларускага ліцэю Ўладзімер Колас прапанаваў знайсьці грошы й адрамантаваць «Ісьлач», каб надалей ёй маглі валодаць пісьменьніцкая арганізацыя напалам зь Ліцэем: дзеці будуць вучыцца, пісьменьнікі — стварáць. Рада пагадзілася прыняць да ведама абодва варыянты — вырашаць усё адно давядзецца агульнаму сходу Беллітфонду 25 лютага.

Другое маёмаснае пытаньне — уласна Дом літаратара. Будынак цяпер належыць Кіраўніцтву справаў прэзыдэнта, і чыноўнікі выганяюць пісьменьнікаў з апошніх пакояў. Літаратары цяпер распараджаюцца 614 квадратнымі мэтрамі (бібліятэка і некалькі пакояў), а ім пагражаюць пакінуць толькі 58 м². З Дому літаратара выкінуць бібліятэку, самім пісьменьнікам можна будзе праводзіць вечарыны толькі на агульных умовах. Гэта значыць, за грошы, па камэрцыйных расцэнках.

Працяг на старонцы 9.

ТЭМА

## Вольга Іпатава: «Я ўскладаю пэўную надзею»

**«НН»: Вы паставілі свой подпіс пад зваротам руху «Воля народу». Вы бачыце ў Аляксандру Казуліну агульнанароднага лідэра?**

**ВІ:** Я паставіла свой подпіс пад зваротам да беларускага народу, бо ўскладаю пэўную надзею на гэты рух. У сёньняшняй сытуацыі трэба, прабачце за выраз, падтрымліваць усё, што варушыцца. Пэўная доля скептыцызму, вядома, у мяне ёсьць. Я падпісалася пад зваротам са спадзяваньнем, што гэты чалавек дапаможа зьмяніць нешта да лепшага. Я перакананая, што ў беларускі рух трэба прыцягваць як мага больш людзей і рабіць іх нашымі саюзьнікамі.

**«НН»: Казулін заявіў, што мы павінны зрабіцца «эўрапейскімі расейцамі». Як вы гэта пракамэнтуеце?**

**ВІ:** Мы абурыліся, але я думаю, што гэта ўсё-такі выпадковая агаворка. Калі ж гэта не агаворка, а пазыцыя, дык мы, вядома, будзем супраць.

**Апытваў АК**

## Любоў Лунёва: «Мяне гэта абурае»

**Праваабаронца Любоў Лунёва страціла працу на гістфаку БДУ ў 1998 г.**

«Звольнілі мяне, проста не падоўжыўшы кантракту, але, вядома, з палітычных меркаваньняў.

Першае, што ў маёй памяці асацыюецца з прыходам Казуліна ў БДУ, — гэта сходы дэканаў, дзе ім абвясьцілі — за ўдзел студэнтаў факультэтаў у несанкцыянаваных акцыях дэканы будуць несьці асабістую адказнасьць. Памятаю, яшчэ дэкан факультэту міжнародных адносін Шарапа хадзіў-казаў студэнтам: «На сябе напляваць — мяне пашкадуйце». Гэта мела плён, да таго ж адбываліся адлічэньні. Увага надавалася і выкладчыкам. Выкладчыкам гуманітарных факультэтаў былі разасланы анкеты, дзе трэба было ўказваць сваю палітычную прыналежнасьць і г.д. Былі й больш савецкія мэтады. Напрыклад, акурат Казулін увёў практыку «сядзеньня» выкладчыкаў на катэдрах, каб не цягаліся абы-дзе. І Казулін дасягнуў свайго — пры ім выкладчыкі пачалі баяцца выходзіць на дэманстрацыі, як яны тое рабілі нават пры Кухарчыку.

Магу згадаць і больш калярытныя моманты. Напрыклад, як Казулін ладзіў для прадстаўнікоў «Славянскага сабору» сустрэчы з студэнтамі ва ўнівэрсытэце. Студэнтаў туды заганялі сілком. Або выпадкова — прымацаваць на гістфаку тройчы палены да таго сьцяг на шасьціметровую вышыню да столі і абараніць яго шклом.

Пры Казуліну ў БДУ быў начыста зьнішчаны дух дэмакратыі дый проста творчасьці.

Безумоўна, кожны мае права балятавацца ў прэзыдэнты. Мяне зьдзівіла пазыцыя некаторых прадстаўнікоў дэмакратычнай апазыцыі, што імгненна забыліся на ўсе перасьледы і падпісаліся пад заявай гэтай асобы, што ня мае нічога супольнага з дэмакратыяй. То бок хай сабе Казулін, але пры чым тут дэмакратыя і чаму такія шаноўныя людзі далучыліся да гэтае справы?»

**Запісаў СБ**

## Гавораць студэнты і выкладчыкі БДУ, якія пацярпелі пры Казуліну

### Казулін мяне аднавіў

**Павал Севярынец: навучаўся ў БДУ за Казуліным, перасьледаваўся ў той час па палітычных матывах.**

Я не магу адназначна нэгатыўна ацэньваць дзейнасьць Казуліна. Некаторых студэнтаў выключалі, у тым ліку і нейкіх маладафронтаўцаў. Самы вядомы прыклад — гэта Аляксей Шыдлоўскі. Але вядома, гэта было праз розныя непалітычныя фармулёўкі, на ўзроўні дэканатаў і г.д. Я сам аднавіўся на навучаньні са згодай Казуліна. Другі раз Казулін распарадзіўся прыняць маю дыплёмную працу, напісаную на тарашкевіцы.

Што датычыць Казуліна як кандыдыта, дык «Малады фронт» ужо вызначыўся з сваімі прыярытэтамі. Сп. Казулін пакуль не ўваходзіць у гэты пералік.

### Казулін нас сцэмэнтуе

**Сяргей Марцалеў — адлічаны з факультэту міжнародных адносін ў 1997 г.**

Мяркую, рэктар нікога асабіста не адлічвае. У мяне больш прэтэнзій да майго дэкана сп.Шарапы, як той сябе павёў у той сытуацыі. Хоць я здаў сэсію, мяне адлічылі фармальна за няздачу заліку па мэдычнай падрыхтоўцы, сабраўшы камісію з чатырох кандыдатаў і двух дактароў навук.

Што да Казуліна як кандыдата ад дэмакратычнай апазыцыі, у якасьці палітыка ён досыць пэрспэктыўная фігура і можа стаць цэмэнтуючым зьвяном, якога не ставала.

Казулін сапраўды ў пэўнай ступені нясе адказнасьць за палітыку, што праводзілася ва ўнівэрсытэце. Але ён як чыноўнік мусіў ажыцьцяўляць лінію дзяржавы. Ён жа мог паводзіць сябе і больш жорстка.

### Наступны — Рыбакоў?

**Алесь Семчанка, атрымаў вымову як актывіст Свабоднага прафсаюзу студэнтаў БДУ.**

Аляксандар Казулін — адзін з парадыгмальных прыкладаў «бацькавага прызыву» ва ўладу, накшталт Ягора Рыбакова ды інш. Іх можна сьмела аб'ядноўваць у своеасаблівую клясу палітычных мутантаў: немаведама адкуль іх дасталі, затое прызначылі на статусныя пасады, якія пры нармальным разьвіцьці падзей самі па сабе могуць быць пікам працяглай кар'еры для любога прафэсіянала.

На Казуліна як апазыцыйнага кандыдата ў прэзыдэнты нават кампрамат ня трэба доўга шукаць. «СБ» проста трэба перадрукаваць усё, што дэмакратычная прэса пісала пра рэктара БДУ пасьля прызначэньня яго на гэтую пасаду асабіста Лукашэнкам. Для калярытнасьці дадаць некалькі ўспамінаў ахвяраў казулінскага абыходжаньня з студэнтамі ці прафэсурай. Азаронак на такім багатым матэрыяле за тыдзень здыме сэрыял.

Жахліва ўявіць, але пры такой дынаміцы наступным кандыдатам ад сацыял-дэмакратаў можа быць Ягор Рыбакоў.

**Апытваў Сяргей Богдан**

## Аляксандар Казулін: «У нас шмат людзей з намерамі. І няшмат людзей зь дзеяньнямі»

Працяг са старонкі 1.

**«НН»: Дык зьбіраліся ці не зьбіраліся?**

**АК:** Хіба гэта сёньня так важна? Гэта ўжо гісторыя, мінуўшчына.

**«НН»: Вы лічыце сацыял-дэмакратыю пэрспэктыўным шляхам?**

**АК:** Інача́й бы я гэтым не займаўся.

**«НН»: Якім Вы бачыце свайго выбарца?**

**АК:** Просты народ. Я спадзяюся толькі на тое, што сваімі дзеяньнямі мы зможам прыцягнуць сымпатыю. Ёсьць пытаньне адказнасьці: мы часта не ва ўладзе не разумеем, што гэта — адказнасьць. Вось калі надыдзе адпаведнасьць адказнасьці і памкненьняў, тады будзе ўсё нармальна. А проста ганяць вецер словамі — гэта вельмі лёгка…

**«НН»: Як даўно Вас прывабіла сацыял-дэмакратычная ідэя?**

**АК:** Я заўжды зыходжу з мэтазгоднасьці. Каштоўнасьці сацыял-дэмакратычныя мне заўжды былі блізкімі па духу. Я ў свой час быў у камуністычнай партыі і ўступаў туды не пад прымусам — я лічыў, што гэта каштоўнасьці, якія могуць прывесьці да будучыні чалавецтва. Мэты сацыял-дэмакратыі лічу сёньня найбольш прымальнымі для разьвіцьця грамадзтва.

**Гутарыў Аркадзь Шанскі**

# Прыватнік перамагае

Пастаўскі раён мае шэраг адметнасьцяў. Напрыклад, мяжу зь Літвой, якая дае магчымасьць вялікай колькасьці жыхароў памежжа займацца дробным бізнэсам — перавозкай тавараў. Для пэнсіянэраў і жыхароў памежных тэрыторый перасячэньне граніцы спрошчанае. Шырока распаўсюджаны ў Паставах такі від занятку, як перагонка ў Беларусь іншамарак. Цяпер колькасьць аўтамабіляў, якія можна прыгнаць зь Літвы, абмежаваная, таму гоншчыкі выкарыстоўваюць падстаўных асоб-пэнсіянэраў. Калі б была статыстыка, то мясцовыя пэнсіянэры былі б у лідэрах па куплі замежных патрыманых аўтамабіляў. Лідзіруе раён і па колькасьці беспрацоўных (афіцыйна зарэгістравана 840 чалавек) — расфармаваньне буйной групоўкі авіяцыі і ракетнай дывізіі пакінула вялікую колькасьць пастаўчан без занятку.

Яшчэ адметнасьцю ёсьць тое, што толькі ў апошнія гады тут створаны больш-менш спрыяльныя ўмовы для прыватнага прадпрымальніцтва. Лічбы паказваюць, што прыватнік пераканаўча перамагае дзяржаўны сэктар. Летась 34% розьнічнага таваразвароту былі сфармаваны індывідуальнымі прадпрымальнікамі й фізычнымі асобамі, а іх доля ў аказаньні бытавых паслуг склала больш за 48%.

Улады ня надта афішуюць долю прыватнага сэктару ў сельскагаспадарчай вытворчасьці. А тут яна яшчэ больш уражальная.

Здавалася б, менавіта ў гэтым сэктары павінны шукаць сваё апірышча мясцовыя філіі апазыцыйных партый. Рэч у тым, што прыватныя прадпрымальнікі Пастаў зусім неарганізаваныя. У іх асяродзьдзі было некалькі спроб сумеснага процідзеяньня самавольству ўлад, нават стварэньня нейкага прафсаюзу. Але скончылася няўдачай. Тут спрацоўвае ня толькі глыбокі індывідуалізм людзей, якія выбралі для сябе гэты занятак, але і спэцыфіка глыбінкі. Кожны чалавек навідавоку, і тым, у каго ўлада, лёгка знайсьці мэтады індывідуальнай апрацоўкі актывістаў.

**Міхал Гіль, Паставы**



ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Судзьдзі не даюць рады

За апошнія пяць гадоў колькасьць зваротаў у гаспадарчыя суды краіны павялічылася у тры разы,а колькасьць судзьдзяў не зьмянілася. Пра гэта 17 лютага ў часе прэс-канфэрэнцыі паведаміў старшыня Вышэйшага гаспадарчага суду Віктар Камянкоў (**на фота**). Паводле яго словаў, у 2004 г. было зарэгістравана 44 630 зваротаў суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасьці і дзяржаўных органаў у гаспадарчыя суды. Гэта на 10% болей, чым у 2003 г.

Агульная сума заяўленых да спагнаньня патрабаваньняў па ўсіх зваротах у гаспадарчыя суды склала 1 трлн 118 млрд руб., зь іх пастаноўлена да спагнаньня 739,6 млрд руб. (65%). Маёмасьці канфіскавана на 16,8 млрд руб. Дзяржаўная пошліна ў бюджэт за звароты ў гаспадарчыя суды, склала 20,8 млрд руб. Павелічэньне колькасьці справаў, якія разглядаюць гаспсуды, павялічвае нагрузку на судзьдзяў. У 2004 г. кожны зь іх штомесяц разглядаў ня менш за 40 справаў, а судзьдзі Менскага гаспадарчага суду — 71 справу.

СЬЦІСЛА

### Ворша супраць наркотыкаў

У Воршы створана грамадзкае аб'яднаньне «Маці супраць наркотыкаў». Яго галоўная задача — аказаньне псыхалягічнай і маральнай дапамогі нарказалежным людзям ды асьветніцкая дзейнасьць. Сёньня ў Воршы ў псыханэўралягічным дыспансэры стаяць на ўліку пад 450 падлеткаў векам 12—17 гадоў. 20-ці непаўналетнім пастаўлены дыягназ: алькагалізм ды таксыкаманія.

Расьце ў горадзе і колькасьць людзей, якія ўжываюць іншыя наркотыкі — апіяты, псыхастымулятары, прэпараты канапель. Спэцыялісты тлумачаць гэта паніжэньнем цэн на наркотыкі. Вядомыя выпадкі, калі вырабам і ўжываньнем наркотыкаў займаліся цэлыя сем'і. Штогод супрацоўнікі міліцыі рэгіструюць больш за сто правапарушэньняў, зьвязаных зь незаконным вырошчваньнем маку ды канопляў, назіраецца і рост злачыннасьці па лініі незаконнага абарачэньня наркотыкаў. Летась у Воршы такіх злачынстваў было зарэгістравана каля ста, у той час як у 1993 г. — толькі сем.

### Адно нованароджанае на восем вёсак

Нараджэньне дзіцяці шмат у якіх вёсках Аршаншчыны — рэдкая падзея. Летась у былым калгасе імя Чапаева нарадзілася адно дзіця, а памерла 14 чалавек. І гэта на восем вёсак з насельніцтвам пад 550 жыхароў. Праўда, большасьць зь іх — пэнсіянэры.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Помнік Раману Шацілу

У Сьветлагорску, у сквэры ля цэнтральнага пляцу, вырашылі ўсталяваць помнік Раману Шацілу — заснавальніку паселішча, на якім узьнік Сьветлагорск. Аўтар ідэі — дырэктар карціннай галерэі «Традыцыя», пісьменьнік Ізяслаў Катляроў. Скульптуру мае вырабіць мянчук Эдуард Астаф'еў, аўтар помніка Ф.Скарыну ў Празе. Астаф'еў, дарэчы, вырабіў пастаўлены ў цэнтры гораду памятны знак, на якім ёсьць і барэльеф Р.Шаціла. Такім чынам, Сьветлагорск можа стаць першым населеным пунктам, дзе будзе ўсталяваны помнік яго заснавальніку. Вядома, калі лічукі не паставяць коннага помніка Гедыміну раней.

Востраў Шаціліна згадваецца пад 1560 г.: паводле прывілею Жыгімонта Аўгуста, маёнтак, разьмешчаны над Бярэзінай, па сьмерці ўладальніка Рамана Шацілы быў падараваны мясцоваму шляхціцу Ждану Манкевічу (герб «Ліс»). Нашчадкі Манкевічаў жывуць у былых Шацілках — цяперашнім Сьветлагорску — і цяпер.

**Вадзім Болбас, Сьветлагорск**

### У Асіповічах вуліц пісьменьнікаў ня будзе

Асіповіцкая суполка ТБМ прапанавала надаць да ўгодкаў Перамогі некаторым вуліцам імёны пісьменьнікаў-франтавікоў — Шамякіна, Мележа, Быкава, Адамовіча. Прычым тэбээмаўцы не замахваліся на «сьвятарныя» назвы накшталт Савецкай, Ленінскай, Камуністычнай. Гаворка ішла пра вуліцы зь безаблічнымі назвамі — 60-годзьдзя Кастрычніка, Дружная, Юбілейная. Аднак выканкам, спаслаўшыся на брак грошай, адмовіў. Але тры гады таму зь вялікай урачыстасьцю перайменавалі адну з самых старых вуліц Школьную — там месьцілася першая школа. Яе назвалі ў гонар ураджэнца раёну сп.Каданчыка, які загінуў падчас вайны ў далёкай Расеі. Тады грошы знайшліся і на шыльды, і на замену штампаў у пашпартах жыхароў, і на ўнясеньне зьмен у мапы гораду. А неўладкаваную, пастаянна брудную, бязьлікую вуліцу Балотную перайменавалі ў гонар Янкі Купалы.

**Рыгор Латышэвіч, Асіповічы**

### Шляхам Рагвалода

Летась старшыня полацкага гарвыканкаму Уладзімер Тачыла ў складзе дэлегацыі вобласьці наведаў Швэцыю. Вынікам візыту зьявіўся праект супрацоўніцтва зь некалькімі партнэрамі ў справе турызму і экалёгіі, найперш са Швэдзкім міжнародным агенцтвам разьвіцьця ў галіне навукі, культуры, адукацыі. У красавіку ў Полацак прыедзе швэдзкая делегацыя, чальцы якой абмяркуюць праграму сэмінару, які адбудзецца ў горадзе ў траўні і на якім бакі абмяркуюць шляхі супрацоўніцтва. Полацкі мэр убачыў у Швэцыі шмат цікавага ня толькі ў гаспадарцы, але і ў сыстэме адукацыі. Напрыклад, ён пабачыў швэдзкія ўрокі гісторыі: кожнага году адзін дзень швэдзкія вучні жывуць жыцьцём вікінгаў — мелюць зерне ручнымі жорнамі, вучацца высякаць агонь з дапамогаю крэсіва, выпякаюць хлеб па старажытных рэцэптах. Падобны вопыт выхаваньня гісторыяй палачане вырашылі пераняць. Летам полацкія ўлады мяркуюць стварыць лягер-музэй пад адкрытым небам — у ім будзе з гістарычнай дакладнасьцю ўзноўлены быт крывічоў за часамі князя Рагвалода.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Пагарэлі праз анашу

Двое маладых гамельчукоў (абодвум па 19 гадоў) вырашылі заняцца друкарскай справай, а менавіта вырабам фальшывых асыгнацый. Спачатку нічога талковага ня выйшла, таму яны далучылі да справы сябрука, які цяміў у кампутарах. Далей заставалася толькі справа тэхнікі: кампутар, сканэр ды прынтэр. Вырашылі надта не рызыкаваць, пастанавіўшы «цісьнуць» 10-тысячныя купюры і пускаць іх у абарот, набываючы ў бабулек цыгарэты.

Спачатку ўсё ішло гладка, і нахабныя маладзёны пачалі раздаваць частку прадукцыі сябрам і знаёмым. Акурат апошнія (сярод іх быў нават прадавец анашы) і папаліся на спробах збыць несапраўдныя грошы. Сьледзтва досыць хутка выйшла на падробшчыкаў. Спачатку тыя адпіраліся і заяўлялі, што ня памятаюць, як фальшыўкі трапілі да іх у кішэні. Але ўрэшце раскалоліся. У маладзёнаў канфіскавалі аргтэхніку і частку неразрэзанага накладу «прадукцыі». Згодна з Крымінальным кодэксам, хлопцам пагражае ад 5 да 15 гадоў.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

# Аляксандар Канановіч: Я ведаю, у чым беларускі кайф

У Маскве думалі: прыехаў бедны студэнт зь Беларусі шукаць грошай. А высьветлілася, што бюджэт нашых дыплёмных работ у чатыры разы большы за іхні. Наша краіна — мэдыюм, і за гэта я яе люблю. **Аляксандар Канановіч** адказвае на пытаньні «НН».


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«НН»: Як так здарылася, Аляксандар, што Вы сталі кінарэжысэрам?**

**Аляксандар Канановіч:** Я вучыўся ў пэдагагічным унівэрсытэце — і мы хадзілі натоўпам да сябра, Славы Добіна, глядзець кіно. Глядзелі і глядзелі — а потым падумалі: рэжысэрам… прыкольна… А са мной на курсе вучыўся Амар Гайдук, сын дакумэнталіста Станіслава Гайдука. Ён і кажа: «А цяпер Пташук курс набірае…» Я пайшоў на падрыхтоўчы, паступіў потым… Чаму, што, як — кіно глядзелі.

**«НН»: І як да кінакамэдыі дайшлі?**

**АК:** Дзякуючы Пташуку. Ён нас дакладна скіраваў на жанравае кіно. Глядзеў, да чаго мы схільныя. Ад «таркоўшчыны» рукі адбіў адразу. Як ён казаў — «экран пакажа». Нават калі яшчэ толькі думаеш пра кіно, калі сцэнару няма, трэба помніць: будзе экран і будзе глядач у залі. Для гледача здымаць. Я трапіў пад раздачу камэдыі…

**«НН»: «Колер каханьня» — двайны дэбют: ваш і выпускніка расейскага Інстытуту кінэматаграфіі Аляксея Арсеньцева. Гэта зьвязана зь фінансаваньнем ад расейскага Інстытуту?**

**АК:** Была забаўная сытуацыя, калі я там быў. На мяне глядзелі, думаючы: вось прыехаў бедны студэнт зь Беларусі шукаць грошай. А высьветлілася, што бюджэт нашых дыплёмных работ большы за іхні.

У нас не рыхтавалі кінаапэратараў. Я спытаў у знаёмай дзяўчынкі, якая паступіла ў Інстытут кінэматаграфіі ў Расеі, пра кінаапэратараў-выпускнікоў. Папрасіў адабраць найлепшых. Найлепшым быў Аляксей. А паколькі ў расейскім Інстытуце бракавала апэратараў, а Аляксей зьехаў на мой фільм, тамтэйшым студэнтам давялося пабегаць, шукаючы апэратара для дыплёмных работ.

**«НН»: Ваш фільм — гэта нястрыманая эксцэнтрыка, рамантычная буфанада. А як наконт сацыяльных момантаў?**

**АК:** Хацелася дадаць у фільм «сацыялкі». Але ж… дваццаці хвілін вельмі мала. Калі б сорак хвілін ці хаця б паўгадзіны, каб растлумачыць, што адбываецца… Закладзена нешта яшчэ ў сцэне — глядач не рэагуе, хаця я ведаю, што павінен: проста не пасьпявае, таму што няма дадатковага часу для асэнсаваньня, высокая насычанасьць падзеямі. Дарэчы, у поўным сцэнары сацыяльны момант быў — адносіны Беларусі й Расеі. Мы вельмі моцна скандэнсавалі фільм.

**«НН»: І эксцэнтрыка…**

**АК:** Я не здымаю эксцэнтрыкі. Эксцэнтрыка — гэта гэгі, гэта Гайдай. Я не валодаю гэгамі. Наша эксцэнтрыка вымушаная — праз спрэсаваньне. Паглядзіце самі — у фільме амаль кожная сцэна пачынаецца зь дзеяньня. Гэта ненармальна: мусіць быць завязка, разьвіцьцё, кульмінацыя, разьвязка — а мы завязкі выкінулі. Калі б быў поўны мэтраж, то гэта была б трагікамэдыя. Гэта ж ня проста так — чалавек зялёны, блакітны, гэта ўсё вобразы.

**«НН»: А наколькі Вы абапіраліся на беларускія традыцыі, на клясычныя камэдыі «Хто сьмяецца апошнім», «Паўлінка»?**

**АК:** Гэта ж старыя творы, а цяпер пануе постмадэрнізм, зьмешваньне ўсяго з усім.

**«НН»: Як Вам працавалася зь Лявонам Вольскім?**

**АК:** Вельмі лёгка, нечакана лёгка. Яны прыходзілі на запіс — і ставілі мяне перад фактам той музыкі, якую яны граюць. А мы ўжо разьбіраліся, куды гэтую музыку ставіць. Зь Лявонам мы размаўлялі, куды гэта паставіць, — ён глядзеў матэрыял, казаў: так і так; прыходзіў да нас на мантажныя прагляды — я яму расказваў дзе, што, як. Мэта — выклікаць у гледача пэўны стан. Музыка, тэкст, відэа — усё павінна працаваць на гледача. І Лявон усё зрабіў на 300 адсоткаў.

**«НН»: Складваецца адчуваньне, што Вы бераце «клясычную» расейскую ідылію — і падрываеце яе знутры, «папартызанску», неўтаймоўнай беларускай эксцэнтрыкай…**

**АК:** Я б не сказаў, што гэта партызанскія моманты. Мы ж на скрыжаваньні Азіі і Эўропы.

**«НН»: Але ж мы ў Эўропе…**

**АК:** У любым выпадку на скрыжаваньні — за што я люблю краіну. Я жыву тут. Наша краіна — мэдыюм паміж Усходам і Захадам. І ў гэтым наш кайф.

**Гутарыў Андрэй Расінскі**

**АЛЯКСАНДАР КАНАНОВІЧ** (нар. у 1977 у Менску) — кінарэжысэр. Скончыў Пэдагагічны ўнівэрсытэт імя Максіма Танка, атрымаў адукацыю мастака-графіка. У 1999 г. паступіў у Беларускую Акадэмію мастацтваў на кінарэжысуру (майстэрня Міхаіла Пташукa). Праца А.Канановіча «Ідылія» (1999/2000) атрымала Дыплём фэстывалю Сьвятой Ганны, «Дон Пэдра» (2002) — дыплём за лепшую распрацоўку камэдыйнага жанру ў Берасьці. Камэдыя «Колер каханьня» — яго выпускная праца.

# Зьявіўся беларускі Кустурыца

Працяг са старонкі 2.

## Прыдумана Пташуком

«Колер каханьня» — гэта ўдалы дэбют дзьвюх кінашкол. Канановіч — рэжысэр, выгадаваны Акадэміяй мастацтваў. Апэратар Аляксей Арсеньцеў — выпускнік расейскага ВГІКу. Арсеньцеў — ня проста таленавіты апэратар. Прасьветленыя кадры насычаныя каляровай эксцэнтрыкай, кадры рухомыя, імпэтныя і трапяткія, як закаханае сэрца, — і кадры індыгава-цёмныя, забабонныя, са сьмешна-злавесным водблiскам вогнішча — усё гэта ня проста ягоныя творы. У апаратара сьвежы позірк — і ён раскрывае нам тое, да чаго наша вока ўжо прызвычаілася.

Беларускі горад быццам і ўключаны ў расейскую прастору, але й разломвае яе, ён своеасаблівы, і каляровая эксцэнтрыка падкрэсьлівае гэтую адметнасьць і асаблівасьць.

Сцэнар камэдыі прыдуманы Міхаілам Пташуком пры ўдзеле Аляксея Дударава паводле малавядомага апавяданьня Някрасава. Гісторыю адкапаў Пташук, і камэдыя «Колер каханьня» сталася яскраваю і насычанай беларускаю кветкай з вынаходлівай і трапнай стракатасьцю.

Так, жоўтую прэсу ў горадзе прадае гарласты хлопчык-мурынчык (крыкі па-беларуску), каларытная жонка-пэрсіянка ў бліскучым выкананьні Тацяны Жданавай дабівае мужа (і гледача) каронным фразай «А ў нас у Пэрсіі…», а легкадумны Леанард пнецца «культурна» размаўляць па-расейску. Гэты інтэрнацыянал вольна пачувае сябе на фальварку п'яўказаводчыка — і на гарадзкім бруку.

## Эксцэнтрыка гораду

З часу войнаў сярэдзіны XVII ст., якія зьнішчылі беларускую гарадзкую культуру, наша места не сьмяялася сваім голасам. «Гаварыць па-гарадзкому» значыла ня тое самае, што «гаварыць па-беларуску». Раней падобны нястрыманы й эксцэнтрычны бурлеск дазваляўся ў беларускай культуры толькі на вясковыя тэмы і зь селянінам-героем — тут вам і «Тарас на Парнасе», і «Лявоніха на арбіце». «Колер каханьня» цалкам адыходзіць ад камэдыйнага рэваншу вёскі. Тут ня пахне нават «сенам на асфальце». Гэта падкрэсьлена гарадзкая гісторыя.

Яна заснаваная на гарадзкім фальклёры, кроў і плоць якога — жоўтыя газэты, пагалоскі, плёткі, цыркавыя прадстаўленьні і крымінальны крадзеж дзявочых шапак, а дадатковы культурны фон — прычасаны панскі фальварак (праўда, захоплены «новым беларусам»-п'яўказаводчыкам).

Пляткаркі на ганку — не вясковыя бабы, а высокаадукаваныя пані, якія з годнасьцю вярзуць ахінею. Апэратар трапна скарыстаў старыя куточкі Менску: амаль непазнавальнае Траецкае, ратуша і Лошыца сталі ўдалай сыравінай для вобразаў мясьцін XIX ст. А вытанчаны фаэтон пазычылі ў Дудутках.

Са зьяўленьнем «Колеру каханьня» ў беларускай эксцэнтрыцы адбыўся капэрніканскі пераварот. Замест абавязковага лайна — жоўтая прэса, замест мудрага тутэйшага селяніна, «прыроднага», ад зямлі (і замкнёнага на гэтай зямлі!) — легкадумны дурань-авантурнік без каранёў і адкрытая да ўсяго гарадзкая шматкультурнасьць.

Эксцэнтрыка-рамантычная, нястрымная і апаламляльная, камэдыя Аляксандра Канановіча, паказаная на Дзень Сьвятога Валянціна, ёсьць сапраўднай сьмехавой бомбай. Шкада, што кароценькая, усяго 20 хвілінаў.

Хочацца глядзець яшчэ. І радавацца, што зьявілася ў нас такое кіно.

# Індэкс забароненых фільмаў

Кіно не для БТ: інструкцыя па карыстаньні

Анансаваны «НН» фільм «Горад Бога» быў у суботу зьняты з эфіру — як забаронены для распаўсюду ў Беларусі. Матывацыя: у карціне дэтальна паказаны працэс гатаваньня й спажываньня наркотыкаў. Між тым карціна была намінаваная на кінафэстывалях. Гэта не адзіны фільм, забаронены да паказу ў Беларусі.

Усяго ў сьпісе Рэспубліканскай экспэртнай камісіі па прадухіленьні распаўсюджваньня парнаграфіі (РЭК) 61 фільм: жахі, сацыяльныя драмы, крыху эротыкі. Трапіла туды і карціна «Гітлер. Узыходжаньне зла». «Мы не забараняем фільмы па палітычных матывах, — кажа Ніна Фральцова старшынька РЭК. — «Гітлера» не дапусьцілі да распаўсюджваньня ў Беларусі праз антысэмітызм, зь меркаваньняў паліткарэктнасьці».

Сьпіс РЭК няпоўны: дзяржрэгістар можа ня даць фільму ліцэнзію ці пазбавіць яе і без звароту ў камісію — як карціне Андрэя Кудзіненкі «Акупацыя. Містэрыі». Андрэй Расінскі прадстаўляе чытачам «НН» (найперш — бацькам) дзясятку самых забароненых фільмаў.

## «Гітлер. Узыходжаньне зла»

ЗША, 2003, рэж. Крысьціян Дугей.

**Пра што:** Гістарычная драма пра тое, як высьпявае зло. Гітлер Робэрта Карлайла — гэта паразыт, які выкарыстоўвае чалавечыя заганы, сілкуецца чалавечымі слабасьцямі, спажывае чужы жаль і каханьне — і лезе да ўлады. Мэханізмы таталітарнага зла настолькі відавочныя, а спосабы супрацьдзеяньня настолькі даступныя, што забарона карціны дзіўнай не падаецца.

**Каму глядзець, а каму не:** Усім кіраўнікам партый і «простым людзям», якія ўпэўнены, што ад іх нічога не залежыць. Фільм нельга глядзець высокім асобам, бо люстэркі ня кожнаму падабаюцца.

**Дзе знайсьці:** Карціна ў Беларусі распаўсюджвалася на DVD і CD. Пытайцеся ў прыватных гандляроў і ў Інтэрнэце.

## «Апраметная канібалаў»

Італія, 1980, рэж. Руджэра Дэадата.

## «Канібалы»

Італія, 1981, рэж. Умбэрта Ленцы.

**Пра што:** 80-я гады — росквіт клясычнага італьянскага «канібальскага» кіно. Карціна Руджэра Дэадата стылізавана пад дакумэнтальныя здымкі, калі антраполягі-дакумэнталісты зьвярэюць у кампаніі зь людажэрамі — а камэра здымае да апошняга моманту.

**Каму глядзець, а каму не:** Асобным фанатам жахаў. Катэгарычна забаронена дзецям, цяжарным і падчас абеду.

**Дзе знайсьці:** У 2001 г. фільмы выпусьціла расейская кампанія «Вікінг Відэа». Можаце паспрабаваць замовіць. «Апраметную канібалаў» можна скачаць з Інтэрнэту.



**Кадр зь фільму «Горад Бога», не паказанага па СТВ.**

## «Дабэрман»

Францыя, 1997, рэж. Ян Коўнэн.

**Пра што:** Яшчэ ў люльцы дзіцятку падарылі магнум. Хлопчык вырастае ў сапраўднага гангстэра-дабэрмана. Відэакліпна, нахабна, таленавіта, правакацыйна — хаця й крыху другасна што да Таранціна.

**Каму глядзець, а каму не:** Аматарам формы, якім лепей забыць пра зьмест. Міліцыянтам перад сутычкай з браткамі — і наадварот.

**Дзе знайсьці:** Распаўсюджвалася на відэа. Можаце пашукаць у прыватных калекцыях, у Інтэрнэце.

## «Дзеткі»

ЗША, 1995, рэж. Лары Кларк.

## «Садыст»

ЗША, 2001, рэж. Лары Кларк.

**Пра што:** Жорсткія сацыяльныя драмы пра падлеткаў.

**Каму глядзець, а каму не:** Аматарам кіно. Падлеткам — з папераджальным камэнтаром сэксоляга. Сытым чыноўнікам — каб жыцьцё навокал суцэльным шчасьцем не здавалася.

**Дзе знайсьці:** У Інтэрнэце. У Расеі карціны выходзілі на відэа і DVD.

## «Трамэо і Джульета»

ЗША, 1998, рэж. Лойд Каўфман.

**Пра што:** Шэкспір у найбрутальнейшым выкананьні: сучаснасьць, сэкс, кроў, жабрацтва — і найпаганейшы грым, што, як сьцьвярджае Каўфман, характэрна і для першых пастановак Шэкспіра.

«Прыз гледачоў» на фэстывалі «Raidance». Прыз «Найлепшы фільм» на міжнародным кінафэстывалі фэнтэзі і навуковай фантастыкі ў Рыме.

**Каму глядзець, а каму не:** Кінагурманам, аматарам Шэкспіра, сталым чытачам «Навінак». Астатнім не рэкамэндуецца.

**Дзе знайсьці:** Рарытэт. Паспрабуйце замовіць праз Інтэрнэт (кампанія «Кармэн-відэа», сэрыя «Другое кіно»).

## «Пакаленьне гульні «Doom»

ЗША, 1995, рэж. Грэг Аракі.

**Пра што:** Першы гетэрасэксуальны фільм Грэга Аракі, няўрымсьлівага авангардыста й гея. Да парачкі закаханых Эмі і Джордана далучаецца трэці — прыхаванае ўвасабленьне д'ябла. Злачынствы, адсечаная ванітуючая галава й найкашмарнейшы сэкс у фінале. За экстрэмальным сюжэтам хаваюцца боль і крык аб праклятым пакаленьні.

**Каму глядзець, а каму не:** Усім аматарам кіно, здольным вытрымаць. Катэгарычна нельга маладзейшым за 18 год.

**Дзе знайсьці:** Карціну выдавала расейская кампанія-дыстрыбутар «Екацярынбург-Арт».

## «Незваротнасьць»

Францыя, 2002, рэж. Гаспар Наэ.

**Пра што:** Алекс пасварылася са сваім хлопцам і сышла зь вечарынкі. У пустым пераходзе яе згвалтавалі. Хлопец Алекс і яе былы муж знаходзяць злачынцу — і забіваюць.

Карціна Гаспара Наэ ідзе ў адваротным накірунку — ад сцэны забойства праз дзевяціхвілінную й шокавую сцэну гвалтаваньня да ідыліі і шчасьця.

Намінацыя на «Залатую пальмавую галіну» Канскага кінафэстывалю.

Прыз за найлепшы фільм МКФ у Стакгольме.

**Каму глядзець, а каму не:** Аматарам кіно з моцнымі нэрвамі. Усім прыхільнікам Монікі Бэлючы і Вэнсана Касэля. Некаторым гледачам спатрэбілася мэдычная дапамога.

**Дзе знайсьці:** У Беларусі распаўсюджвалася на відэа, ёсьць і на CD.

## «Жывая мярцьвячына»

Новая Зэляндыя, 1992, рэж. Пітэр Джэксан.

**Пра што:** Клясыка постмадэрнісцкага gore («шкуматаньніка»). Сьвятар з прыёмамі кун-фу — супраць жывых мерцьвякоў, матуліны вушы ў супе, эсэсавец-вэтэрынар, газонакасілка для навязьлівых трупаў, кроў па калена — і шчасьлівае каханьне з пацалункам у фінале.

**Каму глядзець, а каму не:** усім аматарам кіно з пачуцьцём гумару. Нявестам у чаканьні прынца. Эсэсаўцам, немаўлятам і чыноўнікам з камітэтаў глядзець не пажадана.

**Дзе знайсьці:** Карціна прадавалася на DVD пад назваю «Мозг мёртвы». Маецца яна і на CD. Паглядзіце і ў Сеціве.

# Вільня — сталіца эўрапейскай культуры



ДЗЯНІС РАМАНЮК

**Эўрапарлямэнт абвясьціў Вільню сталіцай эўрапейскай культуры 2009 году. Сталіца эўрапейскай культуры — ганаровы тытул, які вандруе па Эўропе. Эўрапарлямэнт падтрымаў кандыдатуру Вільні. Зараз яна мае быць зацьверджана яшчэ на сустрэчы міністраў культуры краін ЭЗ. Ад 2007 г. вырашана званьне сталіцы эўракультуры надаваць двум гарадам (зь ліку краінаў — старых сяброў ЭЗ і новых). І ганаровае званьне, і выдзеленыя сродкі Вільні давядзецца дзяліць з аўстрыйскім Лінцам.**

# Ды 250 бясплатных пуцёвак

**Працяг са старонкі 6.**

Пісьменьнікі вырашылі змагацца — патрабаваць, каб ім вярнулі Дом літаратара цалкам. Валянцін Тарас адзначыў, што за сваю 70-гадовую гісторыю Саюз пісьменьнікаў Беларусі ня дзейнічаў толькі тры гады — падчас нямецкае акупацыі. Цяперашнюю сытуацыю, калі Саюз пісьменьнікаў фактычна ліквідуюць, Тарас параўнаў з часамі тае акупацыі.

З прапановы Ніла Гілевіча літаратары вырашылі прыняць зварот да беларускага народу з просьбай выступіць у абарону беларускай літаратуры й творчай суполкі, а таксама напісаць адпаведны зварот у ЮНЭСКО. Акрамя таго, маюць зьявіцца адпаведныя звароты да творчых саюзаў Беларусі, пісьменьніцкіх саюзаў іншых краін.

Гаворка пра лёсы Дому літаратара і «Ісьлачы» зараз пойдзе на сходзе Беллітфонду. Сябры Саюзу пісьменьнікаў уласна й складаюць Беллітфонд.

**Адам Воршыч**

## «Гэты рубеж здаваць нельга»

**Адам Мальдзіс**: Трэба апэляваць да таго, што Дом літаратара будаваўся пад апекай Пятра Машэрава, раз ужо мы працягваем найлепшыя традыцыі той улады. Калі зьнікне Саюз пісьменьнікаў, гэта будзе найперш удар па прэстыжы нашай краіны.

**Генадзь Бураўкін**: Ні на суд, ні на якія пагадненьні зь цяперашнімі ўласнікамі будынку спадзеваў няма. Калі будуць высяляць сілай… Сіла ёсьць сіла. Спадзяемся на тое, што добрыя людзі дапамогуць падтрымкай. Адзінае выйсьце: зварот да іншых творчых суполак Беларусі і замежжа, у тым ліку да Міжнароднага ПЭН-клюбу з просьбай пра падтрымку.

**Уладзімер Колас**, дырэктар Беларускага ліцэю:

Літаратары павінны самі вызначыцца, як яны хочуць бараніць свае правы, а мы ім абавязкова будзем дапамагаць. Павінен быць шырокі грамадзкі розгалас: трэба выкарыстаць усе СМІ, каб на абарону Дому літаратара прыйшлі ўсе, хто любіць беларускую літаратуру. І трэба супрацiўляцца выгнаньню — нават фізычна. Гэты рубеж нам здаваць нельга: літаратары павінны заставацца ў сваім будынку.

**Аляксандар Атрошчанкаў**, прэс-сакратар незарэгістраванага руху «Зубр»:

Адзіны дзейсны мэтад — публічны пратэст. Перамовы ня дзейнічаюць, бо гэта спроба гуляць у гульню, у якой адзін бок увесь час мяняе правілы.

# Эвалюцыя аднаго

Працяг са старонкі 2.

— 6 сакавіка камуністы, хутчэй за ўсё, выйграюць. Што будзе ў Кішынёве на наступны дзень? Няцяжка прадказаць. Флюіды аранжавай рэвалюцыі напэўна не абмінуць Малдовы, — кажа Аляксандар Іваноў, журналіст расейскай газэты «Коммерсантъ-плюс».

Камуністы бяруць пад увагу такі сцэнар і палохаюць пагрозай «вулічна-намэнклятурнага путчу». Цэнтрысты і правыя ўжо зарэзэрвавалі ў сталічнай мэрыі найважнейшыя гарадзкія плошчы, рыхтуючыся да перад- і паслявыбарных дэманстрацый. Лідэр камсамолу 24-гадовы Рыгор Пятрэнка называе гэта «жоўтым таталітарызмам». Жоўты — колер прыхільнікаў цэнтрысцкага блёку «Дэмакратычная Малдова», якім кіруе мэр Кішынёва Серафім Урэкяну, моцная фігура антыкамуністычнай апазыцыі. «Маднейшы» аранжавы колер зарэзэрвавалі хадэкі.

Каманда Вароніна робіць усё, каб выбары былі прызнаны легітымнымі. Прэзыдэнт запрашае некалькі тысяч замежных назіральнікаў — у пераліку на кожную акругу болей, чым было падчас апошняга туру ва Ўкраіне. Ён адмовіўся ад удзелу камуністаў у фармаваньні праграмы дзяржаўнага тэлебачаньня, каб пазьбегнуць абвінавачаньняў у маніпуляцыях. Праграма «Рэзананс», якая сымпатызуе Вароніну, была перанесена на прыватны канал «NIT». Улады выканалі нават пажаданьне хрысьціянскіх дэмакратаў і далі магчымасьць студэнтам галасаваць па-за месцам пражываньня.

## Бяз Сталіна на сьцягах

За сьпінай Марка Ткачука, пасьпяховага 37-гадовага антраполяга, найбліжэйшага дарадцы Вароніна, вісіць партрэт прэзыдэнта. Пад шклом на пісьмовым стале — сымбалі эўрапейскай антырасісцкай сеткі «UNITED for Intercultural Action».

На мяжы 1980-х і 1990-х гадоў Ткачук вучыўся ў Ленінградзе. Пісаў дысэртацыю «Археалёгія свабоды» і ўдзельнічаў у радыкальных арганізацыях, якія расхіставалі сыстэму. З тых часоў зь ім засталіся любоў да інтэлектуальных правакацый і прыхільнасьць да нефармальных моладзевых рухаў.

— Мы зьяўляемся левай партыяй новага тыпу, — запэўнівае ён. — Найбліжэй да нас стаяць хіба эўракамуністы (дэмакратычная, антыбрэжнеўская плынь у заходнеэўрапейскім камунізьме 1970-х гадоў. — **Рэд.**), а як вядома, эўракамунізм эвалюцыянаваў у бок сацыял-дэмакратыі.

Цяжка пазбавіцца ўражаньня, што Ткачук старанна вывучыў палітычную думку ідэоляга эўракамунізму Антоніё Грамшы, ідала сучасных эўрапейскіх левых. Як і Грамшы, падкрэсьлівае значэньне грамадзянскай супольнасьці і грамадзкай самаарганізацыі, хваліць сфармаванае ў 1990-я лібэральнае заканадаўства, што датычыць недзяржаўных арганізацый.

— У адрозьненьне ад расейскіх камуністаў на чале з Генадзем Зюганавым мы не кансэрватары, не прыхільнікі аўтарытарызму і не ксэнафобы. Ёсьць у нас ідыёты, як і ў любой партыі, але на нашых дэманстрацыях ніколі не зьяўляюцца партрэты Сталіна. Зюганаў паўтарае нацыяналістычныя слоганы Пуціна. У Расеі дамінуюць імпэрскія і аўтарытарныя тэндэнцыі, якія нам, левым, абсалютна чужыя.



**ЛІДЭР НАРОДНАГА ФРОНТУ Юры Рошка мае цьвёрдую падтрымку 10% выбарцаў.**

## Крамлю мы ўдзячны

Сапраўды, прэзыдэнт Малдовы адзіны сярод кіраўнікоў краін СНД не сьпяшаўся зь віншаваньнямі Віктару Януковічу. Нават болей, ён ня ўтойваў задавальненьня з нагоды наступнай перамогі Юшчанкі. Гэта толькі прыклад усё большых супярэчнасьцяў паміж Крамлём і малдаўскімі камуністамі.

— У 2001 годзе камуністы ішлі на выбары як прамаскоўская сіла, абяцалі ўступленьне ў саюз Беларусі і Расеі, наданьне расейскай мове статусу другой дзяржаўнай. Сёньня, аднак, для лідэраў партыі характэрная выразна антырасейская рыторыка, канфрантацыя з Прыднястроўем, арыентацыя на ўступленьне ў Эўрасаюз, — тлумачыць Дзьмітры Чубашэнка, рэдактар папулярнай расейскамоўнай газэты «Молдавские ведомости». Чубашэнка — рашучы праціўнік згаданай зьмены курсу. Хоць фармальна дактрынай кіроўнай партыі надалей застаецца марксізм-ленінізм, яе сапраўднай ідэалёгіяй робіцца прымітыўны малдаўскі нацыяналізм, скіраваны супраць Расеі і Румыніі.

Камэнтатар брытанскага штотыднёвіку «Эканаміст» пры канцы студзеня пісаў: «Чатыры гады таму малдаўскія камуністы выйгралі выбары, дэкляруючы прарасейскую палітыку. Цяпер яны клапоцяцца пра перавыбраньне, абяцаючы інтэграцыю з ЭС. Яны зьмянілі курс, бо нават яны не маглі вытрываць расейскай стратэгіі ўтрыманьня Малдовы ў стане слабасьці і падзелу».

Да першых важных учынкаў Вароніна, зробленых па атрыманьні ўлады ў 2001 годзе, належала падпісаньне дагавору аб дружбе з Расеяй. Аднак рэчаіснасьць хутка скарэктавала надзеі, што зьвязваліся з гэтым дакумэнтам. Малдаване скардзяцца на выключна высокія, напрыклад, у параўнаньні з Украінай, цэны на расейскі газ. Масква не сьпяшаецца з вывадам сваіх войскаў з самаабвешчанай Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі.

Цярплівасьць Вароніна ў дачыненьні да Расеі скончылася. На сьнежаньскай канфэрэнцыі АБСЭ ў Сафіі прадстаўнік Малдовы простым тэкстам абвінаваціў Расею ў антызаконнай акупацыі часткі малдаўскай дзяржавы.

— Эўрапейскі выбар Малдовы — самае значнае пазытыўнае рашэньне цяперашняга кіраўніцтва на чале з прэзыдэнтам Варонiным, — заявіла нядаўна Памэла Гайд Сьміт, колішняя амбасадарка ЗША ў Кішынёве.

Малдова падтрымлівае інтэнсіўныя палітычныя і гандлёвыя кантакты з Турцыяй, зь якой яе яднаюць гістарычныя і культурныя сувязі — цягам некалькіх стагодзьдзяў тэрыторыя Малдовы знаходзілася ў васальнай залежнасьці ад Асманскай імпэрыі. Пачалося збліжэньне і з праамэрыканскім Азэрбайджанам. Азэрбайджанцы будуць будаваць стратэгічна важны сучасны нафтатэрмінал на поўдні краіны.

Аркадзь Барбаросэ, дырэктар кішынёўскага Інстытуту грамадзкіх спраў, прадказвае паразу апазыцыі на сакавіцкіх выбарах, бо «камуністы забралі ўсе іх лёзунгі — эўрапейскай інтэграцыі, эканамічнай лібэралізацыі і г.д.».

## Праваронены сацыялізм

«Нас жывяць традыцыі эўрапейскага камуністычнага, сацыялістычнага і сацыял-дэмакратычнага руху», — гаворыцца ў праграмным дакумэнце, прынятым на апошнім зьезьдзе Партыі камуністаў Малдовы ўвосень 2004 году.

— Азначэньне «камуністычная» абцяжарвае нашай партыі кантакты з ідэалягічна роднаснымі асяродкамі на Захадзе, — прызнае Ткачук. — Мы прапануем добры каньяк у малапрываблівай бутэльцы. Аднак з маркетынгавых прычын мы ня можам мяняць назву партыі перад выбарамі. Потым падумаем…

Мае малдаўскія суразмоўнікі часта параўноўваюць эвалюцыю Вароніна са шляхам, які прайшоў Аляксандар Квасьнеўскі. На думку некаторых назіральнікаў, варта адрозьніваць каманду з Адміністрацыі прэзыдэнта Малдовы і партыйны апарат, дзе па-ранейшаму нямала палітыкаў цьвердалобых і карумпаваных.

У 1990-я гады татальны эканамічны заняпад і міжнацыянальныя канфлікты прывялі да таго, што ў грамадзтве зьявілася туга па ранейшых часах. Для многіх людзей распад СССР аказаўся сапраўднай трагедыяй — пераважна якраз і галасавалі за камуністаў.

У 1996 годзе Варонін балятаваўся ў прэзыдэнты. Набраў сьціплыя 10% галасоў. Аднак двума гадамі пазьней камуністы здабылі ўжо 30 працэнтаў, зрабіўшыся адной з найбуйнейшых парлямэнцкіх фракцый. Але яны паранейшаму, будучы палітычна ізаляванымі, заставаліся ў апазыцыі. У 2001 годзе з дапамогай галасоў правых камуністы адправілі ў адстаўку прэзыдэнта-цэнтрыста Пэтру Лучынскага. Чарговыя выбары прынесьлі камуністам сапраўдны трыюмф — да 50% галасоў не хапіла толькі пары дзясяткаў працэнта. Камуністы атрымалі перавагу ў новым парлямэнце, які выбраў Вароніна прэзыдэнтам.

## Хто ня любіць Вароніна?

— Партыя камуністаў Малдовы — гэта шмат у якіх адносінах партыя аднаго чалавека. Варонін збудаваў яе ад самых падвалінаў, — гаворыць шматгадовы дэпутат ад левацэнтрыстаў, якіх камуністы выцiснулі з парлямэнту.

Пра мінулае Вароніна вядома адносна няшмат. Нарадзіўся ён у сялянскай сям'і за некалькі дзён да нямецка-румынскага ўварваньня ў СССР, на тэрыторыі сёньняшняга Прыднястроўя.

Апазыцыйныя нацыяналісты ставяць яму ў загану немалую долю чужой крыві. Намесьнік кіраўніка Сацыял-лібэральнай партыі, паэт і старшыня Саюзу пісьменьнікаў Нікалае Дабія ў красавіку 2004 году напісаў у скандальным артыкуле, што дзеці зь мяшаных шлюбаў вызначаюцца «непазьбежнай схільнасьцю да псыхічных праблем, злачынстваў і прастытуцыі». У якасьці прыкладу ён прывёў уласна Вароніна. Усе паставіліся да артыкулу з абурэньнем, ахарактарызаваўшы дзён як ксэнафобскі і расісцкі. Дабія на паўгоду страціў членства ў партыі — у шэрагі сацыял-лібэралаў ён вярнуўся ў сьнежні мінулага году.

— На жаль, некаторыя з так званых цэнтрысцкіх палітычных сіл у Малдове ня маюць імунітэту да ксэнафобіі і этнічнага нацыяналізму, — камэнтуе Натальля Сінява.

Варонін атрымаў дыплём эканаміста і юрыста ў Акадэміі грамадзкіх навук пра ЦК КПСС. Перад распадам СССР пасьпеў некалькі месяцаў пабыць міністрам унутраных спраў Малдаўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

— Яго цяжка залічыць да партыйнай намэнклятуры высокага ўзроўню, — апануе Марк Ткачук. — Ён займаўся пяпяровай, тэхнічнай працай. Сапраўдная партыя намэнклятуры сядзіць у блёку «Дэмакратычная Малдова»!

Лідэра «Дэмакратычнай Малдовы» Серафіма Урэкяну празвалі «малдаўскім Януковічам», бо ён ня грэбуе дапамогай расейскіх паліттэхнолягаў, якія раней «засьвяціліся» на ўкраінскіх выбарах. Шматгадовы мэр сталіцы — палітык цьвёрды і ў той жа час эластычны. У процілегласьць Вароніну ён карыстаецца падтрымкай важкіх палітычных сіл у Расеі і Румыніі. Што цікава, яму ўдаецца падтрымліваць партнэрскія ўзаемаадносіны зь Ігарам Сьмірновым, аўтарытарным прэзыдэнтам непрызнанай Прыднястроўскай рэспублікі. Сьмірноў ненавідзіць Вароніна — у 1997 годзе ён яго нават на непрацаглы час арыштаваў, калі той браў удзел у нарадзе з прыднястроўскімі камуністамі, якія зьяўляюцца практычна адзінай апазыцыйнай сілай у гэтым рэгіёне.

На думку аглядальніка газэты «Время», што выдаецца ў Малдове, «крамлёўская адміністрацыя паставіла на Урэкяну. Наўзамен падтрымкі з боку Расеі ён меў бы ажыцьцявіць фэдэралізацыю краіны па формуле, прапанаванай Крамлём, і легітымізаваць расейскую вайсковую прысутнасьць у Малдове». Але афіцыйная праграма «Дэмакратычнай Малдовы» гаворыць пра ўнітарную дзяржаву і ўступленьне ў NATO.

## Кішынёў ста народаў

Малдова — адна з найбяднейшых краін у Эўропе, але апошнія гады прынесьлі эканамічнае ажыўленьне. У 2000 годзе сярэдняя зарплата складала 33 даляры, а пад канец мінулага году — амаль 100 даляраў. У пяць разоў

Чатыры гады таму малдаўскія камуністы выйгралі выбары, агітуючы за саюз з Расеяй. Але нават яны не маглі вытрываць расейскай стратэгіі ўтрыманьня краінаў СНД у стане слабасьці і падзелу.



10E.ORG

**ЗАМЕСТ ХОРУ ПІЯНЕРАЎ камуністычная Малдова прымусіла ўсю Эўропу слухаць свой дыска-поп-гурт «O-Zone».**



# камуніста

паднявіся пэнсіі, што забясьпечыла камуністам удзячнасьць іхнага «жалезнага» электарату. Бюджэт на 2005 год ужо зьведзены без дэфіцыту. Значна ўзрасьлі сродкі, якія выдаткоўваюцца дзяржавай на навуку і адукацыю, урад інтэнсіўна падтрымлівае газыфікацыю і пашырэньне іншых даброт цывілізацыі, такіх, як Інтэрнэт у вясковых школах.

— Гэта вынік, хутчэй, спрыяльнай каньюнктуры, чым здольнасьцяў камуністаў, але трэба прызнаць: яны ня робяць буйных памылак у эканоміцы, — прызнае крытычна настроены да ўлады член грамадзкай арганізацыі.

На пачатку свайго кіраваньня камуністы, згодна зь перадвыбарнымі абяцаньнямі, наважыліся ануляваць некалькі прыватызацыйных зьдзелак. Яны, аднак, не зьмянілі ў цэлым лібэральнага курсу, і ў апошнім рэйтынгу эканамічнай свабоды, укладзеным амэрыканскім фондам «Спадчына» («Heritage Foundation»), Малдова займае 77-е месца, апярэджваючы ўсе дзяржавы СНД, акрамя Армэніі, — у тым ліку Украіну (88-е месца) і Расею (124-е). Малдова апярэджвае таксама суседнюю Румынію, што неўзабаве ўступае ў Эўрасаюз (125-е месца). Такую ж высокую пазыцыю (78-мы радок) займае Малдова ў найноўшым рэйтынгу свабоды сродкаў масавай інфармацыі, укладзеным арганізацыяй «Рэпартэры бязь межаў», пакідаючы далёка ззаду ўсе краіны СНД (Украіна — 139-е месца, Расея — 140-е).

Аднак найбольшым выклікам для камуністаў былі міжнацыянальныя дачыненьні. На пачатку 1990-х гадоў канфлікт у Прыднястроўі забраў звыш тысячы ахвяр. Нацыяналісты ў той час імкнуліся да ўзьяднаньня з Румыніяй, а нацыянальныя меншасьці, што складаюць больш як адну трэць насельніцтва Малдовы, — украінцы, расейцы, гагаўзы, габрэі, баўгары — жылі памяцьцю пра злачынствы румынскай акупацыі падчас Другой сусьветнай вайны.

На старонках папулярных газэт, такіх як «Тара», «Флюкс» (выдаўцом апошняй зьяўляецца Юры Рошка), «Літэратура шы Арта», у 1990-я гады пачалі зьяўляцца артыкулы, у якіх рэабілітаваліся палітыка Іёна Антанэску, румынскага дыктатара і хаўрусьніка Гітлера.

Канон малдаўскай нацыянальнай гістарыяграфіі яшчэ не сфармаваны. З пачатку 1990-х гадоў у школах вывучаюць «гісторыю румынаў», курс якой утрымлівае элемэнты абяленьня Антанэску (камуністы абяцаюць правесьці рэформу падручнікаў, што выклікае моцнае супраціўленьне правых сіл).

У 1990 годзе ледзьве не за адзін дзень кірыліца ў малдаўскай мове была заменена лацінкай, у выніку чаго да сёньня застаецца прыметны працэнт «непісьменных», якія ня здолелі прыстасавацца да новай графікі. Дзяржаўным чыноўнікам прыйшлося здаваць іспыты на веданьне румынскай мовы, хоць да таго часу ім хапала

> У рэйтынгу эканамічнай свабоды кіраваная камуністамі Малдова займае 77-е месца, апярэджваючы ўсе дзяржавы СНД і Румынію. Такую ж высокую пазыцыю займае Малдова ў рэйтынгу свабоды СМІ, пакідаючы далёка ззаду ўсе краіны СНД.

расейскай. Шмат хто апынуўся на вуліцы. Крыўды тых гадоў засталіся жывыя, і папярэднія ўрады ня ўмелі іх пераадолець.

У 2001 годзе камуністы прынялі пастанову аб правах меншасьцяў, двума гадамі пазьней — «Канцэпцыю нацыянальнай палітыкі» і закон, які дапускаў двайное грамадзянства.

— Мы першая краіна ў гэтай частцы Эўропы, якая афіцыйна і з гордасьцю называе сябе шматнацыянальнай дзяржавай, — падкрэсьлівае Ткачук. — Менавіта ў гэтым сіла малдаўскае ідэнтычнасьці.

## Камуніст у манастыры

**Далучэньне краіны да Румыніі** — лёзунг, папулярны паўтара дзясятка год таму, — сёньня здаецца палітычнай фантазіяй, хоць правыя нацыяналісты ніколі ад яго не адмаўляліся. «Уніяністы» выступаюць з пастулятам існаваньня «дзьвюх румынскіх дзяржаў» (па аналёгіі з ФРГ і ГДР) з пэрспэктывай іх абяднаньня. Малдаўская мова і сапраўды амаль ідэнтычная румынскай, але каля паловы насельніцтва карыстаюцца ў штодзённым жыцьці расейскай мовай.

— Мы гаворым па-румынску, але думаем па-расейску, — кажа Міхай Гынку, музыка папулярнай фольк-рок-групы «Здоб шы здуб».

Камуністы заўжды былі апанэнтамі «ўніяністаў» і «франтыстаў», як тут называюць прыхільнікаў румынізацыі. Сёньня яны паварочваюцца ў бок нацыянальнай ідэалёгіі — так званага «малдавянізму». Яны падкрэсьліваюць своеасаблівасьць малдаўскага нацыянальнага самаўсьведамленьня і шматнацыянальны характар дзяржавы.



WWW.VREMEA.NET

**МАЛДАЎСКІ ЯНУКОВІЧ. Так прзвалі мэра Кішынёва і лідэра «Дэмакратычнай Малдовы» Серафіма Ўрэкяну, бо ён ня грэбуе дапамогай расейскіх паліттэхнолягаў, якія раней «засьвяціліся» на ўкраінскіх выбарах.**



WWW.NATO.INT

**УЛАДЗІМЕР ВАРОНІН, як і Саакашвілі, не павіншаваў Віктара Януковіча. Нават болей, ён ня ўтойваў задавальненьня з нагоды наступнай перамогі Юшчанкі.**

Памэла Гайд Сьміт кажа:

— Мяркую, што ўсе малдаўскія грамадзяне павінны зрабіць намаганьне, каб усьвядоміць самі сябе як малдаван. Інакш пагражае этнічны сэпаратызм і міжнацыянальная варожасьць.

Галоўным сымбалем традыцый малдаўскай дзяржаўнасьці зьяўляецца князь Стэфан Вялікі, які ў XV стагодзьдзі абараняў эўрапейскае хрысьціянства ў шматлікіх войнах з Турцыяй. Летась Варонін суправаджаў здымачную групу, якая займалася стварэньнем дакумэнтальнага фільму пра Стэфана. Ён наведаў грэцкія праваслаўныя манастыры, якія заснаваў ці падтрымліваў Стэфан, у тым ліку сьвятую гару Афон.

— І як Варонін упісаўся ў гэтую экспэдыцыю? Ён камуніст, а тут — праваслаўе, — сьмяецца Аляксандар Бур'ян, кіраўнік фонду культурных ініцыятыў «Сьвет як люстэрка для Малдовы». — Але ж неяк упісаўся. Важна, каб людзі адчулі гонар за гісторыю ўласнай краіны і не лічылі яе гісторыяй правіцы.

— Чатыры гады таму камуністы прыйшлі да ўлады, абапіраючыся на Леніна і яго адзіна слушнае вучэньне. Цяпер, памяняўшы арыентацыю, яны актыўна выкарыстоўваюць перад выбарамі імя Стэфана Вялікага, патрыятызм і праваслаўе, — пакепвае Аляксандар Ціханаў, публіцыст «Камэрсанта-плюс».

Згаданы фільм адлюстраваў Стэфана як пачынальніка эўрапейскай інтэграцыі.

— Менавіта палітыка нацыянальнага самаўсьведамленьня, якая суцішыла міжэтнічныя канфлікты, зьяўляецца прычынай таго, што, шчыра кажучы, сёньня я ня бачу добрай альтэрнатывы камуністам, — кажа супрацоўнік аднаго з заходніх пасольстваў.

> На сьцягах малдаўскіх камсамольцаў ніводнага Леніна, але ёсьць і Чэ Гевара, і Сьвяты Юры, адзін з заступнікаў малдаўскай дзяржаўнасьці. Лёзунгі — «Сэрца ў мяне зьлева», «Малдова Victoria».

## Камсамольскі рок-н-рол

Атмасфэра на канцэрце нагадвае кіеўскі Майдан. На сцэне — тутэйшыя рок-зоркі і палітыкі ў характэрных чырвоных шаліках. Каля сцэны — дзясяткі расьцяжак з палітычнымі лёзунгамі і разгарачаная моладзь — таксама ў чырвоных шаліках.

Арганізатар канцэрту — такі нахвалены Ткачуком «камсамол новага тыпу». Канцэрт мае стопрацэнтна рокавы характар. На наступны дзень хадэкі арганізуюць у цэнтры гораду папсовадыскатэчную імпрэзу.

На сьцягах камсамольцаў — літаральна постмадэрнісцкая сумесь сымбаляў. Не відаць ніводнага Леніна, але ёсьць і Чэ Гевара, і Сьвяты Юры, адзін з заступнікаў малдаўскай дзяржаўнасьці. Лёзунгі — «Сэрца ў мяне зьлева», «Малдова Victoria». Сапраўдны шок выклікае новы перадвыбарны лягатып, які паўсюль прысутнічае на шаліках і гіганцкіх транспарантах, — эўрапейскія зорачкі суседзяць зь сярпом і молатам.

— Наперад, камсамол! — гукае вакаліст гурту «Цімур і яго каманда» з паўночнамалдаўскага гораду Бэлць. Сярод фанатаў усеагульнай прыхільнасьцю карыстаецца прыпеў песьні «Галоднаму даць хлеба». Потым іграе супэрпапулярная тут група «Ўтопія», якая прадстаўляе ў тым ліку панкўэрсію кампазыцыі малдаўскай групы «O-Zone», што заваявала слухачоў у Румыніі, а пасьля і ва ўсёй Эўропе.

У нейкі момант на сцэну выходзіць сам прэзыдэнт. Бяз гальштука, у куртцы. «Варонін! Варонін!» — скандуе грамадзкасьць. Прэзыдэнт атрымлівае чырвоны шалік і прамаўляе пра моладзь як будучыню народу і пра эўрапейскую інтэграцыю. Падчас выступу «Ўтопіі» ён сьціпла садзіцца ўбаку і раздае аўтографы. Відаць, што з часоў украінскай рэвалюцыі ва Ўсходняй Эўропе запанаваў зусім новы стыль палітычнай агітацыі.

**Паводле «Газэты выборчай»**

# 1990-я працягваюцца

18 лютага ў клюбе «Рэактар» гледачоў груба выхоплівалі з натоўпу пры спробе разгарнуць бел-чырвона-белыя сьцягі ці неяк выявіць сваю прысутнасьць. Праўда, танчыць дазвалялася. А было пад што: «IQ-48», «Indiga» і «Zet» прэзэнтавалі свае альбомы. Добра, што канцэрт увогуле адбыўся. Арганізатары ўлагодзілі кіраўніцтва клюбу толькі перназваўшы акцыю з «Дня аранжавага дрэва» ў «Дзень дрэва зялёнага».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Канцэрт быў прэзэнтацыяй новых альбомаў «IQ-48», «Indiga» і «Zet». Але адкрылі яго дзьве надзеі беларускага року — «Зьмяя» і «Тарпач». Абедзьве граюць жорсткую музыку і маюць жаночы вакал, аднак «Тарпач» пакуль куды цікавейшы: грае больш зладжана і ня проста рыфмуе беларускія словы з дапамогай слоўніка. «Радыяцыя» — бадай што самы моцны твор, напісаны айчыннымі музыкамі на гэтую тэму. Група ведае, куды рушыць. «Зьмяя» ж вагаецца паміж цяжкім фолькам і хард-рокам.

«IQ-48» прагрэсуюць. Праўда, трэба вучыцца нашым музыкам размаўляць з публікай. Разынка ўсёй праграмы — «Выйсьце» з Памідоравым: песьня прабівае сваёй энэргетыкай ня менш, чым «Разам нас багата». У запасе быў яшчэ адзін гвозд: «Кумбу» рэпэры засьпявалі з Вольскім — нечаканы і прыемны падарунак гледачам.

«Indiga» выйшла ў саколках «Слухаю Русю», якія прэзэнтавалі гурту прыхільнікі. Нядаўна ў групы зьявіўся фан-клюб (з айчынных гуртоў пахваліцца гэтым мала хто можа), які і ладзіць розныя акцыі ў падтрымку сваіх улюбёнцаў. Пры захаваньні такой імпэтнасьці Руся можа стацца сапраўднай рок-князёўнай, хоць тытуламі музыкаў ужо другі год не надзяляюць.

Закрывала вечар група «Zet» — самы радыкальны праект на беларускай рок-сцэне. Удала падабраны імідж, бескампрамісная падача матэрыялу робяць іх улюбёнцамі маладых. Шкада, што група зьяўляецца з канцэртамі вельмі рэдка, хоць праект мае посьпех. «Zet» з кожным годам набывае актуальнасьці, і цяпер залаты час для творчасьці ў масках.

Канцэрт няўлоўна нагадваў музычна-палітычныя акцыі сярэдзіны 1990-х. Тым больш што ахоўнікі паводзілі сябе ў дачыненьні да гледачоў нахабна. Рыхтык як гэта бывала 10 гадоў таму.

**СБ**

# «Крамбамбуля» ў краіне свабоды

«Крамбамбуля» вярнулася з турнэ па Ўкраіне ў гуморы, хоць усе ўдзельнікі праекту прыхварэлі, а прадусарка Ганна Вольская нават падхапіла ангіну. Новыя ўражаньні і знаёмствы, канцэрты ў культавых і экзатычных клюбах, этэры на радыё- і тэлеканалах — усё гэта дае нагоду музыкам цешыцца і працаваць далей: кола прыхільнікаў «крамбамбульных» сьпеваў расьце і пачынае ахопліваць суседнія краіны.

Знайшліся прыхільнікі творчасьці Вольскага і на мяжы. І беларускія, і украінскія мытнікі прасілі ў яго альбом «Крамбамбулі». Нашы задавольваліся касэтамі, а украінцы — толькі CD. «Добра, калі б прасілі, а то ж яны патрабуюць — а іначай, маўляў, будзеце тры гадзіны ў чарзе стаяць!» — кажа Лявон Вольскі.

Калі музыкі вярталіся назад, дык на ўкраінскай мяжы прыкінуліся Сашам і Сірожам з групай акампанэмэнту: гэтыя пэрсанажы там ледзьве не нацыянальныя героі — часопіс «FHM» прызнаў «Новыя калыханкі» тэлеперадачай году ва Ўкраіне. Памежнікі далі веры і прапусьцілі без чаргі.

10 лютага Вольскі і К° гулялі па Храшчаціку, пілі піва ў барах і захапляліся сьвяточнай кіеўскай аўрай. Увечары ў іх быў канцэрт у культавым арт-клюбе «44», дзе часьцяком іграюць вядомыя ўкраінскія каманды. Адна з арганізатараў кіеўскага турнэ Алёна Скарабагатая кажа, што ажыятажу яны нарабілі — на канцэрт зьехаліся прадстаўнікі буйных тэлеканалаў («Інтэр», «М1»), дырэктар кампаніі «Лавіна-рэкардс», які выдае альбомы Скрыпкі і Вакарчука, дый Вакарчук зь вялікай цікавасьцю назіраў за выступам «Крамбамбулі». За гэта Вольскі падараваў лідэру «Акіяну Эльзы» дыск. Пры канцы канцэрту беларусы паджэмавалі з шатляндзкім дударом.

Назаўтра «Крамбамбуля» грала ў Днепрадзяржынску. У клюбе «Торба» быў аншляг. Але Вольскаму прамысловы горад, радзіма Брэжнева, запомніўся гатэлем, дзе было толькі шэсьць градусаў цяпла. Грэліся, бегаючы адзін за адным па гатэльных калідорах у «ZETаўскіх» масках.

Вольскі «пакаціў» у Данецку, хоць і ня зьняў на канцэрце ў клюбе «Gung'ю» аранжавы шалік. На канцэрт патрапіў мясцовы скінхед: абурыўся, пачуўшы «азіяцкі» блёк, але потым нічога, упадабаў і набыў чатырнаццаць дыскаў «Радыё «Крамбамбуля» — для сябе і сяброў.


**СТРАШНАЯ СІЛА МАСТАЦТВА. Гюнэш Абасава здолела зачараваць нават кіеўскага скінхеда.**

Мясцовыя арганізатары рэклямавалі «Крамбамбулю» як маглі, некаторыя перабіралі меру, называючы групу ў афішах і анонсах «беларускім «Ленінградам» і «сольным праектам салістаў «Ляпіса Трубяцкога». Аднак анікія рэклямныя фішкі не дапамаглі сабраць залю ў Харкаве. На канцэрт у «Чэрчыль-пабе» набылі толькі 12 квіткоў. «Раз на канцэрт «NRM» у Маладэчне прыйшлі два чалавекі. Звычайнае выпрабаваньне для музыкі», — бяз роспачы кажа Вольскі. Сыгралі і ў Харкаве, пацешыўшы герояў-мэляманаў, што не збаяліся 18-градуснага марозу. Скончылася турнэ зноў канцэртам у Кіеве.

Беларуска-ўкраінская песьня «Суседзі» ў Кіеве прайшла незаўважанай, затое ў Данецку яе прынялі на «ўра». Упадабалі ўкраінцы «азэрбайджанскі» блёк у выкананьні Гюнэш Абасавай (адзін бізнэсовец набыў ёй шыкоўны букет кветак пасьля выканьня «Расстаньня»), сярод «гарачых» гітоў найбольш запалялі ўкраінскіх гледачоў «Мама дарагая» і «Госьці». Ад украінскай публікі Вольскі ў захапленьні: «Жвавасьць і надзвычай эмацыйнае і жывое ўспрыманьне ўкраінцамі нашых песень (і ня толькі песень. — **СБ**) можна растлумачыць іншай ступеньню свабоды, якая разьвілася ў іх за апошнія дзесяць год, нягледзячы на млявую кучмаўскую манархію».

**Сяргей Будкін**

# Празнасьць

ТЭДА ЛІ

Скончылася несапраўдная зіма, падобная да восені, якая ў гэтым годзе таксама была несапраўдная. Прыйшла зіма сапраўдная і нанесла надзей на тое, што жыцьцё наша напаўштучнае таксама «пасапраўднее». Мы перажылі чужыя аранжавыя перамогі і чужыя трагедыі, учыненыя разьюшанай маткай-прыродай. «Мірныя людзі», як заўсёды, бязьдзейсныя і задаволеныя сваёй абароненасьцю, расейскамоўныя, тутэйшыя і «празныя-празныя».

У нас няма слова «празнасьць», у нас не павінна быць і «празьнікаў», у якіх не засталося нічога па-сьвяточнаму сьвятога. «Празнасьць» — гэта чужая лексычная адзінка і чужая мэнтальная якасьць. «Празнасьць» — гэта самы пачатак, але ўжо пачатак цемнаты і жывёльнасьці. «Празнасьць» да непазнавальнасьці перакошвае твары тваіх менскіх аднагодкаў, калі пачынаеш сьпяваць песьні на тваёй мове (якую яны абзываюць проста «мовай») у іх бадзёрай кампаніі. «Празнасьць» палохае, прымушае выпускаць кіпцюры і насупліваць бровы, прымушае сварыцца з «празнымі» і паказваць сваю нікому не патрэбную неабыякавасьць. «Празнасьць» — гэта калі няма за каго і за што змагацца, няма каго берагчы і што цаніць, гэта калі няма нічога, апроч жаданьня працаваць «на офісе», неістотна чым, няважна для чаго і на каго. «Празнасьць» — гэта значыць, што нічога вышэйшага за быт і адзінае сёньняшняе вымярэньне не засталося. «Празнасьць» — гэта сыгнал SOS, гэта значыць, што ў дзень, калі сьпяюць нам званы пра народнае абуджэньне, абуджацца ня будзе каму.

«Празнасьць» — гэта новы стыль жыцьця беларускае моладзі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**НАВАТ МУЗЫКІ ДЗЬВЕ. У часы панаваньня грамадзянска-пасіўнага стылю жыцьця музыку для грамадзянска-актыўных трэба шукаць на клюбных канцэртах і ў альтэрнатыўных распаўсюднікаў. На фота: рок-гурт «Zet» на канцэрце 18 лютага.**

## Паляваньне на празных людзей

Аднойчы ўвечары, апрануўшы чорны плашч змагара за нацыянальнае вызваленьне і бел-чырвона-белую шапку Санта-Клаўса-патрыёта, я пайшла адлоўліваць гэты новы тып моладзі дзеля бліжэйшага знаёмства. Вызначыўшыся зь месцам і часам лову (усялякія палілкі, падваконьні і цёмныя куты ўнівэрсытэтаў ды папросту месцы «кучкаваньня»), я вырашыла ў іх пытацца пра Адама Міцкевіча (таму што ён здаваўся добра вядомым, дый тут магчыма польска-беларуская блытанка), пра самае чаканае сьвята, пра ўсё моднае і пра іх саміх, «празных» людзей.

## Неабцяжаранасьць

«Адам Міцкевіч — беларускі нейкі дзеяч, здаецца, паэт, усімі праўдамі і няпраўдамі змагаўся за нацыяналізацыю», — кажа мне белавалосы хлопец і ня можа ўспомніць ніводнага твору гэтага «змагара». Неаспрэчная большасьць астатніх апытаных таксама перакананыя ў тым, што Міцкевіч — беларускі пісьменьнік, зрэдку кажуць — польска-беларускі. «Пачакайце, Якуб Колас? А гэта ня тое ж, што й Адам Міцкевіч?» Нарадзіўся і жыў у Польшчы, а вось пісаў па-беларуску. (Відавочна, тады гэта было вельмі выгадна…) Але бывала, што і па-расейску пісаў. Вельмі добрыя, аднак, яго творы, пераважна пра сялян: «Сон на кургане», «Тадэвуш Касьцюшка», «Песьня пра зубра» і фіг яго ведае, што яшчэ… «Satisfaction» — таксама ягоны?

Напружвацца мы ня любім. А любім «празнаваць, канешна». І найлепшы празьнік — Новы год. Таму што народ вывальвае на вуліцы, і паўсюль музыка гучыць, і пэтарды можна за каўнер закідваць, і так смачна-смачна ў горадзе пахне порахам, а дома сталы ломяцца, і можна жэрці і жэрці, каб думаць ня трэба было… Новы год «празныя» людзі не плянуюць. А нашто, калі і так прапаноў заўсёды шмат, часам ужо «ёсьць добрая кватэрка — прыходзьце да нас», а часам ёсьць даўно знаёмая мадэль: «пайсьці ў горад зь сябрамі — надрацца — не вярнуцца дадому». Пры апошнім раскладзе плянаваць проста няма сэнсу. Зрэшты, гэтыя варыянты найчасьцей выкарыстоўваюцца і дзеля ўсіх астатніх нагод.

Страшна модна цяпер, на думку хлопчыка з забаўнай усьмешкай, «весела бавіць час». Сядзець сабе дома, сядзець, а потым рэзка заскочыць на дыскатэку. Фанацець за «Дынама-Менск». Яго калегі па ўнівэры вырашылі, што модныя чорны колер, «каўбасьня», японскае анімэ, зручныя рэчы, модна жыць дзеля ўласнай асалоды, піць «Банакву» бяз газаў, не паліць, не ўжываць алькаголю, роўна ж як і паліць ды напівацца, быць «у курсе дзела», атрымлівань адукацыю, раз на два тыдні хадзіць у рэстаран, адпачываць. Я заўважыла, што з моднага лексыкону «празнай» менскай публікі пакрысе сыходзіць унівэрсальнае «абшчацца» на карысьць яшчэ менш акрэсьленага дзеяслова «адыхаць».

> «Празнасьць» — гэта калі няма за каго і за што змагацца, няма каго берагчы і што цаніць, гэта калі няма нічога, апроч жаданьня працаваць «на офісе», неістотна чым, няважна для чаго і на каго.

Паняцьце творчай/нятворчай асобы некаторых «празных» вельмі напружыла: «Творчы — значыць, ён творыць… А што ён творыць? Дзяцей, можа? Не, я спартовы чалавек, а ня творчы». Пытаньне пра ўласную незвычайнасьць і прагу творчасьці падзяліла маіх суразмоўцаў на тры каманды. У першай былі «вельмі супэр асобы», якія гуляюць у КВК і ўмеюць імправізаваць. Яны прызналіся ў сваёй «зоркавай хваробе», у сваёй «рэальнасьці» і «крутасьці», ад якой нікуды не ўцячы.

У другую каманду трапілі тыя, у каго незвычайнасьць асацыюецца з уменьнем вязаць шапку, прыдумляць сьмешныя вершыкі пра сябровак і пісаць артыкулы для музычнага агляду нейкай (так і не названай) газэты. Гэтыя людзі лічаць сябе вельмі асаблівымі.

Астатнія апытаныя паведамілі, што яны зьяўляюцца дастаткова звычайнымі, шэрымі, пасрэднымі людзьмі, простымі і прадказальнымі. Прамоўлена гэта было так, што ім бязь цяжкасьцяў паверылася.

## Стылёвы склероз

«Празны» стыль жыцьця ў тым, каб усё забываць. «Празныя» ня кпяць зь беларускай мовы — яны яе ня чуюць. Калі размаўляеш зь імі, яны нават не мяняюць выразу твару і, адказваючы па-расейску, не акцэнтуюць на гэтым увагі: у іх няма ніякага жаданьня паважаць цябе, роўна ж як і абражаць. Іх не хвалюе краіна, а ўсё беларускае здаецца нейкім «нязьдзешнім», нават чужым. Усе дарогі вядуць у Маскву, бо там больш людзей і лягчэй згубіцца ў натоўпе, а яшчэ адтуль лягчэй трапіць на экран тэлевізара і пазнаёміцца з Максімам Галкіным. У Маскве заўсёды знойдзецца праца. Напрыклад, на будоўлі, каб выбраляць новыя аб'екты падрыву (пра апошняе думаць стала нямодна). А яшчэ калі вельмі пашанцуе, то можна як-небудзь там і застацца. Пайшлі, ніколі ўжо ня вернемся, Радзіма…

## Вынішчэньне празнасьці

Калі глядзіш на гэты новы энэргічны стыль існаваньня, энэргія якога ня мае вэктару, няма адчуваньня, што на вачах у цябе падымаецца зь нізін сакаліна сям'я. Хутчэй, вырастае новае магутнае, цьвердалобае насельніцтва, якога пакрысе пачынаеш пабойвацца.

Можна дастаць кулямёт і ўсіх расстраляць… Каб не няславілі слаўную славу продкаў. Жорсткая ўтопія.

Або адразу ўсіх саслаць туды, куды ім хочацца. Таксама ўтопія.

Рэальна — гэта перастаць быць «мірнымі людзьмі». Раздушыць «празнасьць» у барацьбе. Паставіць усіх перад выбарам. Каб ва ўсіх калісьці «празных» зьявілася свая пазыцыя, сваё меркаваньне і агульныя найвышэйшыя каштоўнасьці. Вайну аб'явіць, ці што?..

# Час спускацца зь вяршыняў, або Ці бачны Менск з Браціславы?

Лёс эўрапейскіх народаў больш не вырашаецца, як было ў мінулым стагодзьдзі, падчас сустрэч лідэраў вялікіх дзяржаваў. Чакаць, што для Беларусі нешта зьменіцца ў выніку «саміту» ў Браціславе, значыць займацца самападманам, піша **Віталь Тарас**.



Паводле першага свайго значэньня слова «summit» у ангельскай мове азначае «вяршыня». Некалі за савецкім часам сустрэчы паміж кіраўнікамі ЗША і СССР сапраўды выглядалі найважнейшымі, «вяршыннымі» падзеямі ў міжнароднай палітыцы. Праўда, далёка не заўсёды сустрэчы ў вярхах прыводзілі да «разрадкі» — як у выпадку з Брэжневым і Ніксанам. Сустрэча Хрушчова з Кенэдзі, напрыклад, адбылася незадоўга да Карыбскага крызісу 1962 году, які ледзьве ня скончыўся сусьветнай ядзернай вайной! А сустрэча Брэжнева з Картэрам у Вене пры канцы 1970-х гадоў толькі абвастрыла супярэчнасьці паміж дзьвюма ядзернымі звышдзяржавамі. Вяршыняй тых супярэчнасьцяў — асабліва што да погляду на правы чалавека і сувэрэнітэт суседніх з Савецкім Саюзам краін — сталася ўварваньне савецкіх войскаў у Аўганістан.

Былі, так бы мовіць, прамежкавыя саміты, якія запомніліся, хутчэй, анэкдатычнымі падрабязнасьцямі, чымся вынікам. Напрыклад, ад сустрэчы ва Ўладзівастоку ў Джэралда Форда, які на кароткі час зрабіўся прэзыдэнтам ЗША пасьля сыходу Рычарда Ніксана, засталося хіба толькі воўчае футра, якое таму падараваў са свайго пляча савецкі генсек.

Сустрэчы Гарбачова з Рэйганам, якія напачатку здаваліся сэнсацыяй (і сапраўды былі такой сэнсацыяй, улічваючы пагадненьне пра абмежаваньне стратэгічных узбраеньняў), вельмі хутка сталі ўспрымацца як свайго роду турыстычныя паездкі лідэраў дзьвюх дзяржаў. Яшчэ больш гэтае адчуваньне ўзмацнілася ў постсавецкую эпоху. Сустрэчы Ельцына з Бушам-старэйшым і Клінтанам адбываліся найчасьцей у рамках так званай «вялікай васьмёркі» (сямёрка найбольш разьвітых краін Захаду плюс Расея), падчас якіх расейскі прэзыдэнт рабіў сваім партнэрам розныя больш ці менш экзатычныя падарункі. Пры гэтым расейскі лідэр любіў пры выпадку ці без усялякай нагоды паўтараць «Мой сябар Джордж» ці «Мой сябар Біл».

Пра сустрэчы цяперашняга прэзыдэнта Расеі з Джорджам Бушам-малодшым, хоць гэтыя «саміты» належаць да самае, так бы мовіць, найноўшае гісторыі, увогуле цяжка нешта прыгадаць. Гэта ўжо хутчэй задача для гісторыкаў, адмыслоўцаў у дыпляматычным пратаколе ці іншых спэцыялістаў вузкага профілю. Строга кажучы, гэтыя сустрэчы наагул цяжка назваць самітамі. Бо нікому з заходніх журналістаў ня прыйдзе да галавы назваць так, скажам, сустрэчу прэзыдэнта ЗША з прэм'ер-міністрам Нідэрляндаў, дагнаць якія па аб'ёме валавога ўнутранага прадукту імкнецца Расея, альбо з султанам Брунэю, які таксама мае вялікія запасы нафты.

Паміж іншага, звычайным амэрыканцам, якія традыцыйна кепска разьбіраюцца ў геаграфіі, асабліва эўрапейскай, даволі цяжка адрозьніць былую югаслаўскую рэспубліку Славенію, дзе адбылася мінулая сустрэча Пуціна з Бушам, і Славакію, якая ўваходзіла ў склад ЧССР. Цікава, што для чэхаў розьніца ў напісаньні назваў гэтых дзьвюх краін увогуле заключаецца ў адной літары: Slovinsko і Slovensko.

Зразумела, для расейскіх палітолягаў і журналістаў — прынамсі тых, хто больш-менш разьбіраецца ў палітычнай геаграфіі, — розьніца відавочная. Славаччына непасрэдна мяжуе з Украінай, якая яшчэ нядаўна, паводле негалоснай клясыфікацыі Крамля, уваходзіла ў блізкае замежжа (чытай, лічылася сатэлітам Масквы). Сацыялістычная Чэхаславакія, у адрозьненьне ад СФРЮ на чале зь непадкантрольным Крамлю Ёсіпам Цітам, таксама некалі была савецкім сатэлітам. Што Масква недвухсэнсоўна давяла ўсяму сьвету ў 1968-м годзе, калі ўвяла танкі ў Прагу. Браціслава, дарэчы, насуперак легендам, тады таксама пратэставала супраць савецкай інтэрвэнцыі. Іншая рэч, што славацкая вёска (як, зрэшты, і чэская) засталася ў цэлым абыякавая да ўводу «братніх войскаў» у краіну. Акрамя таго, славакі, якія зазналі дыскрымінацыю з боку Прагі, традыцыйна больш прыхільна ставіліся й ставяцца да расейцаў.

Цяжка сказаць, ці ўлічваліся ўсе гэтыя гісторыка-геаграфічныя акалічнасьці, калі месцам сустрэчы Буша з Пуціным вырашылі выбраць Браціславу. З упэўненасьцю можна сказаць толькі, што гэтыя моманты абмяркоўвацца ці нават неяк згадвацца на ёй ня будуць. Але ж яны ўсё адно будуць прысутнічаць, ці, дакладней, спадарожнічаць, «саміту» як кантэкст. Ён яшчэ больш пашыраецца, калі ўлічыць значэньне, што надаецца Крамлём сьвяткаваньню 9 траўня сёлета ў Маскве. Зусім відавочна, што 60-годзьдзе Перамогі ўспрымаецца цяперашнім расейскім кіраўніцтвам ня проста як юбілей, у бляску якога павінны яшчэ больш зіхацець мундзіры цяперашніх уладароў Расеі, а як свайго роду гістарычная вяха. За ёй, нібыта пасьля Сталінградзкай бітвы, павінен пачацца новы росквіт савецкай імпэрыі. Кіраўнікі былых савецкіх рэспублік, запрошаныя на юбілей, павінны будуць, на думку Крамля, ня проста засьведчыць са сьвяточнай трыбуны Маўзалею сваю пашану Пуціну і кампаніі, але як бы асьвяціць сваёй прысутнасьцю адраджэньне Масквы як сталіцы вялікай дзяржавы — ад Балтыйскага мора да Кушкі і Ціхага акіяну.

Расея, у адрозьненьне ад колішняга СССР, не зьяўляецца на сёньняшні дзень настолькі ўплывовай дзяржавай, каб займаць стратэгічна важнае месца ў амэрыканскай замежнай палітыцы.

Вось чаму такую нэрвовую рэакцыю выклікае ў Маскве адмова прэзыдэнта Літвы Адамкуса прыняць запрашэньне на сьвяткаваньне 9 траўня або заклікі прэзыдэнта Латвіі Віке-Фрайбэргі да расейскага кіраўніцтва прызнаць, што ў выніку вызваленьня краін Балтыі пасьля вайны туды ўсьлед за гітлераўскай акупацыяй вярнулася акупацыя сталінская.

Ды што там Вільня з Рыгай! Варшава выклікае ці ня большае раздражненьне цяперашняга расейскага кіраўніцтва. Замест таго каб дзякаваць расейскаму народу за вызваленьне польскай сталіцы (патопленай у крыві немцамі з маўклівай згоды Сталіна), Варшава асьмельваецца сёньня ўмешвацца ў падзеі ва Ўкраіне, якая заўсёды лічылася маскоўскай вотчынай.

Успрыманьне Дня Перамогі як нейкай чароўнай фээрыі адраджэньня Вялікай Расеі можна было б лічыць трызьненьнем хворай постімпэрскай сьвядомасьці. Але ж хворыя на галаву людзі выклікаюць ня толькі спачуваньне — яны могуць быць папросту небясьпечнымі для іншых праз сваю неадэкватную агрэсіўнасьць.

Прыступ перадсьвяточнай ліхаманкавай шызафрэніі тым часам ахапіў і беларускія мас-мэдыя. Напрыклад, тэзу аб тым, што, карыстаючыся пактам Молатава—Рыбэнтропа, Савецкі Саюз акупаваў Літву, Латвію і Эстонію, Беларускае тэлебачаньне паспрабавала абвергнуць вуснамі гісторыка па прозьвішчы Новік. Ён аўтарытэтна заявіў у тэлеэтэры, што ў 1940-м годзе ў названых краінах, як усім вядома, адбыліся дэмакратычныя выбары, у выніку якіх вольныя балтыйскія народы дабраахвотна далучыліся да СССР. Трэба думаць, што, калі б на выбарах тады перамаглі буржуазныя ўрады, савецкія войскі і не падумалі б перайсьці дзяржаўную мяжу! А што ўласна да тагачасных выбараў, дык з чымсьці падобным маглі добра пазнаёміцца грамадзяне Беларусі падчас апошніх рэфэрэндумаў.

А што ж Злучаныя Штаты? Ужо нават школьнікам сярэдніх клясаў зразумела, што без ваеннай ды эканамічнай моцы саюзьнікаў — найперш ЗША і Англіі — Савецкі Саюз пацярпеў бы поўную паразу ў вайне з нацысцкай Нямеччынай. Таму цяперашнія спробы Масквы паказаць сябе адзіным вызваліцелем чалавецтва ад фашызму, ды яшчэ вызваліцелем бескарысьлівым і гуманным, выглядаюць сама меней няўклюдна.

Але ці будзе спрабаваць прэзыдэнт Буш паўшчуваць ці, інакш кажучы, прывесьці ў стан прытомнасьці свайго «сябра Пуціна» ў сувязі зь яўным і паўсюдным згортаваньнем дэмакратыі ў Расеі ды адраджэньнем імпэрскасьці ў расейскай замежнай палітыцы? І ці паспрабуе амэрыканскі прэзыдэнт закрануць пытаньне аб дэмакратыі ў Беларусі, якую дзяржаўны сакратар Кандаліза Райс нядаўна залічыла ў шэраг апошніх тыраній сьвету?

Адказ, як падаецца, добра вядомы нават тым, хто ўсё яшчэ ўскладае такога роду спадзяваньні на амэрыкана-расейскія саміты. Гэтага не адбудзецца. І не таму, што ЗША не зацікаўленыя ў дэмакратычнай, а значыць, больш прадказальнай Расеі ці не зацікаўленыя ў дэмакратычнай Беларусі. А таму што Расея, у адрозьненьне ад колішняга СССР, ня толькі не нясе непасрэднай пагрозы Злучаным Штатам, але і не зьяўляецца на сёньняшні дзень настолькі ўплывовай дзяржавай, каб займаць стратэгічна важнае месца ў амэрыканскай замежнай палітыцы. У сэнсе пагрозы амэрыканскім інтарэсам Масква турбуе ЗША не нашмат болей, чым КНДР або Іран. Так, ядзерны патэнцыял гэтых дзьвюх краін вельмі непакоіць Вашынгтон. І Масква неўзабаве рызыкуе трапіць у шэраг ворагаў ЗША ўсьлед за Пхеньянам і Тэгеранам. Але ворагаў насамрэч не настолькі магутных, каб зь імі трэба было лічыцца, як некалі трэба было лічыцца з СССР зь яго ракетна-ядзерным патэнцыялам.

Ядзерная зброя, з улікам разьвіцьця найноўшых ваенных няядзерных тэхналёгій, усё больш ператвараецца ў зброю ўчарашняга дня. Тут ня месца абмяркоўваць, у чым менавіта палягаюць перавагі гэтых сучасных тэхналёгій. Відавочна адно. Адставаньне Расеі, дый, зразумела, усіх астатніх постсавецкіх краін, ад дзяржаў Захаду (уключна зь Японіяй і Паўднёвай Карэяй), а ў недалёкай будучыні, магчыма, і ад КНР стала незваротным і фатальным. Толькі Масква ўсе яшчэ ня хоча зьмірыцца з гэтым фактам. Вашынгтон імкнецца выкарыстоўваць Маскву ў нейкіх сваіх лякальных інтарэсах — накшталт барацьбы зь міжнародным тэрарызмам, пашырэньня ўплыву на краіны Цэнтральнае Азіі, процівагі ўзмацненьню Эўразьвязу і г.д.

Пры такім раскладзе Беларусі ўвогуле няма сэнсу разьлічваць на колькі-небудзь сур'ёзную ўвагу з боку Вашынгтону, паколькі яна ўсё яшчэ пазыцыянуецца Захадам як натуральны і адзіны хаўрусьнік Расеі, у якога дагэтуль няма ніякай самастойнае палітыкі. Гэта азначае, што ЗША будуць надаваць увагі афіцыйнаму Менску прыкладна столькі ж, колькі яны надаюць яе Гаване. Так, Вашынгтон адкрыта ня любіць Фідэля Кастра, шмат гадоў захоўвае эканамічнае эмбарга супраць Кубы, адкрыта падтрымлівае апазыцыю тамтэйшай дыктатуры. Але сказаць, што ў Вашынгтоне дзень і ноч толькі й думаюць над тым, як зьнішчыць рэжым Кастра… У ЗША гэтая праблема не ўваходзіць, напэўна, у першую сотню найважнейшых задач міжнароднае палітыкі. На якім месцы ў сьпісе яе прыярытэтаў можа быць Менск, застаецца толькі здагадвацца.

Але ў гэтым ёсьць падстава і для аптымізму. Яшчэ ня так даўно Эўрапейскі Зьвяз ды ЗША няшмат увагі надавалі і Ўкраіне. Украіна сама прымусіла аб сабе гаварыць, прыслухоўвацца да яе і нават усур'ёз пачаць абмяркоўваць пэрспэктывы інтэграцыі яе ў Эўропу — насуперак жаданьням некаторых эўрапейскіх краін.

Лёс эўрапейскіх народаў больш не вырашаецца, як было ў мінулым стагодзьдзі, падчас сустрэч лідэраў вялікіх дзяржаваў. Чакаць, што для Беларусі нешта зьменіцца ў выніку «саміту» ў Браціславе значыць займацца, у найлепшым выпадку, самападманам.

# Зачараваньне Барадуліным

Пра Р.Барадуліна шмат могуць расказаць назвы яго кніг. Ён зачараваны сьветам прыроды: спавядаецца, што любіць і «маладзік над стэпам», і «спадчыннае возера маё, // Вечнасьцю прывечанае // Вечальле» («Вечальле»), і «вяртаньне ў першы сьнег», «і сонца сьмех, // і аблачынак апошні сьнег // п'ю зь неба, як з поўнага кубка, нагбом…» («Нагбом»), і «рум» на беразе ракі, адкуль сплаўлялі плыты, і «маўчаньне перуна», і «белую яблыню грому», і «сьвята пчалы».

Паэт апісвае чароўную краіну каханьня (кніга «Адам і Ева»): «А я выводжу, як школьнік, // Імя тваё на сьнягу» («Дзень пачынаю…»). Хоча, як і ў маладосьці, па-ранейшаму «рунець, красаваць, наліваццa!» «Неруш» некранутых тэм і вобразаў ён з дапамогай высокай «Амплітуды сьмеласьці» ператварае ў «Абсяг» індывідуальна-непаўторнай паэзіі, якая пішацца цягам доўгай «Лініі перамены дат». А ягоная «Самота паломніцтва» з «Эвангельлем ад Мамы» нагадвае, што «Трэба дома бываць часцей…», і абяцае «Міласэрнасьць плахі», бо сапраўднае застаецца. Заканамерны працяг яго сяброўскіх шаржаў («Абразоў без абразы») — «Дуліны ад Барадуліна» (на нашых вачах нарадзіўся іранічны жанравы сынонім «барадулінскай эпіграмы» — «дуліна»!). А якія ўзьнёсла-чароўныя назвы барадулінскіх прысьвячэньняў жанчынам — «Рэвэрансны верш», «Акрамроя», «Акраанямeньне»!

Паэт экзыстэнцыйна-тонка адчувае самоту, шануе духоўнага Бацьку і родную Маці — крыніцу сваёй творчай моцы і магутнай моўнай стыхіі («Я цяпер як апошні колас. // З самых родных яшчэ засталіся / / Бацька Бог ды ад мамы Голас»). Удзячны сын, які шмат вершаў прысьвяціў маці Куліне («Толькі ў мамы // Самы суровы дакор // І пяшчотнейшы самы»). Рыгор Іванавіч любіць і ўнучку Дамініку, якую ён вучыць і ў якой вучыцца: «Размову вяду з Дамінікаю, // Яна мне й кажа сакрэт: // — У каго сэрца вялікае, // Той пражыве ўвесь сьвет…» («Размову вяду з Дамінікаю…»). Толькі гэты паэт можа зь лёгкім гумарам, зь нечаканым вобразна-сытуацыйным паваротам так апісаць эратычныя жаданьні: «Дзе зор, // Дзе радзімак галяктыка? // Малю ў вечаровым запале, // Каб гузікі ўсе з халаціка, // Як зьнічкі, // З твайго апалі» («Маленьне да твайго халаціка»).

Узьнёсласьцю мілоснага пачуцьця кранае: «Я думаю ўвесь час // Ня думаць пра цябе» («Марнае стараньне»). Уздымае настрой ода-прысьвячэньне «Дзяўчатам філфаку»: «Ад абцасікаў да макаўкі // Вы ў сюжэтах, параўнаньнях, // Мройнавокія філфакаўкі, // Рыфма глухне перад вамі»; «Усьміхнецеся, філфакаўкі, — / У душы ўзыходзяць зоры». Калі паэт быў немаўлём, бацькі пратэсьціравалі яго па-сялянску, і дзіця выбрала бурак, а не паперыну (значыць, будзе аратым, сейбітам). «Пацьвердзіўся тэст: // Зь відна да цямна // Ару я даволі // І сею ўволю: // Насеньне чорнае, // Белае поле» («Тэст пацьвердзіўся»).



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Ужо стаўшы валхвяцом Паэзіі, аўтар набліжаецца да разуменьня яе сутнасьці: «Лірычны верш — // Юнак дзівоснай моцы й // Мужчына, // Што адчуў сваю бяду, // Касьмічны сон // Усіх зямных эмоцый, // Табе на плаху // Галаву кладу» («Юнак і…»). У творах Р.Барадуліна «Асацыяцый караваны // Па ўсіх радках накіраваны» («Паэты»). Ён падказвае іншым творцам: «Сам дбацьмеш аб сяўбе // І думаць пра дакоскі. // Прадумай сам сябе // Ад кропкі і да коскі» («Паэты»). Як вопытны майстар, пісьменьнік з гумарам раіць маладзейшым, як церабіць шляхі да Парнасу («Выпускай па мікратому // І не саступай нікому», рабі самарэкляму, «модна фатаграфавацца // Навучыся тэрмінова: // Выгляд скажа больш, // Чым слова!», жаніся з дачушкай генія і інш.). Ня выйдзе — ня варта перажываць: «А ня ўдасца на літполі // Свой пакінуць вечны сьлед, — // Хоць бы насьлядзіць уволю!» («Як у геніі прабіцца?»).

Аўтар (з усьмешкай) дзеліцца і сваім вопытам перастваральніка сусьветнай паэзіі: «Перакладаеш вялікага — // Часова // Вялікім робішся» («Перакананьне перакладчыка»). Р.Барадулін дае наказ сучасьнікам не забываць пра духоўнасьць і ідэалы: «Ёсьць варыва — // Для чэрава, // Для сэрца трэба — // Верыва!» («Помні!»). І дзеліцца сваім крэда — несьці ў слове высокую духоўнасьць, каб застацца ў памяці нашчадкаў: «Хоць век твой — краец веташка, // Шлях людзям знач ты, жыцьмеш покі, // Каб не разьбіцца, як машка, // Аб ветравое шкло эпохі!» («Хоць век твой — краец веташка…»). Паэт шчыра любіць радзіму («Беларусь — бераг белых буслоў») і просіць нас не забывацца на свае нацыянальныя карані: «У кожным беларусу // Беларус // Хай чуецца, // Як зерне ў аральлі. // Каб замак духу нашага // На друз // Патрушчыць землятрусы // Не маглі» («Змусь!»).

Падчас вучобы на філфаку БДУ мяне вельмі ўразілі кнігі Р.Барадуліна «Мудрэц са ступаю» (1988) і «Трэба дома бываць часьцей…» (1993). Прачытаўшы іх, імкнулася чытаць усё паэтава, што патрапіць пад руку.

Барадулінская паэзія мяне прыцягнула жывапісна-пластычны сьветам, які ўспрымаецца ўсімі органамі пачуцьцяў; мовай, напоенай ушацкімі крыніцамі; магутнай народнай стыхіяй, аўтарскімі нэалягізмамі. Ягоная паэзія як рака, дзе ёсьць усё — ад вытокаў (маці Куліна, радзіма-Вушаччына, беларуская мова) да вусьця (асэнсаваньне доўгага шляху, месца — свайго і іншых пісьменьнікаў — у сучасным літаратурным працэсе, стварэньне свайго мастацкага сьвету і карціны сьвету ў згарманізаваным, завершаным выглядзе).

Віншуючы сп.Рыгора з 70-годзьдзем, зычу яму, дбайнаму сейбіту, і далей узбагачаць беларускую паэзію сваімі вершамі і самому «рунець, красаваць, наліваццa» на яе ніве.

І словы  
Жалудамі з дуба  
У аральлю душы спадаюць.  
І прарастаюць там навечна  
Расток радка,  
Галінка верша…

**Тацяна Барысюк**

## Рыгору Барадуліну

**Р**удымэнт мінулага — клінок.  
**Ы** І на «Ы» няма, здаецца, слова…  
**Г**оспадзе! Як цягне Вечны Бог  
**О**рдэн даць табе, мой друг вясковы.  
**Р**убаі Хаямавы чытаць  
**У** азёрным сьне маёй краіны —

**Б**ог за тое здыме Благадаць,  
**А** Пярун гнеў ярасны абрыне.  
**Р**оспачы няма, што ты стары.  
**А**д тваіх «старэчых» выдумленьняў  
**Д**а тваёй Майсеевай гары  
**У** душы, здаецца, крок: сумленьне.  
**Л**ітасьці! Прашу толькі яе,  
**І** цяпер ты, апантаны ў трэлях,  
**Н**е адмовіш, нам усім нальеш  
**У**вечары таго, што п'еш ты, келіх.

**В**еру: ёсьць Вялікі Пераклад  
**Е**вангелістычнай Вечнай мовы…  
**Ч**орту, дзядзька, ты ня цесьць, ня брат.  
**Н**орнаў сын. Мяча прылад крыжовы.  
**А** калі пачуеш ты *свой* знак, —  
**С**івізна твае фарбуе вусы, —  
**Ь**********  
**Ц**ьвёрдым будзь, як рускі цьвёрды знак,  
**Ь** Мяккім будзь, як сымбаль Беларусі.

**Аляксандар Рыгоравіч**

Рэдакцыя далучаецца да віншаваньняў з 70-годзьдзем народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна.

**4** сакавіка,

**19:00**

**Дом літаратара**
(пл.Перамогі, вул.Фрунзэ, 5)

Даведкі:
6490888, 7662425, 4006774



Вялікі сьвяточны сольны канцэрт
**Зьмітра Вайцюшкевіча**
прысьвечаны 70-ці годзьдзю народнага паэта Беларусі
**Рыгора Барадуліна**
Таксама удзельнічае Алесь Камоцкі
Сьпяваем разам з Рыгорам Барадуліным!

# X–files: лазанкі

**АЛЕСЬ БЕЛЫ**

Часам з корпусу страў беларускай кулінарыі выпадаюць прастатакі знакавыя стравы. Ці ня самы красамоўны прыклад — лазанкі.

Гэтая мучная страва вядомая этнографам досыць даўно, нават ва ўсе энцыкляпэдыі трапіла (шкада, што адказныя за нацыянальную кулінарыю іх няўважліва чытаюць). Як робяць або нядаўна рабілі лазанкі ў беларускай вёсцы? Крута замяшанае цеста з пшанічнай, жытняй або грэцкай мукі тонка раскачвалі, рэзалі на кавалкі (квадраты, трохкутнікі), варылі, адцэджвалі, залівалі салам, алеем з цыбуляй ці сьмятанай, у пост пасыпалі цёртым макам, тоўчаным семем, разьмятымі ягадамі.

У больш дасканалых варыянтах адвараныя лазанкі тушылі ў пячным духу са сьмятанай або запякалі зь мясам, капустай і інш.; часам смажылі. Страва шырока вядомая ў Браслаўскім, Мядзельскім, Ваўкавыскім раёнах, часткова на Магілёўшчыне, цэнтральным і ўсходнім Палесьсі — зрэшты, гэта толькі месцы, дзе лазанкі зафіксавалі этнаграфічныя экспэдыцыі, з чаго зусім не вынікае, што іх ня ведалі ў іншых рэгіёнах Беларусі.

У некаторых раёнах заходняй і цэнтральнай часткі краіны, на Магілёўшчыне лазанкі пяклі з пшанічнай мукі («праснаком») у форме «кантовых» кавалачкаў (іх называлі ламанцамі). Елі зь цёртым макам, семем, звычайна на посную куцьцю. Лазанкі ўжываюцца як дадатак да супоў (напрыклад, грыбных) або для прыгатаваньня своеасаблівых запяканак.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Лазанкі, згатаваныя ў менскай рэстарацыі «Камяніца».

Але пра лазанкі можна даведацца значна больш. Напрыклад, калі падгледзець праз шчыліну ў нашым заходнім плоце, дык заўважым, што ў палякаў таксама ёсьць лазанкі, прычым ня толькі ў этнаграфічных энцыкляпэдыях, але і ў кулінарных кнігах, і больш за тое — у сямейных ды рэстаранных мэню! А гісторыкам матэрыяльнай культуры, апроч таго, вядома яшчэ, што лазанкі (ці польскія, ці беларускія) — гэта адаптацыя славутай лязаньі, адной з найбольш папулярных страў італьянскай кухні. Ужо гарачэй?

Што ж, і ў польскага далягляду ёсьць свой абсяг — то мусім пакінуць берагі Віслы і перанесьціся ў думках на Апэніны. Італьянцы, канечне, мала што ведаюць пра нашы лазанкі, але затое гісторыю лязаньі вывучылі досыць добра. Лязанья (lasagne), як мяркуюць, — найбольш старажытная форма макароны.

Лічаць, што пачатковa ў Старажытнай Грэцыі словам «laganon» называлі пляскатую хлебную аладку; рымляне, пазычыўшы яе ў грэкаў, пачалі разразаць яе на тонкія скрылі, якія называлі «lagani». Іх любілі Цыцэрон і Гарацый. Лічыцца, што «lagani» ўяўлялі зь сябе смажаныя палоскі цеста, якія дадаваліся ў тушаную садавіну або ў супы. У раньняе сярэднявечча страва трансфармавалася ў разнавіднасьць мучных клёцак, якія дадаваліся ў гаршчок з тушаным мясам або садавінай. У часы Марка Пола (XIII ст.) лязанья ўжо ў асноўным была падобная да сучаснай — тонкія пляскатыя шырокія кавалкі цеста, звычайна прамавугольныя, а пры сучаснай масавай вытворчасьці пераважна гафраваныя накшталт шыфэру, спачатку адварваюцца як локшына, а потым тушацца ў печы ці духоўцы з разнастайнымі дабаўкамі (садавіной, мясам, грыбамі і г.д.). Багата ў якіх італьянскіх рэстаранах Беларусі лязанью можна пакаштаваць без асаблівых праблем — але паспрабуйце запытацца там пра беларускія лазанкі! Зрэшты, чаму б менавіта італьянскім рэстаранам не распачаць адраджэньне незаслужана забытай стравы? У якасьці нашага невялічкага ўнёску ў гэтую справу даём некалькі актуальных рэцэптаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**АЛЕСЬ БЕЛЫ** (нар. у 1968 у Менску) — дасьледчык гісторыі матэрыяльнай культуры. Сябар рэдкалегіі часопісу «Спадчына». Ляўрэат прэміі Беларускага ПЭН-цэнтру імя Ф.Багушэвіча 2001 г.

## Лазанкі

350 г мукі, 2 яйкі, 3—4 лыжкі вады, соль

Муку прасеяць на раскатачную дошку, зрабіць паглыбленьне, убіць яйкі, уліць ваду, перамяшаць да атрыманьня загусьцелай, цьвердаватай масы, старанна сфармаваць, падзяліць на часткі, тонка раскачаць і пакінуць цеста, каб падсохла. Затым пасыпаць мукой, скруціць у рольку, якую скроіць на палоскі шырынёй 2 см, а іх падзяліць на квадрацікі і раскачаць па дошцы. Лазанкі апусьціць у кіпячую падсоленую ваду, перамяшаць, прыкрыць накрыўкай, паварыць, адцадзіць, зьліць гарачую ваду.

## Лазанкі па-літоўску-1

Цеста — як у папярэднім рэцэпце.

Начынка — 200 г вэнджанай каўбасы, 2/3 шклянкі сьмятаны, 2 яечныя жаўткі, 2 цыбуліны, 1,5 лыжкі тлушчу да цыбулі, тлушч і паніровачныя сухары для формы, соль і перац на смак.

Лазанкі згатаваць, як у папярэднім рэцэпце. Цыбулю абабраць, абмыць, дробна парэзаць, пасмажыць, перамяшаць са згатаванымі лазанкамі, парэзанай на скрылі каўбасой і сьмятанай, перамяшанай зь яйкам і жаўткамі; пасаліць і папярчыць. Затым выкласьці ў форму, нашмараваную тлушчам і пасыпаную сухарамі, выраўнаваць паверхню і запячы.

## Лазанкі па-літоўску-2

Цеста — як у першым рэцэпце.

Начынка — 200 г вяндліны ці вэнджанай каўбасы, 40 г сушаных грыбоў, 100 г жоўтага цьвёрдага сыру, тлушч і паніровачныя сухары для формы, соль і перац на смак.

Лазанкі згатаваць паводле першага рэцэпту. Грыбы вымыць, вымачыць, згатаваць, парэзаць на палоскі разам зь вяндлінай, перамяшаць з лазанкамі, аздобіць прыправамі. Затым перакласьці ў форму, змазаную тлушчам і пасыпаную сухарамі, выраўнаваць паверхню, пасыпаць цёртым сырам і запячы.

## ПОШТА І КАМЭНТАРЫ

### Як мы на «Эўрабачаньне» паедзем?!

Менавіта такая думка ўзьнікла, калі знайшоўся той чалавек, якому лёс наканаваў паказаць, што за ПОП-прадукт вырабляюць у нашай краіне. Прадстаўляць нашу дзяржаву на Эўрабачаньні-2005. Гэтай ахвярай, зноў прабачце, пераможцай стала Анжаліка Агурбаш, у мінулым вядомая як Ліка Ялінская.

Разгледзім нашы рэальныя шанцы.

Самы рэальны варыянт — гэта грошы мужа Анжалікі, за якія можна купіць ня толькі Эўрабачаньне!

Варыянт два: нікуды ня ехаць.

Паводле трэцяга варыянту мы пераможам, калі ад Расеі паедзе Пугачова, а ад Украіны — Сярдзючка.

Варыянт чатыры: адправіць Славу Кораня ў Кіеў з навуковай працай «Рок-музыка ў нашай жыцьцядзейнасьці. Дрэнные ўзьдзеяньне папсы і поп-музыкі на чалавечы арганізм».

А калі сур'ёзна, дык трэба ўжо задумацца: можа, лепш спыніцца, пакуль ня позна?

**Алег Заяц, Менск**

### Вечнае безграшоўе

За студзень прыйшоў рахунак за «камуналку» на 135 тысяч. За лістапад мы плацілі 105 тыс., а летась за люты — 75. (Жывём 4 чалавекі ў стандартнай трохпакаёўцы). Гэта вось тыя міфічныя «2%» росту ў месяц, пра якія гаварыў Лукашэнка. Аддаём на камуналку цяпер каля 17% нашых месячных даходаў (я настаўніца, муж кампутаршчык). Калі лукашысты гавораць пра 6—7% даходаў, якія «насельніцтва» траціць на камунальныя плацяжы, яны, мусіць, па сваіх заробках мераюць.

Калі ж далучаю да камунальных аплаты за электрычнасьць, тэлефон, садок — куды трэба яшчэ ўсё купляць самім, ад мыла да туалетнай паперы, — у мяне застаецца на ежу і лекі дзесяцм. Хто жыве, як мы, той мяне зразумее і падтрымае. Я стамілася ад вечнага безграшоўя. Хай мне ня дураць галаву. Я ведаю, хто вінаваты ў тым, што мы зарабляем у 4 разы менш за палякаў. Я хачу, каб у краіне зьмянілася кіраўніцтва!

**Вольга Дз., Менск**

### Вяртаньне да «пана»

Пэўна, для Яна Станкевіча слова «спадар» мела значэньне «не-таварыш» і «няпан», бо тыя словы несьлі ідэалягічны цяжар на той момант: «пан» — прадстаўнік польскай адміністрацыі, «таварыш» — бальшавік. Але з псыхалягічнага пункту гледжаньня слова «спадар» мае ва ўспрыманьні большасьці насельніцтва адмоўнае адценьне. Прынамсі, асацыюецца з паразамі прагрэсіўных сіл. Ці ня час цяпер перагледзець пэўныя моўныя палажэньні? Ва Ўкраіне буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю ажыцьцявілі «паны».

Народу, каб стаць вольным ды заможным, неабходна неяк шляхетна звацца. Да яго — рабочага МТЗ, калгасьніка, настаўніка — трэба і гэтак шляхетна зьвяртацца. Тады ён, народ, яго прадстаўнікі, адчуе сябе паважаным, панам ня толькі «сахі і касы», але й сваёй зямлі. Слова — гэта ідэя.

Максім Багдановіч, пішучы ў Нашу Ніву, зьвяртаўся: «Паважаныя паночкі!..»

**Сяргей Вушакоў, Бабруйск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы.
Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.


## КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на с. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 см$^2$ — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку блянка паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».
Даведкі праз т. (017) 284-73-29

# Воля да перамогі



ТАЦЯНА ПЛАХЕТКА

Суд Першамайскага раёну Менску задаволіў пазоў кіраўніка слонімскай грамадзкай арганізацыі «Воля да разьвіцьця» супраць Беларускага тэлебачаньня. 16 сакавіка 2004 г. у «Панараме» гарадзенскі карэспандэнт БТ-1 Мікалай Мельнічэнка сказаў, што Варанец на грошы праграмы TACIS фінансуе апазыцыю. Слонімскі актывіст падаў у суд, каб абараніць гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю — свае ды арганізацыі. Судзьдзя Лілія Цяліца прызнала рацыю Варанца і абавязала БТ абвергнуць няпраўду.

Былы «аўганец» Міхась Варанец (**на фота**) у ліпені 2004 г. выйграў суд у слонімскай падатковай інспэкцыі (наконт выплаты падаткаў з грошай, атрыманых па праграме TACIS), цяпер — у БТ.

**«НН»: Звычайна на аналагічных працэсах БТ суд вырашае, што журналіст тэлекампаніі выказваў прыватнае меркаваньне і ня мусіць прыцягвацца да адказнасьці. Як Вам удалося выйграць працэс?**

**МВ:** Думаю, гэтае пытаньне трэба задаць судзьдзі. Бо пазыцыя суду адыграла вызначальную ролю. У дэмакратычнай прэсе звычайна прынята паказваць так: калі судзьдзя прыняў рашэньне не на карысьць дэмакратычнага боку — значыць, ён служка рэжыму. Калі вырашыў наадварот — значыць, нехта даў такое ўказаньне. Складаецца ўражаньне, нібы права на ўласную годнасьць уласьцівае толькі дэмакратам, а не дзяржаўным чыноўнікам.

Мы (я і юрыст Юры Чавусаў) карысталіся на працэсе толькі юрыдычнымі тэрмінамі і прад'явілі суду дакумэнты, якія не выклікаюць сумневу. Калі мы хочам павагі да сябе, то не павінны папікаць той жа суд ці БТ у несумленных учынках, ня маючы дакумэнтаў. На жаль, часта бывае іначай. Сёньня ты абвінавачваеш, маючы дакумэнты; заўтра — абвінавачваеш, але ня маеш дакумэнтаў; а пасьлязаўтра — бо хочаш «засьвяціцца». Кожнае слова павінна быць падмацавана дакумэнтамі.

**«НН»: Як мяркуеце, спыніліся ўжо «тасісаўскія» справы, паводле якіх абвінавачвалі і вас, і БХК, ці варта чакаць працягу?**

**МВ:** Цяжка меркаваць: адны арганізацыі, якія працавалі па праграме TACIS, былі прыцягнуты да адказнасьці, другія — не. На мяне слонімская фінансавая міліцыя нават заводзіла ў красавіку крымінальную справу з гэтай прычыны. Аднак спыніла яе яшчэ 10 лістапада (аналягічную справу БХК закрылі перад Новым годам). Цяпер я абскарджваю законнасьць адкрыцьця гэтай крымінальнай справы і прашу пакараць вінаватых — набраў ужо цэлыя тамы перапіскі, чакаю адказу за подпісам генэральнага пракурора. Мая пазыцыя тут такая: сёньня на мяне завялі крымінальную справу, хаця я быў невінаваты й для яе не было падстаў, а заўтра могуць прыйсьці ды пасадзіць ні за што. Я супраць гэтага буду змагацца!

**Гутарыў Аркадзь Шанскі**

# Пачуцьце еднасьці на васьмі палосах

Аднавіўся выхад газэты «Навіны БНФ»

Тры з паловай гады Партыя БНФ была калі не бяз голасу, дык, прынамсі, без мэгафону — менавіта на столькі расьцягнуўся перапынак у выхадзе газэты «Навіны БНФ». І вось, на лютаўскім сойме Фронту партыйцаў чакала прыемная неспадзяванка — акуратныя стосы сьвежанадрукаваных нумароў газэты. Маўляў, частуйцеся, калі ласка!

Газэтны прадукт фронтаўскай журналістыкі атрымаўся дастаткова пажыўны, ня гледзячы на спартанскі памер інфармацыйнай порцыі (восем палосаў штомесяц). З цукрам у выглядзе прапаганды партыйных ідэяў не перабралі, зь перцам у выглядзе вострай крытыкі рэжыму — таксама. Усяго ў меру.

Большасьць твараў — маладыя, але ўжо добра знаёмыя. Бачна: маладафронтаўскае пакаленьне апераліся, апранула пінжакі з гальштукамі. Выбіваецца з шэрагу хіба што Рыгор Барадулін у сваёй скуранай камізэльцы — «Навіны БНФ» віншуюць яго з 70-годзьдзем.

«Навіны БНФ» ня робяць прэтэнзіі на шырокі ахоп нацыянальных падзеяў. Разам з тым, Фронт выдае не стандартны партыйны бюлетэнь, а менавіта газэту — нават ня гледзячы на тое, што яна выходзіць накладам 299 асобнікаў фарматам А4 ды распаўсюджваецца не праз шапікі, а бясплатна — «на правах унутранай дакумэнтацыі». Газэта прапануе паўнавартасны набор тэматычных старонак: «інтэрвію», «аналітыка», «рэгіёны», «эканоміка», «за межамі». Ёсьць і спэцыфічная паласа «цэнтральная сядзіба» — у першым нумары аднайменай газэты голас з управы БНФ падаюць лідэр партыі Вінцук Вячорка ды ягоны намесьнік Аляксей Янукевіч. Іх артыкулы зьнітоўвае тэма падрыхтоўкі да прэзыдэнцкіх выбараў.

Галоўная задача «Навінаў БНФ» — падтрымліваць сувязь паміж сталічным кіраўніцтвам ды сябрамі партыі ў рэгіёнах. Справа выключнай важнасьці, улічваючы тое, што абавязковая перарэгістрацыя партыйных суполак пагражае амаль цалкам зьнішчыць апазыцыйную інфраструктуру, калі партыя згубіць ладную частку памяшканьняў, у якіх разьмяшчаюцца яе структуры на месцах, «Навіны БНФ» зробяцца той віртуальнай прасторай, у якой сябры Фронту змогуць адчуць сваю еднасьць. «А пачуцьцё еднасьці дадасьць нам моцы», упэўненая рэдкалегія «Навінаў БНФ».

**Алесь Кудрыцкі**



НАВІНЫ БНФ

нумар 1 (79) 12 лютага 2005 г.

У нумары:

**Выклікі часу,** *Аляксей Янукевіч* стар. 2-3

**Воля й рашучасьць,** *інтэрвію з Алесем Мілінкевічам,* стар. 3

**Канцэпцыя вылучэньня адзінага кандыдата** *Уладзімір Лабковіч* стар. 4-5

**Сяргей Антусевіч** *наш кандыдат на выбарах* стар. 5

**Дзядзька Рыгор, Віншуем** стар.8

Тры з паловай гады прайшло з моманту прыпыненьня выхаду газэты «Навіны БНФ». Мы ўсе разам з вамі адчувалі патрэбу й неабходнасьць у агульнай інфармацыйнай прасторы, у партыйным выданьні. Ад гэтага часу нашая партыйная газэта – бюлетэнь «Навіны БНФ» – будзе выходзіць штомесяц. Бо так павінна быць: сучасная палітычная партыя мусіць мець сваё друкаванае слова. Каб мець магчымасьць выкласьці партыйны пункт гледжаньня на праблемы не праз «другія рукі», каб існавала сталая ўнутрыпартыйная камунікацыя паміж кіраўніцтвам і шарагоўцамі. Каб людзі ў розных кутках краіны ведалі, што робяць сябры па партыі ў іншых рэгіёнах. Каб не было адчуваньня, што кожны з нас дзейнічае паасобку. Насамрэч нас багата. Толькі разам мы – Фронт. Разам мы здолеем зрабіць нашую краіну вольнай, і гэта – нашая галоўная мэта. А пачуцьцё еднасьці дадасьць нам моцы. Спадзяемся, што вы падтрымаеце рэдакцыю ў нашай важнай справе інфармацыяй, водгукамі, пажаданьнямі ці крытыкай. Зычым вам плёну ў штодзённай і ахвярнай партыйнай працы.

*Прэс-група БНФ*

## СЬЦІСЛА

Пракуратура Чарнігаўскай вобласьці Украіны 9 лютага распачала крымінальную справу па факце затрыманьня на мяжы актывістаў беларускай апазыцыі **Аляксандра Атрошчанкава, Зьмітра Бандарэнкі, Зьмітра Бародкі і Ўладзімера Кабца** пасьля вяртаньня іх з вандроўкі ў «аранжавы Кіеў».

КДБ Берасьцейскай вобласьці 14 лютага затрымаў жыхара Кобрына, актывіста Беларускай хрысьціянскай прэс-групы абароны правоў чалавека ў сыстэме Расейскай і Украінскай царквы эвангельскіх хрысьціян **Аляксандра Казарэза** і завёў на яго дзьве крымінальныя справы — за махлярства і падробку, а таксама выраб або выкарыстаньне падробленых дакумэнтаў. Казарэза вінавацяць у выдачы падробных дакумэнтаў, якія сьведчаць перад сусьветнай супольнасьцю пра палітычны перасьлед.

14 лютага намесьніка старшыні Саюзу палякаў Беларусі **Юзафа Пажэцкага** асудзілі на 10 сутак: старшыня арганізацыі Тадэвуш Кручкоўскі заявіў, што Пажэцкі яго зьбіў.

Актывістка незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» з Барысава **Сьвятлана Нетылькова** дапытана 14 лютага ў сябе дома: сьледчы цікавіўся ейным удзелам у вулічных пасьлярэфэрэндумных акцыях у Менску.

Падчас расклейкі ўлётак і распаўсюду «Свободной газеты» ў Барысаве 14 лютага былі затрыманы актывісты «Зубра» **Аляксандар Малчанаў, Міхал Старавойтаў, Віталь Янкоўскі.**

Крычаўская раённая пракуратура 14 лютага вынесла афіцыйнае папярэджаньне заснавальніку й рэдактару недзяржаўнай газэты «Вольны горад» **Уладзімеру Кудраўцаву**: у пракуратуры лічаць, што ў матэрыялах выданьня ёсьць абразы на адрас улады й заклік да рэвалюцыі, абвешчанай Клімавым.

Актывістку АГП **Людмілу Грознову** 15 лютага выклікалі ў пракуратуру Беларусі: сьледчы з аддзелу нагляду за выкананьнем заканадаўства ў СМІ Павал Радзівонаў цікавіўся ейнымі крыніцамі для складаньня сьпісу парушэньняў правоў чалавека.

У пракуратуру Наваполацку 16 лютага быў выкліканы праваабаронца **Зьміцер Салаўёў**: ад яго запатрабавалі тлумачэньняў наконт праваабарончай дзейнасьці й выпуску бюлетэню «Наша права».

Кіраўнік ліквідаванага ГА «Грамадзянскія ініцыятывы» з Гомелю **Віктар Карняенка** 16 лютага выйграў справу супраць пашпартна-візавай службы, якая забараняла яму выезд за мяжу.

Адміністрацыйная камісія Фрунзэнскага райвыканкаму Менску 16 лютага спыніла справу супраць **Аксаны Новікавай**, затрыманай за збор сродкаў на «аранжавую рэвалюцыю» ў Беларусі і абвінавачанай у жабраваньні. Новікавай зрабілі вусную заўвагу.

**Сойм ПБНФ** 17 лютага атрымаў пісьмовае папярэджаньне ад Міністу за парушэньне Жыльлёвага кодэксу: партыйныя структуры па-ранейшаму зарэгістраваныя на прыватных кватэрах. Цягам месяца партыя павінна выправіць пытаньне.

17 лютага Рада **РГА «Беларускі Хельсынскі камітэт»** разгледзела папярэджаньне, вынесенае Мінюстам у студзені 2005 г., і пастанавіла аспрэчыць яго ў Вярхоўным судзе: Мінюст прызнаў незаконным накіраваньне ў якасьці назіральнікаў нечальцоў БХК і накіраваньне прадстаўнікоў БХК для абароны правоў асоб, якія не былі чальцамі аб'яднаньня, а таксама выказаў прэтэнзіі да юрыдычнага адрасу берасьцейскай філіі БХК. Тым ня менш, БХК вырашыў ліквідаваць рэгіянальныя філіі, пакінуўшы толькі ўпаўнаважаных прадстаўнікоў.

У Гомелі 17 лютага судзьдзя Чыгуначнага раёну Віталь Козыраў аштрафаваў **Вольгу Сузько** й **Канстанціна Лесунова** за раздачу ўлётак ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Лімон» на 10 базавых велічынь кожнага. Адміністрацыйная камісія Чыгуначнага раёну 2 лютага ўжо штрафавала іх за той самы выпадак на 48 тыс. руб. кожнага.

**Аляксандар Бірылаў**, адвакат асуджаных лідэраў прадпрымальнікаў **Валер'я Леванеўскага** і **Аляксандра Васільева**, 18 лютага накіраваў у Вышэйшы суд наглядную скаргу з просьбай адмены прысуду: ён лічыць, што на працэсе былі допушчаны шматлікія працэсуальныя парушэньні, ня выкліканы ўсе сьведкі, ня ўлічаны экспэртныя аналізы.

У пракуратуру Беларусі 18 лютага выклікалі старшыню аргкамітэту Беларускага антыядзернага фронту **Ўладзімера Парфяновіча** для тлумачэньняў наконт фармаваньня ў краіне антыядзернага руху.

18 лютага Менскі абласны суд скараціў тэрмін пакараньня да 3,5 году **Міхаілу Марынічу**. Каля суду, дзе актывісты апазыцыі сабраліся для падтрымкі Марыніча, былі затрыманы **Аляксандар Д.** і **Мікіта Сасім**.

На 5 б.в. аштрафаваны 18 лютага дэпутат Рагачоўскага райсавету, сябар АГП **Зьміцер Шкулькоў**: яго абвінавацілі ў незаконным вырабе ўлётак пра рэформу жыльлёва-камунальнай гаспадаркі.

**ГА «Беларускі жаночы рух «Адраджэньне Айчыны»** ліквідаванае 21 лютага рашэньнем Вярхоўнага суду. Падставай сталі памылкі ў вядзеньні справаводзтва і ў афармленьні пратаколаў кіруючага органу арганізацыі, а таксама нясвоечасовая даваньне Мінюсту запатрабаванай інфармацыі пра дзейнасьць аб'яднаньня.

Пра звальненьне з працы 21 лютага папярэдзілі актывістак грамадзкіх арганізацый — дэпутатку Верхнядзьвінскага райсавету **Валянціну Кудлацкую** (кіраўніцу філіі Беларускай арганізацыі працоўных жанчын) і юрыстку **Надзею Іванееву**. Іванеевай пагражаюць звальненьнем, хоць нядаўна яна была прызнаная найлепшым страхавым агентам і ейны партрэт зьмешчаны на Дошцы гонару.

**Сяргей Скрабец** 21 лютага падаў скаргу ў ЦВК на рашэньне Гарадзенскай акруговай выбарчай камісіі, якая не зарэгістравал яго кандыдатам у дэпутаты: ён лічыць рашэньне палітычна матываваным.

У Менску 22 лютага пасьля сустрэчы з намесьнікам міністра юстыцыі Краўцовым міліцыянты спрабавалі затрымаць старшыню ПБНФ **Вінцука Вячорку** для прымусовай дастаўкі ў пракуратуру. Яго адпусьцілі пасьля тэлефоннай размовы са сьледчым пракуратуры.

**АШ**

# Пра Расею і надзею

**ЮРЫ АНДРУХОВІЧ**

## Фальсыфікацыі

Я ненавіджу тэлебачаньне: яно на дзевяць дзясятых складаецца з папсы. Зрэшты, зь нянавісьцю я загнуў — можна выказацца і больш стрымана. Скажам так: я недалюбліваю тэлебачаньне. Ці яшчэ мякчэй: я цалкам мог бы пражыць без тэлебачаньня.

Але яшчэ два-тры месяцы таму назад я, ненавідзячы тэлебачаньне, ня мог безь яго жыць. Я нэрваваўся і пераключаў каналы, і кожны зь іх навыперадкі з астатнімі спрабаваў усяго мяне, на ўвесь мой рост, акунуць у дэзу, укрыць мяне ёю з галавой, патапіць мяне ў ёй.

Натуральна, падзеі ішлі да выбараў прэзыдэнта Ўкраіны, і тэлевізійная дэза лічылася адным з найдзяйсьнейшых сродкаў перадвыбарнай барацьбы ў імя адзінага і непадзельнага праўладна-прарасейскага кандыдата.

Але я (пазьней выявіцца, нас такіх было 15 мільёнаў) любіў іншага кандыдата і справу яго выбраньня палічыў, ні на што не зважаючы, справай усяго свайго жыцьця. Таму я ненавідзеў усе (за выняткам аднаго) украінскія тэлеканалы, якія бяз стомы вылівалі вонкі смурод, і асабліва мяне раздражняў расейскі чалавек Дзьмітры Кісялёў на адным зь іх.

У адрозьненьне ад калег-абарыгенаў ён хлусіў з асаблівым прафэсійным аплёмбам. Мабыць, менавіта такім чынам — хлусьнёй — ён змагаўся за адзінства Ўкраіны і Расеі. Яму здавалася, што ён робіць добрую справу для краіны, якой не шкада. Аднак годзе пра яго.

Бо потым жа ў нас была рэвалюцыя — ага, імена так, без двукосься, я і пішу гэтае слова, бо калі гэта было нешта іншае, скажам «рэвалюцыя», то я нічога ва Ўкраіне ня кемлю. І пад яе, рэвалюцыі, грамадзянскую узьдзеяньнем нават тэлеканалы пераўтварыліся і перасталі хлусіць — амаль усе, за выняткам, бадай, аднаго, але той — данецкі, яму можна.

І калі я ўжо паціху астываў ад сваёй тэлефобіі, а ўсьмешкі тэлевядучых пераставалі здавацца мне такімі бясконца агіднымі, я выпадкова (гэта было ў гасьцях) напароўся на адзін з галоўных расейскіх тэлеканалаў і мне абʼявілі, што яны зараз пакажуць фільм «пра падзеі ва Ўкраіне».

Пасьля чаго пачалося: відэарад з бамжамі, нібыта «ўдзельнікамі рэвалюцыі», чыесьці агрэсіўныя фізіяноміі, поўная адсутнасьць агульных плянаў (каб схаваць паўтара мільёна мітынгоўцаў), потым зноў нейкае лямантуючае быдла ўшчыльную, потым нейкі «паліттэхноляг зь Юшчанкавага штабу» аўтарытэтна расказаў, што аранжавы колер мінулай вясной прыдумаў нехта Сорас (а чаму б ня Чэрчыль у 1918-м, хацелася мне крыкнуць), потым зьявіўся хлопчык з абсалютна какаінавым позіркам, які бяз хітрыкаў выклаў усё як яно ёсьць са студэнцкімі падрыўнымі арганізацыямі — і структуру з «сотнікамі» ды «дзясятнікамі», і прынцыпы фінансаваньня (ад таго ж Сораса), і тактыку прарыву міліцэйскіх загарод — і ўсё гэта на фоне відэараду з палявымі заняткамі нейкіх парамілітарных вусатых мужычышчаў, невядома дзе, калі і кім адзьнятых, гэта значыць яўна імпартаваных зь нейкай іншай опэры, прыднястроўскай хіба.

Тут я ўзбунтаваўся і папрасіў гаспадара дому выключыць Гэбэльса нафіг, што ён і зрабіў. Але асадак, як кажуць у вядомым анэкдоце, усё роўна застаўся.


АРЦЁМ ЛЯВА

## Вівісэкцыя

Грэх расейскай дэзінфармацыйнай махіны заключаецца ня толькі ў тым, што яна мэтанакіравана працавала на разьяднаньне братэрскай (я ня кплю) краіны, старанна ўвасабляючы ў жыцьцё выпрацаваную паводле расейскіх жа тэхналёгій альтэрнатыву «тэрытарыяльны раскол ці грамадзянская вайна».

І ня толькі ў тым, што для дасягненьня гэтай мэты яна ня грэбавала дробным махлярствам з дастаткова, зрэшты, небясьпечнымі вынікамі — калі, напрыклад, вымаўленыя Юшчанкам словы пра тое, што ён «гатовы стаць перад данецкімі шахцёрамі на калені», сынхронна перакладаліся на расейскую такім чынам, што ён «гатовы паставіць данецкіх шахцёраў на калені».

Але гэтая ж махіна — а празь яе і ўся афіцыйная Расея — грэшная яшчэ і перад уласнымі грамадзянамі, перад сваімі ж расейцамі тым, што па-савецку тупа пазбавіла іх абʼектыўнай інфармацыі пра тое, што адбывалася ў нас, і тым самым — ні больш і ні менш — ізалявала іх ад рэчаіснасьці.

Ну чаму расейскія рэпартажы з рэвалюцыйнага Кіева ў лістападзе 2004 году так да болю нагадвалі савецкія тэлезводкі з Прагі 1968-га ці Гданьску 1980-га?

Няўжо сьвет так і стаяў на месцы на працягу ўсіх апошніх 30—40 год?

Няўжо расейцам і сёньня можна пхаць і ўбіваць у мазгі ўсе гэтыя сусьлаўскія мэсыджы пра «амэрыканскія грошы», «замбаваных малойчыкаў» і «нацыяналістычны шабас»?

У выніку ж адбылася адна даволі жорсткая штука. Дзякуючы аранжавай рэвалюцыі ўвесь цывілізаваны сьвет даведаўся пра Ўкраіну нешта вельмі важнае і процілеглае таму, што ведаў пра яе раней (а ведаў ён — калі ўвогуле што-небудзь ведаў, — што гэта нейкая зона шэрасьці, маркотная і панылая, якой кіруюць некалькі постсавецкіх падонкаў).

> Да стварэньня «процівагі Захаду» прыклалі руку і Садам, і Кадафі, дый любы афрыканскі людажэр. І ці моцна гэта дапамагло ім?

І раптам аказалася, што гэта прыгожая аранжавая краіна, у якой мноства свабодных людзей, і яны вельмі прыгожа, свабодна і аранжава перамаглі шэрае постсавецкае зло. Таму ўсё найлепшае, што жыве і дыхае ў цывілізаваным сьвеце, падтрымала і палюбіла Ўкраіну.

Яна раптоўна і трывала ўвайшла ў моду, у самыя што ні ёсьць цэнтры прыцягненьня, і ўсе гэтыя «заходнікі» цяпер едуць сюды натоўпамі, здымаюць фільмы, пішуць рэпартажы і ўлюбляюцца.

І толькі расейскія браты ніякай праўды пра ўсё гэта ня ведаюць і ў лепшым выпадку пакрыўджана маўчаць, а ў горшым — злосна па-жырыноўску лаюцца. І мне робіцца невыносна шкада іх — такіх пазбаўленых рэальнасьці, такіх адзінокіх у сваёй пакрыўджанасьці, такіх чужых на эўрапейскім сьвяце жыцьця.

## Рэкалекцыя

Часамі мне настолькі шкада іх, што я нават і не пытаюся «Хто вінаваты?».

З гэтым як бы ўсё зразумела — вінаваты тыя, хто вырашыў, што раз Украіна для Расеі «акно ў Эўропу», то трэба б яе шчыльней ад Эўропы адбарыкадаваць. Гэта значыць заглушыць гэтае акно к чортавай маццеры, каб ня лезьлі.

Але куды важнейшае пытаньне пра будучыню — і нават ня «Што рабіць?», а «Кама градзешы?».

Тое, што Ўкраіна свой эўрапейскі выбар ужо зрабіла і «градзешы» ў Эўропу, для мяне цяпер па-за ўсялякімі сумненьнямі. Расея ж ад пачатку і традыцыйна з нагоды Эўропы высакамерніча і па-ранейшаму спрабуе зьвязаць вакол сябе нейкую ваеннапалітычную супольнасьць постсавецкіх дыктатараў для нейкай новай звышдзяржавы.

Навошта? А гэта ўжо па-за сфэрай рацыянальнага — проста так, для процівагі хіба, каб Захад не выпендрываўся, а калі ўсё-такі патрэбна фармулёўка больш-менш інтэлігентная, дык вось яна: для мнагаполюснасьці сьвету.

Таго, да стварэньня якога ўжо прыклалі руку і Садам, і Кадафі, дый любы афрыканскі людажэр. І ці моцна гэта дапамагло ім?

Ах, годзе табе, Расея! — так і хочацца мне ўсклікнуць клясычнымі радкамі. Я ведаю, што розумам цябе не зразумець, і нават люблю цябе за гэта, але розум, а дакладней здаровы сэнс, таксама ж часам ня лішні. Разьбярыся ў сабе, і зьбярыся занава, і знайдзі для сябе новы працяг. Дапусьцім, таго, чаго ты ўжо дасягнула ў 1991-м, — свабоды. Адкапай яе, гэтую свабоду, аднекуль са сваіх патаемных грамадзянскіх схованішчаў! У цябе павінна ўдацца, я ведаю.

Бо вельмі ж хочацца нармальна жыць па-суседзку, езьдзіць адзін да аднаго ў госьці бязь віз і размаўляць пра мастацтва.

Але каб такая размова ў нас нарэшце склалася, Расеі патрэбен пераварот. У тым ліку і так званы капэрніканскі — з тых, якія выражаюцца ў імкненьні бачыць, чуць і разумець па-іншаму. Ці, скажам, у здольнасьці разглядзець ва Ўкраіне нешта большае, чым радзіму сала, таннай працоўнай сілы, ліміты, нелегальных гастарбайтэраў, гарылкі зь перцам, фрыкатыўнага з прыдыханьнем «г» і паўднёвага акцэнту з «шоканьнем». І нават нешта большае, чым увесь гэты дарэшты здрахлелы комплекс Сьвятой Русі, славянскага адзінства, праваславія, чаяпіцця, рукаблудзія, чынапачытанія і сусловія.

Але для таго, каб разглядзець ва Ўкраіне нешта большае, чым наборы падобных стэрэатыпаў, нешта новае, аранжавае і свабоднае, Расеі неабходна ўпершыню паглядзець на яе зь непадробнай і бесстароньняй цікавасьцю.

А для гэтага, напрыклад, для пачатку перакласьці (але добра перакласьці!) і прачытаць дзясяткі ўкраінскіх паэтаў, а потым яшчэ дзясяткі празаікаў — каб ведаць нас настолькі ж добра, наколькі мы ведаем вас.

А то ж уся надзея застанецца толькі на гарэлку. Вельмі ненадзейная, па-мойму, надзея.

**СП, паводле «Українських новин»**



**ЮРЫ АНДРУХОВІЧ** (нар. у 1960) — адзін з самых папулярных украінскіх літаратараў. Сузаснавальнік літаратурнага абʼяднаньня «Бу-Ба-Бу», зь якога пачалася пасьлясавецкая ўкраінская літаратура. Аўтар дысэртацыі аб творчасьці Багдана-Ігара Антоніча. Віцэ-прэзыдэнт Украінскага ПЭН-цэнтру. Раман Ю.Андруховіча «Маскавіяда» ў перакладзе Андрэя Хадановіча друкаваўся ва ўкраінскім нумары часопісу «Arche» (2001. № 5).

## Сяржук Абрамовіч

ПАРАЎНАНЬНЕ З МУХАЙ

У маім пакоі муха
Б'еца ў шыбу і зьвініць.
Я — адзін. Адчай і скруха
Не даюць спакойна жыць.

Ім няма канца і краю,
І ў жыцьці мне ўсё назло.
Можа, сьмерці я жадаю?
Бачу: муха б'еца ў шкло.

Сьвет пануры, сьвет нямілы.
Муха рвецца да сьвятла,
Я ж імкнуся да магілы,
Каб яна мяне ўзяла.

Сіла волі... Сіла духу...
Я ня меў ніколі іх.
Бачу муху, чую муху,
Сам жа — зьнік я, сам — заціх.

## В.Барташэвіч

ВЫБАР

Тут побач заўжды зь беларусам
Жылі у спрадвечным хаўрусе
Палякі, габрэі, татары,
Расейцы — ў адзіным абшары.

Ды толькі жыцьцё не бясконца —
Закоціцца некалі сонца,
І трэба ў вечнасьць зьбірацца,
З жыцьцём і людзьмі разьвітацца.

І вось беларус выбірае,
Нібыта між пеклам і раем, —
Дзе ж скласьці яму свае косьці?
На гэтым ці іншым пагосьце?

Блукаючь, шукаюць прытулку,
Ня даўшы сабе паратунку,
Габрэйскія душы-прывіды,
На могілках з зоркай Давыда...

На польскіх — асаднікаў зграя
«Крэсоўца» на дух не прымае.
Хаця «беларус — паляк малы»,
Ды лёс яго вельмі няўдалы.

А мо між татараў прылегчы,
Каб шлях свой у вечнасьць аблегчыць,
Ці быць між жыдоў пахаваным —
Але ж нават не абразаны...

Ёсьць могілкі і іншаземцаў —
І швэдаў курганы, і немцаў.
Вядома, шмат могілак рускіх,
Ды толькі няма беларускіх.

Так думае ён, разважае —
За што ж яго доля такая?
Ляпей бы хадзіў у сынагогу,
Мо б вымаліў ласку у Бога.

Відаць, давядзецца з «братамі»
Спачыць, можа дзе й пад платамі,
Затое ж ад Воршы да Слуцку
На помніках надпіс па-руску!

## Мікалай Бельскі

ПАВОДЛЕ ЗЬВЕСТАК
У ДЗЯРЖАЎНЫХ СМІ

Жывём мы зараз нібы ў раі.
А як на справе, дык турбуе вось
чагосьці:
Нішто і кажуць хораша аб тых, хто
на пагосьце.

## Алесь Губін

* * *

Шукаю леташняга сьнегу...
Ён дзьмухаўцамі паляцеў
Ў старонку цноты й белай глебы,
У край нятоптаных начэй.

Рахманай іскрай ў завушніцах
Падараваў халодны бляск
Пад скрогат промняў-аканіцаў
На пераворaных ральлях.

Юрлівай векшаю-вясёлкай
Павіснуў сьмехам на гальлі,
Заскокнуў ягадай ў кашолку
І частаваў ўсіх, хто былі.

Дзівосных пчолаў карагодам
Каўзнуў на цёплую траву.
Напоўніў ўмах лазобкі мёдам,
Завеяў ёлкую журбу.

Мігцеў утульнаю газьніцай
На месяцовым ліхтары
І, згасшы срэбнаю дзяньніцай,
Зямлю пакінуў да пары.

У край ядлоўцавых паветаў
Імчу на крылах дзьмухаўцоў.
На завушніцах жоўтых лета
Вітаю сьнежных малайцоў.

## Юзік Дзенісюк

* * *

Хачу быць дэпутатам
У кішэннай палаце —
Неблагая аплата,
І ў сталіцы пры хаце.

Можна быць глухаватым,
Сьлепаватым парою...
Тыч у похву мандатам,
Дыківай галавою.

А калі закімарыш
Пасьля добрай гулянкі,
Адмандацiць таварыш
Ці твая каляжанка.

Можаш нават ня ведаць
Сваёй роднае мовы.
Лай «трасянкай» суседа,
Шпар расейскай прамовы.

А якія ваяжы
Ў сьвет далёкі-нябліскі!
Ніхто слова ня скажа —
Пры гарэлку валізкай.

Калі ўчуеш паразу
Ды з даверам трывожна —
Як патрапіць, падкажа
Рэжысэр з-пад Лёзна.

Ён і сее, і косіць,
А ў стратэгіі — дока.
А натоўп як папросіць,
Можа стаць і Прарокам.

Калі буду з мандатам,
Будзе доступ да Цела...
Там, глядзіш, дыпляматам
Пафарсіць закарцела...

Ты, палітыка-дзеўка,
Сёньня любіш і грэеш,
Заўтра — шал-неспадзеўка —
Ўжо з другім палымнееш.

І ваяжы — прапалі...
І сяброў — ані блізка...
Як Садам, у падвале,
Побач грошай валізка.

## Мікалай Ільючык

* * *

О мая Беларусь!
Ты найлепшая ў сьвеце краіна.
Сінь тваіх васількоў
Асалоду дае для душы,
І дзівосных азёр і крынічак
Зь сьцюдзёнай вадою,
І лясоў тваіх шэпат
У спрадвечнай цішы.

Бачу я, як асілкі-дубы
Абдымаюцца зь небам.
Чую птушак сьвяточны
Прыгожы і звонкі расьпеў.
І калосіцца ніва,
Налітая будучым хлебам.
Тут праходзіць жыцьцё
Працавітых і добрых людзей.

Колькі вынесла ты
Векавое варожай навалы!
Колькі слаўных сыноў
Палягло на сьмяротных палях.
І цяпер небясьпечны
Чарнобыльскі ядзерны попел
Ты нясеш на сваіх
Ўжо зусім не шырокіх плячах.

Што ж, калісьці настане мне час
Разьвітацца з табою.
Я душою да Бога пайду,
Ну а целам — ў зямлю,
Дамавіну пакрыеш маю ты
Пясочкам ці глебай сваёю,
А душу ты адпусьціш
Ў нябёсную сінь, у вышыню.

Я вярнуся к табе
Паглядзець на тваё навакольле,
Зіхацючай расой
Упаду ранiцой на траву,
Спорным летнім дажджом
Абуджу навакольле
І прыгожаю кветкай
На полі тваім зацьвіту.

## Сяргей Кульбіцкі

САКАВІК

Сакавік на парозе ўзыходзіць —
І вясна у наш край надыходзіць.
Гэта час успамінаў, каханьня
І тужлівага спадзяваньня,
Што адбудзецца зноўку сустрэча,
Як калісьці, мінулай вясной,
І сканае у сэрцы пустэча,
І ты зноў будзеш побач са мной.

Сонца грэе і ласкава сьвеціць,
Быцам промні тваіх вачэй.
Чаму ж зьнікла раптам ты, Сьвецік,
Ў цёмнай бездані новых начэй?
Не забыць мне цябе ўжо ніколі,
Буду зноў ды ізноў ўспамінаць.
Думка й кветка тужлівая ў полі...
Ну дык як гэту думку прагнаць?

І маленькі блакітны букецік,
Што над ложкам маім ўсё вісіць,
З кветак, што падарыў табе, Сьвецік,
Ў сэрцы полымкам больна гарыць.
І трывожаць мяне успаміны
Пра былыя пра нашы часы,
Калі быў я, здаецца, шчасьлівым
І была мо шчасьлівай і ты...

## Сяргей Макарэвіч

НА ЧОРНЫХ ЛЯДАХ

Нагадайце дзецям сваім
Пра паўстаньне на Слуцкай зямлі.
Нагадайце вы ім аб былым:
Ўсіх забілі там бальшавікі.

Давядзіце ў касьцёлы і цэрквы
Ды пастаўце сьвечы памерлым.
Слуцкі збройны чын быў ня «белым»,
Не «чырвоным», а чалавечым.

## Аляксандар Назараў

АПОШНІ

Там, дзе Нёман хвалямі цячэ ў Нямунас,
Дзе некалі аблавай зубра біў ліцьвін,
Прадстане прад вачыма найдзіўнейшы
малюнак:
Дубок на беразе стаіць, асілкам
пабрацім.

Была на месцы тым найгожая дуброва,
І кожны, хто з Навагрудка у Вільню
праязджаў,
Стаяў ля веліканаў, ня мог прамовіць
слова,
Сваю нікчэмнасьць прад прыродай
заўважаў.

Там Гедымін каня паіў вадою
І Вітаўт з Гайлам у паходы праязджаў.
Там верш складаны дзіўнаю рукою
Паэт Міцкевіч трыраз закладаў.



WORLDPRESSPHOTO.NL

**Партфоліё алімпійскіх гульняў. Фота Дональда Мірэля (ЗША). 2-е месца фотаконкурсу World Press Photo 2005.**

Прайшлі часы, зьмяніўся сьветапогляд,
Народ да дужага зьвярнуўся ў бок;
Адны дубы, як той літоўскі волат,
Да здраднікаў ня зробяць нават крок.

Ад рук людзкіх загінула дуброва,
Адно стаяць, нібы пасьля пажару, пні.
Зялёную сарвалі зь іх карону,
Загінулі асіны ў веку цьмы.

Але сярод нямогa поля
Апошні зь іх стаіць дубок.
Малы яшчэ, ня можа крыкнуць слова,
Але калыша вецер ў лісьці жалудок.

І чутна, як ціха, пяшчотна вада
Цалуе ля Замку сівыя граніты.
На кручы Каложа ў задуме адна
Маячыць, бы прывід, смугою спавіты.

Ёй сьняцца абрысы паўстанцкіх магіл,
Прад ёю ўзьнікаюць сыноў сылюэты —
Давыд Гарадзенскі, наш Быкаў Васіль,
Кастусь Каліноўскі, Карпюк Аляксей,
паэты...

Яны адышлі на свой вечны пакой.
Застылыя сэрцы пакінулі біцца.
А крэпасьць Гароднія ўсім сэрцам,
душой
Ў сьвятынях сваіх будзе вечна маліцца.

## Sanny Dragonfly

ПАРАСОНЬНЕ*

«Ён ня прыйдзе», —
стук у скроні.
Трэці тыдзень
Парасоньне.
Ты ірвеш каштанаў квецень
І маё непаўналецьце.
Вусны тояць непакору:
Я — вядзьмарка-дзеўка;
Ты парушыў прынцып «мора»
Неспадзеўкі.
Як абрыдзе —
З падаконьня.
Трэці тыдзень
Парасоньне.
У маю сьвятую неруш
Я паверу, ты паверыш.
Не хапае шакалядкі
На гармоны шчасьця.
Не цалуй мае лапаткі —
Крылам засьціць.
Я і ты —
Дзесь у азоне...
Трэці тыдзень
Парасоньне.

* Парасоньне — гэта надвор'е, калі дождж то ідзе, то не ідзе і ўсе ходзяць з парасонамі, апроч мяне і цябе.

## Алесь Сушчэўскі

* * *

Плача восенькі сад, dėja vu
абрыкосавых пахаў.
Ненадзейная моц спадзяваньняў вясны.
Адпіхні неспакой. Нелірычна пашлі яго
«на...» —
Не патрэбныя мары ў стэрыльны
пэрыяд зімы...
Ачышчэньне агнём атрымае нявечнае
лісьце.
Першай кропляй вады распаловіцца
шкло.
Адпіхні небасхіл — вось адзінае, вернае
выйсьце —
Што празрыста (упоперак кроплі)
паловіць акно.

## Апанас Цыхун

БАЛЯДА ПРА НАШ ГОРАД
ГАРОДНЮ

Над Нёмнам блакітным, у ліпах, дубах,
Бы стужкаю, лесам спавіта,
Фарпостам, Гародня, стаіш ты ў вяках —
Славутая крэпасьць з граніту.

## Мікола Яўмененка

КУДЫ ЦЯБЕ ЦЯГНЕ?

Натоўп нехлямяжы, маўклівы, саўковы,
Зьвяртаюся я да такога цябе:
«Куды цябе цягне? Падумаць жахліва!
Няйначай назад у саўковы сабес».

Але там няма й больш ніколі ня будзе
Халяўнай мазуты і газу табе.
Замерзьнеш зімою ў сваёй халабудзе
І не дапаможа жабрацкі сабес.

Расеі такі ты зусім не патрэбны.
Халяўшчыкаў там і сваіх — гаць гаці.
Заўсёды маўклівы, у вопратцы
зрэбнай,
У гумавіках пад ёю будзеш хадзіць.

## Сяргей Ясенін

ПЕРАКЛАД
МІКОЛЫ АЛЕКСІЧА

* * *

Каля бяроз і ліпаў,
Дзе ў кветках падаконьнік,
Бязьлітасна усыпаў
Ваколічны гармонік...

Няма яму запінкі...
Навошта гэты сьпех?
Там завушніц ільдзінкі,
Тут звонкі сьмех.

Сама ушчэнт прывабная,
А я няўмела грубы,
Бо цалаваў нязграбна
Малінавыя губы.

Там звонкія ільдзінкі
Панёс расталы сьнег,
Праталінкі-радзімкі
Я палюбіў на грэх.

Другая закаханая,
Забудзь усё, забудзь,
Душа мая, загнаная,
Пабудзь са мной, пабудзь.

У ракавай расплаце
Удача ўсё радзей,
Каб ты ў сьмяротнай страце
Ня вырвалась з грудзей.

Далёкае, пяшчотнае,
Зь вяснушкамі на твары,
Каханьне мімалётнае, —
Ці варта жыць у мары?

Ці варта згадваць сьціплы
У кветках падаконьнік?..
Неўратавальна сыпле
Ваколічны гармонік.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Эрагенныя зоны гораду Г.

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ

## «Победи Ярополк Всеслава у Голотичьска»

Галацічаск — прывідны горад, лякалізаваны толькі на старонках летапісаў і ў фантазіях навукоўцаў. Апошнім часам, ня могучы адкаснуцца ад насланьня ірацыянальнасьці, ты ўсё больш і больш схільны бачыць у летапісным Галацічаску родны Гомель. Так і ўяўляецца глухаваты кіеўскі манах, які трохі не дачуў і занатаваў абы-што, каб нядбалы перапісчык перакруціў тую *абыштоську* яшчэ мацней. Першая згадка пра Менск распавядае пра яго разбурэньне. Першая згадка пра Гомель прыхавала Гомель у *непамятках*. Гэтыя *непамяткі* перасьледуюць гамельчукоў дасюль, і тыя проста вымушаныя ўсюды мудрагеліць, набіваючы сабе ўяўную цану.

## Вальтэр рэклямуе

Рэклямнікі часьцяком перабіраюць меру. То ў плюгкасьці, то ў арыгінальнасьці. У гомельскіх рэклямных блёках міжволі спатыкаешся аб спасылку на Вальтэра, які нібыта раіў прыхільнікам белага і чырвонага піць, але не запіваць. Гэта французскі мысьляр эпохі Асьветніцтва сказаў пра французскае віно. А наш такі свойскі і міленькі ролік рэклямуе напоі тутэйшага вінзаводу. Калі б цытавалі Някляева, яшчэ можна было б зразумець: кожнаму сваё лёсу вастрыё. Ну а Вальтэр… Дзіва, што за Эклезіяста не ўзяліся.

Канчаткова сваімі мудрошчамі вінзавод дабіў па-за тэлеэтэрам. Ён у нас мала не ў сярэдзіне гораду месьціцца і ў пэўнай сваёй частцы плотам неабстаўлены. Ад ходніка да заводзкае сьцяны ўсяго адзін скок любога выдатніка па фізкультуры. І вось ля ходніка зьявіліся колькі невысокіх — цяляці па прычыннае месца — слупкоў з шыльдамі. Здалёк нагадвае папярэджаньне пра падземны электрычны кабэль. Ды зблізку ты ўбачыў няхітрую прыпіску: «ОХРАННАЯ ЗОНА. 2 м» і незнарок крутнуў галавой па баках, ці нямашака паблізу якіх-небудзь людзей з аўтаматамі Калашнікава, што пільнуюць твой крок. Пашанцавала. Пашанцавала і другі раз, калі ўбачыў надпіс, адрэдагаваны чорным маркерам нязнанага жартаўніка: «ЭРОГЕННАЯ ЗОНА. 2 м». Прывітаньне Вітаўту Чаропку.

## Брунэтка зь цёмным

Псэўдазімовы real-панядзелак. Мярзотнае раньне. Дыбаеш на працу. Паперад цябе — імклівая жаночая постаць. Пад смоль фарбаваная брунэтка ў прыталеным палітоне з дарэмна высокім разрэзам сьпехам расьсякае ранішні этэр, трымаючы між указальным і вялікім пальцамі правае рукі 0,5 цёмнага піва. Ідзеш на абмін, абы толькі зірнуць на ейны твар. Зірнуў. Пладова-ягадная незнаёмка з палотнішча Хруцкага, якая ночку бавіла на нейкай карціне Босха. Не спатрэбілася быць ані Шэрлакам Холмсам, ані Вільгельмам Баскервільскім, каб зразумець, што жанчынка бязьмерна ігнаруе і чырвонае, і белае на карысьць гаркавай беленькай. «Умыла ся водкаю цудную ліцэ і рукі», як пісаў далёкі продак.

## Сымон-дакука

На пытаньне, хто твой самы нелюбімы беларускі музыка, ты ня змог бы адказаць проста. І не з прычыны баламуцтва ці пазэрства. А адно таму, што ня ведаеш, як завуць таго пеюна й гітарыста, які дае канцэрты ў падземным пераходзе ля ўнівэрмагу — цёзкі нашага ардэнаноснага гораду. Кожны твой спуск пад зямлю, як пах дусту ці дымавое шашкі, сустракае ягоны «ціпа рокавы» вакал. Нярэдка побач мітусяцца памочнікі (пасэсійныя музыканты?) з шапкамі заміж інструмэнтаў у руках. Усе маладыя. Усе пяюць нешта расейскае, як сама Масква, і філязафічнае, як пракіслае ў пакунку малако. Але ж спыняюцца месьцічы, кладуць у шапкі свае малакроўныя грошы, просячы: «Давай нашу, вот эту». І ліецца хваляй песьня пра піцерскі дождж. *Ось вона, діти, слов'янська психоделічна душа!* Музыка, музыка… Сымон-дакука табе імя.

## Мапы, рысі ды крыжы

У падручніку для першаклясьнікаў «Мая Радзіма — Беларусь» ёсьць мапа нашае краіны з гербамі абласных цэнтраў. А мамкі мае родныя! Ці ня час гомельскім уладам дэмантаваць усіх геральдычных і манумэнтальных рысяў, якія цягам апошніх гадоў атабарыліся ў горадзе? Рэч у тым, што на памянёнай мапе Гомель аздоблены чырвоным шчытом зь белым крыжам. Гэта адна з рэканструкцый гарадзкога герба 1560 г., які быў падораны Гомелю адмысловым прывілеем Жыгімонта Аўгуста і ад якога тутэйшы магістрат цяпер адхрысьціўся на карысьць дзікіх котак часоў Кацярыны II.

## Абялечваньне маладзенцаў

У аўтобусе кандуктарка бярэ плату зь дзяўчынкі. Тая падае ёй грошы на льготны квіток. Кабета зь недаверам рэагуе: «Студзенчаскі прад'явіце». У дзяўчынкі пакруглелі, як пяць талераў вялікалітоўскіх, вочы, і яна, ушчэнт зьбянтэжаная, вымавіла: "Я ж у пятую клясу хаджу». Малая сапраўды з росту была немалая, але ж ня ўбачыць зусім дзіцячага твару трэ' было вельмі прымудрыцца. «Па вам ня відна», — кепска апраўдваючыся, кандуктарка пайшла «абялечваць» іншых.

## Міністравы мэрыдыяны

У спадзеве на цуд спрабуеш выглядзець у шапіках новы нумар «Arche». Яго нідзе няма. Аднак абычас, як падлючаяназола, на вочы трапляецца *нешта сіняе,* падобных да ўлюбёнага часопісу памераў. Першая здагадка, што перад табой «Беларуская думка», адлятае ў якуцкі вырай. На вокладцы красуе: «Сибирские меридианы. Гиблое место». Вобразы краявідаў, мілых беларускаму міністру праўды. Зрэшты, гэта ўжо мудрошчы ўсебеларускага маштабу.

АДАМ ГЛЁБУС



# Сучасьнікі

## 2004. Акудовіч і Разанаў

Валянцін Акудовіч 2 лютага 2004 году выдаў кніжку «Разбурыць Парыж». Радуюся, калі нехта нешта выдае на тутэйшай мове, яшчэ большая радасьць ахоплівае, калі выдадзенае па беларуску чытаецца і абмяркоўваецца. Валянцін належыць да тых выдавальшчыкаў белтэкстаў, каго не абмінае чытацкі рэзананс. Пра Валянціна гавораць, спрачаюцца, яго цытуюць. Акудовіч ёсьць, і ён — жывы. Каб адбыцца і быць, Акудовіч зрабіў парадаксальны ход, напісаўшы працу «Мяне няма». Каб заставацца жывым, ён увесь час гаворыць пра сьмерць: «Літаратура — гэта велічны саркафаг з муміямі жыцьця, а кожны літаратар — найперш муміфікатар. Таму калі нашыя вусны варушацца над тэкстамі Гамэра, Джойса ці Алеся Разанава, гэта яны варушацца ад пацалункаў нябожчыкаў (у апошнім выпадку яшчэ не зусім астылых)…» Калі пра стваральнікаў Адысэя з Улісам і можна так сказануць, дык пра жывога Разанава няможна. Паміж сьветам жывых і сьветам мёртвых ёсьць мяжа, дакладная і выразная. На могілках яе пазначаюць датай. 2.02.2004 Алесь Разанаў быў жывы, гэта дакладны факт, пра які ведаў і Валянцін. У прыродзе не існуе крышку мёртвых і трошкі цяжарных. Таму я не прымаю параўнаньняў літаратуры з саркафагам і літаратара з муміфікатарам ці якім таксыдэрмістам. Стваральнікі птушыных пудзілаў і чалавекаабрысных мумій належаць да касты навукоўцаў, а не да цэху літаратараў; прынамсі, так было да 2.02.2004.

*Напісана 10.11.2004, 16:45.*

## 2004. Бэрж'е і нябачнасьць

Літавантурыст Жак Бэрж'е казаў, што стаць нябачным вельмі проста: можна знайсьці рэцэпт эліксіру нябачнасьці ў «Кнізе Тота», а можна зрабіцца нябачным, правільна вымавіўшы: «Ol sonuf vaorsag goho iad balt, lonsh calz vonpho. Z-ol ror I ta nazps!» На мой розум, усё яшчэ прасьцей. Каб стаць нябачным, трэба не зазіраць у люстэрка.

*Напісана 11.11.2004, 14:45.*

## 1968. Стральцоў і імя

Сябры клікалі Міхася Стральцова Michel, а жонка — Миша.

## НОВЫЯ КНІГІ

**Лебедзева В. Пуцявінамі змаганьня і пакутаў: Палута Бадунова.** — Менск: Тэхналёгія, 2004. — 71 с., 9 арк. іл.; партр. — (Нашы славутыя землякі). 500 ас.

Папулярны бібліяграфічны нарыс пра адну зь лідэрак нацыянальнага руху першай паловы XX ст. Палуту Бадунову.

**Лукашук А. Прыгоды АРА ў Беларусі** / Рэд. А.Вячорка; Маст. Г.Мацур. — Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2005. — 500 с., іл.

Кніга прысьвечана дзейнасьці ў Беларусі дабрачыннай арганізацыі «Амэрыканская адміністрацыя дапамогі» ў 1920-х гадах.

**Маніторынг парлямэнцкіх выбараў і рэспубліканскага рэфэрэндуму ў Рэспубліцы Беларусь. 2004 год.** — Менск, 2005. — 152 с., 1000 ас.

У кнізе выкарыстаны зьвесткі, сабраныя палітычнымі партыямі, грамадзкімі аб'яднаньнямі, кандыдатамі ў дэпутаты ды іх перадвыбарнымі штабамі і інш.

**Шлях да аб'яднанай Эўропы. Досьвед Сярэдняй Эўропы і беларуская пэрспэктыва: матэрыялы міжнароднай канфэрэнцыі.** — Менск, 2004. — 92 с. 299 ас.

**ЭўраБеларусь. 2004. № 1.** — Менск: Беларускае шуманаўскае таварыства, 2004. — 58 с. 200 ас.

Тэма сыгнальнага нумару — усходняя палітыка Польшчы і ЭЗ, эўрапейская палітыка Беларусі.

**Сяргей Лескець**

# Лагойскі Гарміш-Партэнкірхен

## Як задарма адпачыць у Сілічах і застацца жывым

Гара ў Сілічах — лысая, з хваёвым каўняром вакол белай макаўкі. Але замест вядзьмарак зь яе зьлятаюць лыжнікі ды сноўбардысты. Калі глядзець на гару зьнізу, здаецца, што яны валяцца ўніз з самых воблакаў: укрытыя сьнегам схілы зьліваюцца зь небам. Аднак кіраваць лыжамі — гэта вам не на мятле лётаць. Таму нярэдка спартоўцаў-аматараў завозяць у мэдпункт на выратавальным сьнегаходзе. Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

«Усё гара праглынула!» — сплёўвае на сьнег мужычок зь Нясьвіжу, які прыехаў у Сілічы, каб будаваць сваяку хату. «Жывуць тутака, мажа, тры-чатыры чалавекі. Астатняе ўсё — дачы. Набыць тут дом? Ды дзе ж набудзеш! Ля горкі Лукашэнка ўсю зямлю забраў. А там, дзе ён узяў, больш ніхто ня возьме! Вунь, ля горкі яны й будуць будавацца», — махае ён рукой на засьнежанае поле перад самым схілам, тушыць цыгарку ды шыбуе напрасткі па шашы да вёскі.

Сілічы жывуць прадчуваньнем вялікіх грошай. Яны яшчэ не абрынуліся на гэтае паселішча — тут яшчэ няма будынкаў у стылі «Мірскі Замак-міні», як і прыватных пансіёнаў для курортнікаў з блізкай сталіцы, — але ўжо зьяўляюцца пакрытыя новай дахоўкай утульныя дамкі з ладна абгабляванага бярвеньня-кругляку.

За дзень адпачынку ў Сілічах — калі браць па максымуме, з катэджам ды інструктарам, рэстаранам і г.д. — можна выкінуць і трыста даляраў. Але стандартны варыянт такі: заправіць аўто, каб хапіла на 60 кілямэтраў (шлях да Сіліч і назад у Менск), заплаціць тры тысячы за паркоўку, пад 30 тысяч за пракат абсталяваньня і столькі ж — за «скі-пас» (білет на пад’ёмнік). Плюс пакінуць тысяч пяць на падагрэтыя ў мікрахвалёўцы хот-догі ды каву. Па патрэбе — 16 тысяч за гадзіну навучаньня з інструктарам у групе. Карацей, нясіце ў абменьнік даляраў пяцьдзясят.

Але людзі абазнаныя ўмеюць адпачыць у Сілічах па зусім пралетарскіх цэнах. У вас ёсьць уласны камплект рыштунку (найчасьцей патрыманы)? Цудоўна, выдаткі на пракат адпадаюць. Няма? «Ага, глядзі — возьмем камплект лыжаў на дваіх ды мяняцца будзем!» — прапануе муж жонцы, разглядаючы цэньнік ля касаў. Ехаць на аўто зусім не абавязкова — можна сесьці на аўтобус, што ідзе праз кожную гадзіну акурат да Сіліч з Маскоўскага аўтавакзалу (2680 рублёў, правоз лыжаў бясплатны). Калі народу шмат, варта браць «скі-пас» не на час, а на колькасьць пад’емаў (1 раз — 2 тысячы) — ня страціце грошай, стоячы ў чарзе. А некаторыя схілы — прынамсі, той, што пачынаецца адразу насупраць пункту пракату, — цалкам прыдатныя для таго, каб, не замінаючы іншым, падняцца ўгару на сваіх дваіх. Падлеткі-сноўбардысты, што ўвесь час тут ашываюцца, бы вераб’і, менавіта так і робяць. Кажуць, часам кампутары ля пад’ёмнікаў «падвісаюць», і ўгару можна праехацца бясплатна. У рэстаран ніхто за руку ня цягне, у туалеце хоць і бракуе паперы, але ж ён бясплатны ды даволі чысты. Каб папоўніць спэктар уражаньняў, можна паспытаць цюбінгу — разок пракаціцца на камэры з аўтамабільнага кола зь ледзяной горкі. Каштаваць гэта будзе 300 рублёў.

Праўда, жаданьне пракаціцца на дурніцу можа скончыцца блага, асабліва для тых, хто горныя лыжы бачыў толькі па тэлевізары, але вырашыў зэканоміць на інструктару. Рэдкі дзень у Сілічах абыходзіцца безь пераломаў ды вывіхаў.

У пакойчыку мэдпункту цесна — санітары схіліліся над хлопчыкам гадоў адзінаццаці, які ляжыць на насілках з забінтаванай нагой. Твар спужаны-спужаны. Над ім завіхаецца маці. «Пайшоў катацца адзін. Не дагледзела». Да ганка падрульвае старэнькі зялёны аўтобусік з чырвоным крыжам — відаць, з Лагойску.

«Бярыце інструктара, калі катацца ня ўмееце, — раіць Жана, мэдсястра мэдпункту. — А то тут і дзяцей адных адпускаюць». — «А частыя траўмы?» — «Ну, частыя…» — «Колькі ў дзень?» — «Ну колькі, колькі… Бывае. І на роўнай дарозе ўсялякае здараецца, а тут жа — такі экстрэмальны спорт». — «Кажуць, у вас тут чалавек загінуў?..» — «Не, гэта чуткі». — «Дык не было такога?» «Не, не было», — кажа Жана, паглядаючы ў акно. Аўтобусік з хлопцам ад’язджае.

Калі Лагойшчына — беларуская Швайцарыя, дык знаёмства зь ёю будзе няпоўным без падарожжа ў тутэйшы Давос — Лагойск. Калі вы не на машыне, датупайце да аўтобуснага прыпынку «Верагі» на аўтатрасе і дачакайцеся аўтобуса, які за 500 рублёў давязе вас да курортнага райцэнтру. Разьмешчаны на ўзгорках, нібы на гурбах сьнегу, гэты гарадок мае асаблівую аўру, якую ня здольны сапсаваць нават зачынены на рамонт будынак напаўразбуранага аўтавакзальчыку. Мясцовая дошка перадавікоў вытворчасьці гатовая прыняць партрэты заслужаных лыжнікаў ды сноўбардыстаў. Постсавецкіх кавярань абапал галоўнай вуліцы Савецкай надзіва шмат, ёсьць нават рэстарацыя «Лагожск», афармленьне — беларускамоўны кіч першых гадоў незалежнасьці. Тут табе і цэркаўка, і касьцёльчык, па засьнежанай вуліцы бегаюць сабакі ды каты. Алігархаў у Лагойску пакуль заўважана не было, але мясцовыя лыжныя схілы іх ужо чакаюць.

## СЬЦІСЛА

### Мірны ў тузіне найлепшых

У чэмпіёнскай гонцы 2005 году беларускі тэнісіст Максім Мірны падняўся ажно на 10 прыступак і цяпер займае 12-е месца, маючы 74 пункты. Так высока беларус яшчэ не падымаўся, а найлепшым ягоным дасягненьнем было 17-е месца паўтара году таму. Узьлёт адбыўся дзякуючы выхаду ў фінал турніру ў амэрыканскім Мэмфісе. Праўда, у фінале Мірны саступіў прадстаўніку Даніі Кенэту Карлсану — 5:7, 5:7.

У рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў-прафэсіяналаў, што вылічваецца па выніках апошніх 52 тыдняў, Мірны займае 36-е месца. Уладзімер Ваўчкоў — 175-е. Румыны, будучыя супернікі беларусаў па 1/8 фіналу Кубку Дэвіса, што пройдзе 4—6 сакавіка ў Брашаве, па выніках 52-х тыдняў маюць наступныя вынікі: Андрэй Павал — 24-ты, Віктар Ханэску — 82-гі, Разван Сабаў — 160-ты, Віктар Іяніта — 230-ты.

У індывідуальным рэйтынгу парных тэнісістаў Макс займае дзясяты радок.

### Едзем у Рэйк’явік

Супернікам мужчынскай гандбольнай зборнай Беларусі ў накаўт-раўндзе кваліфікацыі да чэмпіянату Эўропы будзе зборная Ісьляндыі. Так распарадзілася лёсаваньне 22 лютага. Абодва матчы пройдуць у чэрвені. Нагадаем, што ў сваёй падгрупе гадаванцы Спартака Мірановіча занялі другое месца, апярэдзіўшы Італію і Кіпр і прапусьціўшы наперад Вугоршчыну.

### Сумку трымай пры сабе

Міжнародная фэдэрацыя лыжнага спорту дыскваліфікавала на два гады беларуса Дзяніса Вараб’ёва, у сумцы якога былі знойдзены забароненыя прэпараты. Хоць выпадак здарыўся яшчэ пры канцы мінулага году на этапе Кубку сьвету ў італьянскім Вальды-Ф’емэ, адлік дыскваліфікацыі пайшоў з 19 лютага. Дзяніс прыйшоў на допінг-кантроль, а сумку з забароненым рэчывам (гармонам росту) пакінуў за дзьвярамі пакою. Тут яго і злавілі. У беларускай фэдэрацыі лыжаў кажуць, што Вараб’ёва банальна падставілі, тым больш памылкова: хацелі падкласьці допінг лідэру зборнай Сяргею Далідовічу.

### Пракаповіч будзе веславаць

Дэлегаты справаздачна-выбарнай канфэрэнцыі Беларускай фэдэрацыі веславаньня на сваім пасяджэньні аднагалосна абралі новага старшыню — ім стаў старшыня праўленьня Нацбанку Пятро Пракаповіч. Пракаповіч будзе адказваць за разьвіцьцё гэтага мэдальнага для нас віду спорту. Галоўны банкір краіны галоўнай сваёй задачай лічыць зрабіць акадэмічнае веславаньне масавым відам спорту. Цяпер застаецца накапаць у краіне каналаў.

### Шаўчэнку не шанцуе

Не пасьпеў форвард «Мілану» і футбольнай зборнай Украіны Андрэй Шаўчэнка ачуняць пасьля траўмы, атрыманай пры канцы студзеня ў матчы італьянскага чэмпіянату, як у мінулую суботу яму «папанцавала» на чарговую. Гэтым разам у матчы супраць «Кальяры». Ужо на 10-й хвіліне падчас атакі на браму суперніка Андрэю расьсеклі скулу. Украінскага нападніка адразу даставілі ў знакамітую мілянскую бальніцу «Niguarda». Адмыслоўцы зазначаюць, што папраўка зойме ад 15 дзён да месяца. Таму Шаўчэнка ня толькі прапусьціць прынцыповае нядзельнае дэрбі з «Інтэрам», але і пад вялікім пытаньнем яго ўдзел у матчы ў адказ 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў супраць «Манчэстэр Юнайтэд».

**Алег Раявец**

ЛІЧБАВАНКА



## Як разгадваць лічбаванку

Гэтаксама, як і крыжаванку, толькі замест словаў тут шэрагі лічбаў. Іх трэба падстаўляць у слупкі і радкі з адпаведнай колькасьцю клетак такім чынам, каб на перакрыжаваньнях лічбы супалі.

2-значныя: 36, 39, 56, 71
3-значныя: 100, 122, 128, 133, 136, 206, 212, 226, 236, 240, 334, 356. 385, 409, 426, 432, 433, 436, 438, 566, 615, 672, 875, 881, 969, 989
4-значныя: 2110, 6700, 6921, 8338, 9967
5-значныя: 10000, 12345, 21730, 25930, 28730, 30841, 32101, 32603, 35610, 36951, 38966, 41000, 41379, 50121, 60032, 66300, 94130
7-значныя: 1000099, 2034596, 2334560, 3098765, 6666666, 9876306
12-значныя: 613243447536, 738693081728
13-значныя: 3789408863903, 8883621100270



З. Лыбін — чытачы «НН». Ход чорных.

## ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ

Ход чытачоў: 7...Kb8-d7. Ход гросмайстра: 8. e2-e3. На думку сп. Лыбіна, чорныя ў дэбюце гуляюць занадта асьцярожна. «Многае вырашаць наступныя дзесяць хадоў», — мяркуе ён.

Запрашаем чытачоў быць больш актыўнымі: дасылаць ня толькі хады, а і камэнтары да іх.

Камэнтары можна пакінуць і на форуме сайту bychess.narod.ru. E-mail: nn@promedia.by («Kaiса»), SMS на нумар 754-04-53 да панядзелка, 19:00.

КАІСА

# Шляхам узаемнай перапіскі

12 лютага ў шахматным клюбе Беларускага дзяржаўнага тэхналягічнага ўнівэрсытэту адбылася Ўсебеларуская канфэрэнцыя шахматыстаў-завочнікаў. Старшынём Камісіі завочных шахмат на два гады зноў абраны Віталь Карніловіч, майстар ФІДЭ і віцэ-чэмпіён Менску 2004 г.

У Беларусі завочная шахматная гульня мае векавую гісторыю. Сто гадоў таму беларускія шахматысты адпраўлялі адзін аднаму лісты й паштоўкі. Цяпер завочныя шахматы ня зводзяцца да абмену паштовымі карткамі — можна гуляць і па тэлефоне, і праз электронную пошту. Чым і карыстаюцца ўдзельнікі II Кубку славянскіх краін, які распачаўся 1 лютага з ініцыятывы славацкай фэдэрацыі (капітан беларускай каманды з шасьці гульцоў — шахматны трэнэр Генадзь Рабчонак).

Завочныя шахматы — найбольш дэмакратычны від каралеўскай гульні. Іх сьціплай прывабнасьці падуладныя і дактары, і музыкі, і чыноўнікі з Камітэту дзяржкантролю. Дзякуючы завочнай гульні кшталтуюць сваё майстэрства гульцы, што жывуць воддаль ад буйных гарадоў. Лістоўнікам прасьцей падтрымліваць сувязі з замежнымі калегамі: турніры яднаюць прадстаўнікоў дзясяткаў нацый. Асабліва моцны рух завочнікаў у Нямеччыне і нямецкамоўных краінах: невыпадкова і цяперашні чэмпіён сьвету, інжынэр Тун Хамарат выступае за Аўстрыю. Яму 56 гадоў — у гэтай сфэры ўзрост элітных гульцоў не бярэ. Быццам бы ў гульні адны плюсы… Істотным мінусам завочных шахмат зьяўляецца зацягнутасьць партый, што доўжацца па некалькі месяцаў ці нават гадоў. Той жа Кубак славянскіх краін завершыцца толькі ў 2007 г.

У мінулым шахматысты, якія звыкліся сустракацца міжсобку адно за дошкай, часьцяком кпілі зь «несапраўднай» гульні ў капэртах — асабліва калі яна з тых ці іншых прычын перапынялася. З пашырэньнем кампутарнай тэхнікі зьявіўся яшчэ адзін довад: кажуць, што ўсю працу за гульца робіць кампутар…

Станіслаў Альховік, шахматны чэмпіён Слоніму і перапісчык са шматгадовым стажам, часткова згодны са скептыкамі: «Сапраўды, часам не зразумела, ці то з машынай гуляеш, ці з чалавекам. Аднак машына заўсёды прапануе шэраг магчымых варыянтаў, а канчатковы выбар належыць усё-такі чалавеку. Гульня праз перапіску была і будзе барацьбой розумаў, а ня шахматных праграм». Пад гэтым аптымістычным меркаваньнем маглі б падпісацца і астатнія пяць соцень перапісчыкаў Беларусі.

**ВР**

## Як бы вы згулялі?



**С.Альховік (Слонім) — В.Раўчакоў (Ліда), 1989—1991 г. Ход белых.**

**Адказ:**

1. Тс8! Фс8 2. Сb5 Тb5 3. Фd6 — і ў белых вырашальная перавага ў цэнтры. Пасьля 3...Тb4 4. Фе6+ Фе6 5. fe+ Кре8 6. Кf5 яны хутка выйгралі.

ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

## Пятніца, 25 лютага

**АНТ, 10.45**

«Джэнтэльмэны аддаюць перавагу бляндынкам»

ЗША, 1953, рэж. Говард Хоўкс.

Музычная камэдыя паводле раману А.Лус.

Джэнтэльмэны аддаюць перавагу бляндынкам, а бляндынкі аддаюць перавагу дыямэнтам. Музычны фільм Г.Хоўкса цікавы ўдзелам Мэрылін Манро, якая знаходзілася на ўзьлёце сваёй славы. Як заўжды, ММ прапанавалі ролю дурнаватай, але наіўнай (цнатлівай!) і сэксапільнай дурніцы. Гэта не касуе прывабнай аўры актрысы, якой за 50 год так і ня вытлумачылі. Відовішчныя музычныя нумары расьцягнулі на цытаты ў кіно й шоў-бізнэс.

**«Лад», 9.10** (1-я сэрыя), **17.30** (2-я сэрыя)

«Час яе сыноў»

Беларусь, 1974, рэж. Віктар Тураў.

Сямейная мэлядрама.

У вандроўку па Беларусі адпраўляецца адзін з чатырох сыноў галоўнай гераіні Павал. Ён сьмяротна хворы на рак. Сям'я зьбіраецца ў доме маці, каб разьвітацца.

Карціна ня лічыцца найлепшаю ў творчасьці Турава, але любы твор беларускага майстра варты прагляду. Зьвярніце ўвагу на апэратарскую работу Дзьмітрыя Зайцава.

**АНТ, 23.20**

«Чужыя»

ЗША, 1986, рэж. Джэймз Кемэран

Фантастыка, фільм жахаў, баявік.

Абсалютная клясыка фільмаў жахаў. Працяг касьмічнага кашмару «Чужога» — з большым маштабам і дынамізмам. Элен Рыплі (Сыгурні Ўівэр) у складзе вайсковай каманды мусіць вярнуцца на непрыветлівую плянэту — і ўступіць у вайну з цэлай папуляцыяй небясьпечных пачвар.

Крыху даўгаватая на пачатку, карціна напрыканцы агаломшвае бесьперапыннымі (і мудрымі!) атракцыёнамі. Сутыкненьне дзьвюх маці — Рыплі зь дзяўчынкаю на руках і маткай Чужых над яйкамі — гэта энэргетыка й шок забытых і старажытных мітаў, касьмічная опэра чужынскай вайны й кашмару.

Крытыкі (не без падстаў) пісалі пра «барацьбу індывідуўма супраць «чужынскай» карпарацыйнай капіталістычнасьці», пра нараджэньне «фалічнай жанчыны з агнямётам», але для гледачоў «Чужыя» — гэта бліскучае і трапнае кінавідовішча.

«Оскар» за спэцэфэкты, якія не састарэлі й сёньня.

## Субота, 26 лютага

**БТ, 12.10**

«Я родам зь дзяцінства»

Беларусь, 1966, рэж. Віктар Тураў.

Лірычнае кінаапавяданьне пра вайну.

Заканамерны крок пасьля карціны «Праз могілкі». Віктар Тураў у росквіце свайго таленту. Вайна паказана вачыма дзяцей — Ігара і Жэнькі.

Мармуровы патас 1950-х разбураецца у 1960-я гады: подзьвігі набываюць будзённы й чалавечы твар, а душа працінаецца болем, смуткам, надзеяй і ўспамінамі. Гэта выклікала ў пільных крытыкаў абвінавачаньні ў безыдэйнасьці, але вайсковая тэма яшчэ ніколі не гучала — і ўжо ніколі не прагучыць! — так ачалавечана-гераічна, натуральна й лірычна, як у шасьцідзясятнікаў, выдатным прадстаўніком якіх зьяўляецца Віктар Тураў.

Сцэнар напісаў Генадзь Шпалікаў, ключавая фігура 1960-х, у фільме здымаўся бард і паэт Уладзімер Высоцкі.

**СТВ, 20.15**

«Рамэо+Джульета»

ЗША, 1996, рэж. Баз Лурман.

Трагедыя ў кічава-постмадэрнісцкім варыянце.

У гэтай хуліганскай вэрсіі шэксьпіраўскай гісторыі Мантэкі і Капулеці — варагуючыя мафіёзныя кланы, Рамэо — субтыльны Леанарда Ды Капрыё, які паліць траўку й пакутуе, а фінальны маналёг вымаўляе дыктарка ў тэлевізары. Дзеткі, незнаёмыя з арыгіналам, будуць рыдаць уголас, усім астатнім гарантаваны рогат.

Ды Капрыё атрымаў узнагароду на Бэрлінскім кінафэстывалі за найлепшую мужчынскую ролю.

**«Лад», 22.00**

«Альфавіль»

Францыя—Італія, 1964, рэж. Жан-Люк Гадар.

Постмадэрнісцкая антыўтопія, фантастыка-паліцыйная прыпавесьць.

Жан-Люк Гадар — гэта рэжысэр для рэжысэраў, вынаходнік нечакана рванага мантажу, неперавўзыдзены гулец з гукам. «Альфавіль» — адзін зь яго ных «глядацкіх» фільмаў, які абапіраецца на такія жанры кіно, як фантастыка, паліцэйскі фільм. Пры гэтым Гадар не забывае і пра мастацкія экспэрымэнты.

Прыватны дэтэктыў Лемі Кошн, пазычаны з комікса ў і «чорных фільмаў», трапляе на далёкай плянэце ў горад Альфавіль, які кіруецца дыктатарам-робатам. Паміж дэтэктывам і дачкой мясцовага прафэсара Наташай фон Браўн (!) узьнікае каханьне — і герой мусіць распачаць барацьбу за вызваленьне ад тэхнадыктатуры.

Карціна — адна зь першых ластавак постмадэрнізму, які будуецца на цытатах і зьмешвае ў адным кактэйлі элітарнае з масавым. Альфавіль — новая інкарнацыя Мэтраполісу з карціны Фрыца Ланга 1920-х гадоў, дзеяньне ў «Альфавілі» адбываецца ў 1984 годзе — паводле Джорджа Оруэла, — а паліцэйскія трукі й прызнаньне ў каханьні знаходзяць сваё месца разам з назойлівай формулай $E=mc^2$.

Але самым цікавым падаецца геніяльна-простае ўвасабленьне міжзорквых вандровак і далёкага таталітарызму. Апэратар Раўль Кутар здымаў абязьлюдненыя, пустыя й начны Парыж.

У Беларусі для гэтага дастаткова паглядзець за акно.

## Нядзеля, 27 лютага

**НТВ, 19.10**

«Маўчаньне ягнят»

ЗША, 1991, рэж. Джонатан Дэлі

Трылер, фільм жахаў.

Ганараваны пяцьцю «Оскарамі» фільм, дзе Клярыса Старлінг з ФБР (Джодзі Фостэр) шукае маньяка. У гэтым ёй мусіць дапамагчы зьняволены псыхіятар-канібал (Энтані Хопкінс).

Карціна, пасьля якой кінакашмарам №1 стаў інтэлігентны доктар Ганібал Лектар зь немігаючым позіркам.

Філёзафы пісалі: сучасны чалавек — канібал, здольны напісаць «Крытыку чыстага розуму». Герой Хопкінса якраз такі, і ў сваёй жудзе ён пераўзышоў нават «бацьку кінаманьякаў» Нормана Бэйтса (каронная роля Э.Пэркінса ў карціне «Псыха»).

Замены доктару-гурману пакуль не чакаецца, але й паўтарыць ягоны посьпех у працягах і прыквэлах немагчыма.

**Склаў Андрэй Расінскі**

## ІМПРЭЗЫ

### Леграм ды гігіена

У НВЦ «Белэкспа» (Машэрава, 14) **да 25 лютага** праходзіць XI Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Беллегмаш-2005: «Абутак, вопратка, тэкстыль-2005», «Усё для краўца», V Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Хімчыстка і пральня-2005», III Міжнародная выстава «Працоўнае адзеньне-2005» і II Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Чысьціня і гігіена-2005».

### Пра сьвет

**25 лютага** а 17-й гадзіне ў мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) адбудзецца адкрыцьцё выставы сучаснага беларускага мастацтва «Пра свет». Удзельнікі выставы — майстры і вучні кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту культуры і мастацтваў і прафэсара Уладзімера Рынкевіча. Выстава працуе да 16 сакавіка.

### Next... і Т.Кангро

**Да 2 сакавіка** ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 47) працуе выстава «Next generation у беларускай скульптуры». Квіткі: 2000. Там жа **да 26 сакавіка** працуе выстава скульптуры Тауно Кангро (Эстонія).

### Жанчына і мужчына

У галерэі Леаніда Шчамялёва **да 2 сакавіка** працуе выстава графікі «Women&men. Андрэй Басалыга, Вольга Нікішына».

### 100 гадоў

**Да 4 сакавіка** ў галерэі «Ле-Сандр-арт» (Раманаўская Слабада, 24) працуе выстава «100 гадоў у мастацтве».

### Краіна сланоў

У Нацыянальным мастацкім музэі **да 16 сакавіка** працуе выстава «Мастацтва Індыі».

### Наркевіч-Ёдка

У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры **да 22 сакавіка** працуе выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю са сьмерці Вітольда Наркевіча-Ёдкі.

### Нацыянальная бібліятэка

**Да 4 сакавіка** ў аддзеле мастацтваў Нацыянальнай бібліятэкі працуе выстава, прысьвечаная 165-годзьдзю Клёда Манэ.

**Да 7 сакавіка** на другім паверсе першага корпусу працуе выстава, прымеркаваная да 70-годзьдзя Рыгора Барадуліна.

### Interbeat. Issue I

Да **17 сакавіка** ў кінатэатры «Перамога» (вул.Інтэрнацыянальная, 20) працуе выстава сучаснай фатаграфіі «Interbeat. Issue 1».

## СПАБОРНІЦТВЫ

### Ралі ў Баравой

**27 лютага** на стадыёне «Зара» ў Баравой адбудзецца III этап чэмпіянату Беларусі па зімовым аўтатрэку «Гарачы лёд». На лядовай дарозе сустрэнуцца лідэры чэмпіянату Аляксей Кабяк, Вадзім Кішкурна і Юля Рубінчык. Пачатак а 12-й.

### Міліцыя на лёдзе

**3 сакавіка** ў Палацы спорту а 16-й гадзіне адбудзецца матч па хакеі паміж зборнай МУС Расеі і МУС Беларусі. Т.: 203-77-19; 226-99-75.

## ТЭАТРЫ І КАНЦЭРТЫ

### Jazz & Funk Day

**25 лютага** ў Баранавічах у памяшканьні Дому культуры (вул. Леніна, 4а) адбудзецца джазавы фэст «Jazz & Funk Day» (Дзень джазу і фанку). Возьмуць удзел «Apple Tea» (Менск), «Фрагмэнт Бэнд» (Баранавічы), «Новы Ерусалім», джаз-бэнд мэдвучэльні гораду ды іншыя. Пачатак а 18-й гадзіне. Квіткі: 5000—7000.

# Скульптура Беларусі

**У менскім Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3) да 13 сакавіка працуе найбуйнейшая за апошнія гады выстава скульптуры.**





ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Капэля Алеся Лася

**27 лютага** а 19-й у Моладзевы тэатар эстрады (Маскоўская, 18а) на свой сольны канцэрт запрашае капэля Алеся Ляся. Новая праграма жывой інструмэнтальнай беларускай музыкі называецца «Смыкі, дуды, цымбалы». Квіткі: 4000—6000.

### Ударныя і самагучныя інструмэнты

**1 сакавіка** а 19-й гадзіне ў Моладзевым тэатры эстрады (Маскоўская, 18а) адбудзецца канцэрт ударных і самагучных інструмэнтаў. Выступяць гурты «Талака», «Desan», «ДжамБі-Бум», «Нагуаль». Квіткі: 4000—6000.

### Опэра

**26** (сб), **5** (сб) — «Кармэн».
**27** (ндз) — «Травіята».
**3** (чц) — «Сусьветныя шлягеры».

### Балет

**26** (сб) — «Шчаўкунок».

### Моладзевы тэатар эстрады

**24** (чц) — «Белы голуб».

### Моладзевы тэатар

**24** (чц) — «Штукарствы Скапэна».

### Тэатар імя Янкі Купалы

**24** (чц) — «Эрык XIV».

### Тэатар-студыя кінаактора

**24** (чц) — «Востраў нашай надзеі».

### Музычны тэатар

**24** (чц) — «Арфэй і Эўрыдыка».

### Тэатар імя Горкага

**24** (чц) — «Анджэла і іншыя».

### Новы драматычны тэатар

**24** (чц) — «Дазвольце спадзявацца».

### Цэнтральны дом афіцэраў

**26** (сб) — «Валянцінаў дзень».

### Тэатар беларускай драматургіі

**25** (пт) — «П'емонцкі зьвер».
**26** (сб) — «Адэль».
**27** (ндз) — «Валянціна».
**2** (ср) — «Палёты з анёлам».
**4** (пт) — «Мальер».
**5** (сб) — «Чакаецца прэм'ера».
**6** (ндз) — «Чорны квадрат».

### Канцэртная заля «Менск»

**1** (аўт), **3** (чц), 19.00 — рок-опэра «Юнона і Авось» санкт-пецярбурскага тэатру «Рок-опэра».
**2** (ср), 19.00 — «Ісус Хрыстос — супэрзорка» санкт-пецярбурскага тэатру «Рок-опэра».

### ДК чыгуначнікаў

**4** (пт), 19.00 — мюзыкл «Капітанская дачка» санкт-пецярбурскага тэатру «Рок-опэра».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Рэспэкт** (666–32–76, 321–04–21)
**26** (сб), 17.00 — «Tribute to LED ZEPPELIN».

**Графіці** (251–87–54, 671–58–65)
**1** (аўт), 20.00 — этна-трыё «Троіца».
**3** (чц) — канцэрт Тацяны Ламонавай.

**Бліндаж** (219–00–10)
**24** (чц), 23.00 — dj Egor.
**25** (пт), 23.00 — Fluorescent Blind Rave: dj Kossov (Moscow), dj Arsenti Tchouprina.

**X-Ray** (223–93–55)
**25** (пт), 22.00 — dj Grizzly.

**Белая вежа** (284–69–22, 239–16–00)
**24** (чц) — «White Tower Party»: dj Top, dj Grizzly, go-go.
**25** (пт), 23.00 — dj Mihel, dj Dee.

**Bronx** (288–10–61)
**24** (чц), 22.00 — dj Dust.
**25** (пт), 22.00 — жывая музыка: Madera Hard Blues.

**Гудвін** (226–13–06, 626–13–03)
**25** (пт), 21.00 — жывая музыка.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«12 сяброў Оўшэна»*** (прэм'ера) **25** (пт) 16.30, 18.50, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 18.50, 21.00.
«Нью-ёрскае таксі»: **25** (пт) 17.00, 19.00, 20.50; **26, 27** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 20.50.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Нью-ёрскае таксі»: **25** (пт) 17.00 (іл), 21.10; **26, 27** (сб, ндз) 14.30, 17.00, 21.10.
«Паглядзі на мяне»: **25** (пт) 18.50; **26, 27** (сб, ндз) 11.30 (іл), 18.50.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Прывід Опэры» (2с): **25, 26** (пт, сб) 18.30; **27** (ндз) 18.30 (іл).
«Тэрмінал»: **25, 27** (пт, ндз) 16.30, 21.00; **26** (сб) 16.30 (іл), 21.00.
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«12 сяброў Оўшэна»*** (прэм'ера): **25** (пт) 15.40, 18.20, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 15.40 (іл), 18.20, 21.00.
**«Масква»** (203-14-48)
«12 сяброў Оўшэна»*** (прэм'ера): **25** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.
**«Мір»** (288-22-33)
«Апантанасьць»: **25—27** (пт—ндз) 16.50, 19.00, 21.10.
«Прафэсіяналы»: **25—27** (пт—ндз) 16.00, 20.30.
«Прывід опэры» (2с): **25** (пт) 18.10; **26, 27** (сб, ндз) 13.30 (іл), 18.10.
**«Перамога»** (203-77-66)
«Знаёмства з Факерамі»: **25, 26** (пт, сб) 14.00, 19.00; **27** (ндз) 14.00 (іл), 19.00.
«Скарб нацыі» (2с): **25, 27** (пт, ндз) 16.20; **26** (сб) 16.20 (іл).
«Праклядцьце»*** (прэм'ера-эксклюзіў): **25—27** (пт—ндз) 21.10.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Знаёмства з Факерамі»: **25** (пт) 14.40, 18.40, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 16.20, 18.40, 21.00.
**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Падводная братва»: **25—27** (пт—ндз) 11.00.
«Нью-ёрскае таксі»: **25** (пт): 15.50, 21.00; **26, 27** (сб, ндз) 16.00, 21.00.
«Прывід Опэры» (2с): **25** (пт) 13.00; **26, 27** (сб, ндз) 13.00 (іл), 18.00.
«Выбух на досьвітку» (прэм'ера): **25** (пт) 18.20.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

### Тэатар юнага гледача

**25** (пт) — «Паганага нораву варты плён».
**26** (сб) — «Дарога на Батлеем».
**27** (ндз), **12** (сб) — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».
**5** (сб), **13** (ндз) — «Папялушка».
**6** (ндз) — «Паліяна».

### Опэра

**6** (ндз) — «Кот у ботах».

### Тэатар беларускай драматургіі

**26** (сб) — «Хрустальны туфлік».
**6** (ндз) — «Воўк-мараплавец».

### Канцэртная заля «Менск»

**2** (ср), 16.00 — «Казка пра мёртвую царэўну і сем багатыроў»

### Кіно для дзяцей

**«Аўрора»**
«Умка шукае сябра» і інш. мультфільмы: **26, 27** (сб, ндз) 13.00.
«Вам — заданьне» (да Дня абаронцаў Айчыны): **25** (пт) 14.30.
**«Берасьце»**
«Неслужбовае заданьне» (да Дня абаронцаў Айчыны): **25** (пт) 15.00.
«Чатыры таксісты і сабака»: **26, 27** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Маленькія ўцекачы»: **25** (пт) 12.00, 14.00; **26, 27** (сб, ндз) 11.00, 13.00.
**«Масква»**
«Ліла і Стыч» («Выхадны — усёй сям'ёй!»): **27** (ндз) 12.00.
**«Мір»**
«Гарэзы»: **25—27** (пт—ндз) 15.00.
**«Піянер»**
«Гарфілд»: **25** (пт) 11.20, 13.00, 17.00; **26, 27** (сб, ндз) 13.00, 14.40.
«Нязнайка на Месяцы»: **26, 27** (сб, ндз) 11.00.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Апантанасьць для рамантычных рэклямістаў



«Апантанасьць» («Wicker Park»)
ЗША, 2004, каляровы, 114 хв.
**Жанр:** Мэлядрама-загадка
**Адзнака:** 5 (з 10)

«Апантанасьць» Пола Макгуігана — вольны паўтор французскай «Кватэры» з Вэнсанам Касэлем і Монікай Бэлючы. Практычныя назвалі карціну «Апантанасьцю», хоць у арыгінале яна гучыць даволі сьціпла: «Wicker Park» («Плецены парк») — месца ў горадзе, дзе сустракаюцца закаханыя.

Пасьпяховы рэкляміст Мэцью (Джош Гартнэт) у чыкаскім рэстаране «Бэлючы» чуе ў тэлефоннай кабіне голас былой каханкі (Даяна Кругер). Невядомая ўцякае, але ў Мэцью застаюцца рэчавыя доказы яе існаваньня. Хоць у рэкляміста ёсьць нявеста й квіток на самалёт у Пэкін, Мэцью застаецца ў Чыкага і апантана шукае загубленае каханьне.

Адметнасьць сюжэту — у паралельных падзеях (сучаснасьць зь нечаканымі знакамі — і ўспаміны) і фатальных супадзеньнях — карціну пазначылі ящчэ й як трылер. Калісьці ў фільме Хічкока «Галавакрут» трымценьне й шок выклікалі спробы героя вярнуць загіблую каханку, вычытаць яе прыкметы ў рэальнасьці — і пераўтварыць твар іншай жанчыны ў памерлую маску.

Макгуіган так далёка не ідзе. У «Апантанасьці» гэта сэнтымэнтальна-суровая, мэлядраматычная і да болю знаёмая прымерка абутку з казкі Шарля Пэро. Гісторыя «Папялушкі», паказаная з пазыцыі апантанага прынца-рэкляміста, абцяжаранага сучаснасьцю гораду, сэксам у пустой кватэры зь незнаёмай жанчынай і пакутамі лепшага сябра, закаханага ў галоўную інтрыганку.

Рэжысэр намякнуў на асобныя моманты апантанасьці, пагуляў з мэлядрамай і надаў ёй прыкметы загадкі-рэбусу, скарыстаў закадравую музыку — але далей ісьці не пажадаў. Аднак «Апантанасьць» не патрабуе выключнай тайны, выключных жарсьцяў і геніяльных актораў. Гэтая карціна пра япі, для япі і на карысьць япі. Гарадзкія канфармісты з гонарам паказычуць нэрвы намёкам на тайну, дакрануцца да спасылкі на пачуцьці — і выйдуць з кінатэатру шчасьлівыя.

Фільмам будуць задаволеныя ўсе — і дзяўчаты, і юнакі, а таксама аматары, бо Макгуіган дазваляе сабе амаль незаўважных мантажных выкрунтасы, «свае» панарамы, а некаторыя дэталі ў фільме працуюць удала — як кава, разьлітая ў келіхі.

«Апантанасьць» не спадабаецца толькі тым, хто чакае ад кіно сапраўднай Тайны й глыбіні.

Андрэй Расінскі

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Залатое цяля

На мінулым тыдні Беларусь наведала рэінкарнацыя Астапа Бендэра. Пра гэта мы яшчэ будзем расказваць сваім дзецям. Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Яшчэ ўчора прозьвішча Мар асацыявалася ў мяне зь нейкім славутым мовазнаўцам пачатку мінулага стагодзьдзя. Здаецца, ён шарыў у каўкаскіх мовах. На мінулым тыдні з афіцыйных СМІ я даведаўся, што існуе яшчэ адзін Мар. Аркадзь Мар, як ахарактарызаваў яго бацька, — прадстаўнік «той долі амэрыканцаў, якія аб'ектыўна мысьляць і цьвяроза ацэньваюць рэальную грамадзка-палітычную і эканамічную сытуацыю ў Рэспубліцы Беларусі». Мар прыехаў у сінявокую па замове рэдакцыі газэты «Русская Америка» («РА»), якая выбрала Лукашэнку чалавекам году.

Мэта Маравага вояжу — нарадзіць для «РА» артыкул на 12 старонак. 100 000 беларусаў — якраз столькі, паводле падлікаў журналіста, жывуць у ЗША — павінны праглынуць яго матэрыял зь вялікім кайфам.

Мара дапусьцілі да цела, потым пад аховай мянтоў вазілі ў розныя куткі краіны, паказалі менскую лыжню, дэманстравалі прадпрыемствы, пазнаёмілі з нацыянальным Дзедам Марозам. Усе размовы з калгасьнікамі, працаўнікамі і Дзядамі Марозамі Мар запісваў на свой дыктафон.

Гэты ўбачаны па БТ касэтны дыктафон адразу выклікаў у мяне падазрэньні. Няўжо паважная амэрыканская газэта з накладам 50 000 асобнікаў ня здольная забясьпечыць рэдактара лічбавым дыктафонам, які сёньня мае журналіст якога-небудзь бюлетэню сярэдняга NGO?

Амэрыканскі журналіст з прымітыўным дыктафонам нагадаў мне фрагмэнт са зборніка прамоў кубінскага лідэра Фідэля Кастра. Ці то ў трэцім, ці ў чацьвёртым томе была надрукавана стэнаграма яго інтэрвію па заканчэньні візыту ў нейкую краіну Лацінскай Амэрыкі. Падчас брыфінгу вялікага барбудас некалькі разоў стэрэатыпнымі пытаньнямі даставаў малады ісьляндзкі журналіст: «А ці праўда, што на Кубе халяўная адукацыя?», «А ці праўда, што няма прыгнёту жанчын?», «А ці праўда, што ў вас нэгры разам зь белымі езьдзяць у транспарце?» і г.д. Нарэшце ён даканаў Фідэля: «Прыяжджайце да нас і паглядзіце самі». У адказ журналіст, апусьціўшы вочы, сказаў, што ён ня супраць наведаць Востраў Свабоды, аднак жа Кастра ведае, як фігова быць прагрэсіўным журналістам у капіталістычным сьвеце. Аўтар лёзунгу «Патрыя о муэртэ» ўжо ня мог даць задні ход: «Добра, паляціш на маім самалёце».

Аднак Мар аказаўся ня проста прайдзісьветам, які вырашыў на халяву ўбачыць зубра і Дзеда Мароза.

У панядзелак, калі верыць «хартыстам», ад рэдакцыі «РА» паступіла заява, што ніякага Мара рэдакцыя ў Беларусь не пасылала, ня кажучы пра тое, каб прызнаць беларускага гаранта «чалавекам году».

Калі гэта сапраўды так, то нам пашчасьціла сустрэцца з афэрыстам супэрмаштабу.

Загнаўшы словазлучэньне «Аркадзь Мар» у «Гугл», я знайшоў артыкул у кыргыскай прэсе аб спэцвыпуску «Русской Америки», прысьвечаным Кыргызстану і адрасаваным «150 000 жыхарам Сярэдняй Азіі, якія жывуць у Штатах». Праз увесь прагон праходзіла думка аб Акаеву. «Разумны і дальнабачны лідэр, зь якім усе цяжкасьці, натуральна, будуць пераадолены». Вы ўжо зразумелі, хто быў аўтарам гэтага спэцвыпуску.

Што ж выходзіць? Газэта «Русская Америка» спэцыялізуецца на разводцы дробных дыктатараў. Адрэкамэндоўваючыся журналістамі ўплывовых выданьняў ЗША, яны абяцаюць сатрапам стварыць пазытыўны імідж. А тыя, наіўныя, вераць.

Колькі артыстызму патрабуе гэткая незвычайная прафэсія!

Уявіце сабе перца, які прыйшоў у беларускі кансулят у ЗША, запудрыў клеркам мазгі, што працуе карэспандэнтам. Тыя, пад уплывам яго прывабнасьці, нават не праверыўшы факту супрацоўніцтва яго ў газэце, даюць кліенту візу. Больш за тое — даюць асабістую аўдыенцыю з тым, каго Кандаліза Райс лічыць адным з шасьці самых жудасных тыранаў сьвету.

Мар, вы мой кумір!

Цікава толькі адно: ці рабіў Аркадзь падарожжа ў РБ выключна дзеля спартыўнага інтарэсу, каб ня страціць форму напярэдадні раскруткі больш грунтоўнага кліента, накшталт Чавэса? Або, паскардзіўшыся на цяжкае жыцьцё СМІ, якія «аб'ектыўна мысьляць і цьвяроза ацэньваюць рэальную грамадзка-палітычную і эканамічную сытуацыю ў Рэспубліцы Беларусі», атрымаў лавэ на выданьне 12-старонкавага спэцвыпуску з накладам 50 000 асобнікаў для «Русской Америки»?




Як задарма адпачыць у Сілічах і застацца жывым. Старонка 21.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**СВ з Бабруйску.** Паводле ленінскага азначэньня, артыкул — гэта яснае разьвіцьцё пэўнае думкі. Вы ж накруцілі адразу пра ўсё. У выніку губляецца яснасьць. У прыватнасьці, для разважаньня на гістарычныя тэмы Вам пакуль не стае адпаведнае падрыхтоўкі.

**Міколу Б. з Дубровы.** Сябры Рэдакцыі прачыталі Вашы меркаваньні. Ня згодныя з Вашымі патрабаваньнямі ператварэньня ў чыста палітычнае выданьне. Галоўнымі задачамі бачацца на сёньня тварэньне альтэрнатыўнае культуры і альтэрнатыўнае супольнасьці з альтэрнатыўнай этыкай. Літаратурнай беларускай мовай гаворым пра ўсё, а ня толькі пра саму мову й палітыку. Вось да чаго мы прывучаем людзей. Не забывайцеся таксама, што газэту чытае беларускамоўная аўдыторыя з рознымі інтарэсамі і поглядамі.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Мікола, віншуем** зь юбілеем, жадаем, каб у наступнай паездцы за 7000 міль ад Радзімы ты ўспамінаў ня толькі палачанку, але і гданьчанку, і вілянчанку. Твае сяброўкі

**Віншуем Вадзіка Саранчукова** зь вялікім шчасьцем — нараджэньнем сына. Здароўя і шчасьця малому, а таксама бацькам. Славацкія беларусы

### ПАКОЙ

**Здыму пакойчык** дзе ў Зялёным Лузе ці ня дужа далёка. Т.: 733-26-72, 234-28-39. E-mail: biruta_art@tut.by

**Прыстойны хлопец** бяз шкодных звычак здыме пакой у Менску на любых прымальных умовах. E-mail: sajat@tut.by

### ПРАЦА

**Пераклады** з/на літоўскую. Т.: 706-99-96. E-mail: 69996@tut.by

**Master Records**
Кіно на DVD
**Любоўная песьня для Бобі Лонга**
Драма, ЗША, 2004, рэж. Шайні Габел
У ролях: **Джон Траволта, Скарлет Ёхансан, Габрыэл Мачт**
Самотны літаратар Бобі Лонг застаецца ў доме прыхільніцы пасьля яе сьмерці. Ад гаспадынінай дачкі Пэрсі хаваюць, што яна законная ўладальніца дома. Але гэта не адзіная тайна ў фільме, бо любоўная песьня для Бобі Лонга яшчэ ня сьпетая.
Адна зь незвычайных роляў Джона Траволты. Скарлет Ёхансан намінавалася на Залаты глёбус, як найлепшая актрыса.
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

**Сакавіцкі распродаж кніг:**
**Ян Станкевіч. Збор твораў у двух тамох.** Т.1. — 552 с.; Т.2. — 588 с. Цана 8 тыс.
**Ян Станкевіч. Гістарычная творы.** — 776 с., цьвёрдая вокладка. 7 тыс.
**Андрэй Котлярчук. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў.** — 274 с., цьвёрдая вокладка. 2 тыс.
**Быць альбо ня быць сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне.** — 472 с. 1 тыс.
**Беларуска-расейская інтэграцыя. Аналітычныя артыкулы.** — 424 с. 2 тыс.
**Паліталёгія. Асноўны курс.** Пер. зь ням. — 680 с. 3 тыс..
**Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі.** — 296 с. 1 тыс.
**Прапанова дзейнічае да 26 сакавіка!**
Т.: 643-57-33, e-mail: exlibris@tut.by, паштовы адрас: Менск, 220050, п/с 333.

**Запрашаем у падарожжа**
**6 сакавіка** (нядзеля)
**«Замкі Беларусі»** па маршруце: **Менск—Мір—Навагрудак—Любча—Ліда—Ліпнішкі—Іўе—Дуды—Менск**.
Кошт квітка 21 тыс. рублёў.
**19–20 сакавіка** (субота—нядзеля):
**Вільня—Коўна—Трокі**.
38 эўра (уваходзіць праезд, віза, гатэль, сьняданак, страхоўка, інфармацыйнае забесьпячэньне).
Т. 279-05-85; 232-54-58; 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38; 776-24-35 (Павал)

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3515. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.30 23.02.2005.
Замова № 1080.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а